ДЖОН БЭВІР

# ПРЫНАДА ШАТАНА

Жыць у свабодзе
ад смяротнай
пасткі крыўды

Прададзена больш за 6.000.000 асобнікаў па ўсім свеце

Дарагія сябры,

кніга, якую вы трымаеце ў руках, верагодна, дасць вам магчымасць сустрэць самую важную праўду ў жыцці. Я кажу так упэўнена не таму, што я аўтар гэтай кнігі, а таму, што кніга прысвечана важнай тэме. Гэтае адкрыццё я атрымаў з нябёсаў, і, па шчырасці, маё імя напісана на кнізе толькі таму, што я першым яе прачытаў. Пытанне крыўды – самай сутнасці кнігі «Прынада шатана» – часта становіцца найбольшай перашкодай, якую даводзіцца пераадольваць чалавеку.

З моманту з'яўлення гэтай кнігі яна выйшла агульным накладам больш за шэсць мільёнаў асобнікаў на розных мовах свету ў розных фарматах. Мы пачулі безліч сведчанняў ад людзей з усіх канцоў зямлі, якія праз гэтую вестку атрымалі свабоду і вызваленне ад улады ворага і змаглі рэалізаваць Божую задуму для іх жыцця.

Госпад даў мне жаданне шукаць сталых і маладых лідараў цэркваў па ўсім свеце, якім я змагу падарыць асобнік кнігі на знак майго клопату пра іх і як сродак служэння тым, каму яны дапамогуць упэўнена стаяць у Хрысце, атрымаўшы свабоду.

Дарагі сябар, маё жыццё моцна перамянілася, калі Бог адкрыў мне гэтую вестку. Я малюся, каб і ваша жыццё перамянілася, калі вы будзеце чытаць маю кнігу. Я буду рады пачуць, як гэтая вестка паўплывала на ваша жыццё і на тых, каму вы служыце.

Ваш брат у Хрысце,



Джон Бэвір

JohnBevere@ymail.com

MessengerX

Messenger INTERNATIONAL

ДЖОН БЭВІР

# ПРЫНАДА ШАТАНА

## Жыць у свабодзе ад смяротнай пасткі крыўды

**The Bait of Satan** by John Bevere, Belarusian
© 2024 Messenger International
MessengerInternational.org
Originally published in English as The Bait of Satan

Additional resources in Belarusian by John and Lisa Bevere are available for free download and video streaming at: **MessengerX.com** and on the **MessengerX** App.
To contact the author: JohnBevere@ymail.com

This book is a gift from Messenger International and is
NOT FOR SALE

**Прынада шатана** Джон Бэвір, на беларускай мове
© 2024 Messenger International
MessengerInternational.org
Пераклад з англійскай The Bait of Satan

Дадатковыя рэсурсы на беларускай мове аўтарства Джона і Лізы Бэвіраў можна бясплатна спампаваць ці праглядзець на: **MessengerX.com** і ў праграме **MessengerX.**
Звязацца з аўтарам: JohnBevere@ymail.com

Гэтая кніга – падарунак ад служэння Messenger International
і НЕ ПРЫЗНАЧАЕЦЦА ДЛЯ ПРОДАЖУ

Спампаваць у App Store

Атрымаць Google Play

App Store – гандлёвая марка Apple Inc., зарэгістраваная ў ЗША і іншых краінах.
Google Play і лагатып Google Play – гандлёвыя маркі Google LLC.

# ВЯЛІКАЯ ПАДЗЯКА

Маёй жонцы Лізе, майму самаму дарагому сябру пасля Госпада. Ты – сапраўды дабрадзейная жанчына. Я буду заўжды ўдзячны Госпаду за тое, што Ён злучыў нас у сужонстве. Дзякуй за тваю шчырую дапамогу ў рэдагаванні гэтай кнігі.

Маім чацвярым сынам Эдысану, Остыну, Аляксандру і Ардэну, якія ахвяравалі сваім часам з татам, каб дазволіць мне завяршыць працу над кнігай. Вы – радасць для майго сэрца.

Асаблівая падзяка Джону Мэйсану, які паверыў у маю ідэю і натхняў мяне апублікаваць яе, а таксама Дэборы Пулалiён за яе талент і падтрымку ў рэдагаванні, і ўсім супрацоўнікам Charisma House, якія ўдзельнічалі ў гэтым праекце.

І самае важнае: шчырая падзяка майму Нябеснаму Айцу за Яго невымоўны дар, Госпаду Ісусу – за Яго ласку, праўду і любоў, і Духу Святому – за Яго вернае кіраўніцтва падчас працы над гэтым праектам.

## ЗМЕСТ


*УСТУП* .. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 5

*ПРАДМОВА* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9

1. Я ПАКРЫЎДЖАНЫ? . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13
2. МАСАВЫЯ КРЫЎДЫ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 21
3. ЯК ГЭТА МАГЛО СА МНОЙ ЗДАРЫЦЦА? . . . . . . . . . . . . . . . . . 33
4. ОЙЧА МОЙ, ОЙЧА МОЙ! . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 45
5. ЯК НАРАДЖАЮЦЦА ДУХОЎНЫЯ ВАЛАЦУГІ . . . . . . . . . . . . . . 59
6. ХАВАЮЧЫСЯ АД РЭАЛЬНАСЦІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 73
7. НАДЗЕЙНЫ ПАДМУРАК . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 83
8. УСЁ, ШТО МОЖА ПАХІСНУЦЦА, ПАХІСНЕЦЦА . . . . . . . . . . . . 97
9. КАМЕНЬ СПАТЫКНЕННЯ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 113
10. КАБ НАМ НЕ СПАКУСІЦЬ ІХ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 129
11. ПРАБАЧЭННЕ: КАЛІ НЕ ДАЯЦЕ, ТО І НЕ АТРЫМАЕЦЕ. . . . . . . 141
12. ПОМСТА: ПАСТКА . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 155
13. ПАЗБЕГНУЦЬ ПАСТКІ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167
14. МЭТА: ПРЫМІРЭННЕ . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 177

*ЭПІЛОГ: ПРАКТЫЧНЫЯ КРОКІ* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 189

# УСТУП

Кніга, якую вы трымаеце ў руках, верагодна, дасць вам магчымасць самай важнай сустрэчы з праўдай ў жыцці. Я магу ўпэўнена гэта сказаць не таму, што я яе напісаў, але праз яе тэму. Пытанне крыўды – самай сутнасці прынады шатана – часта становіцца самай вялікай перашкодай, якую даводзіцца пераадолець асобнаму чалавеку.

Вучні Ісуса былі сведкамі мноства вялікіх цудаў. Яны здзіўляліся таму, як сляпыя пачыналі бачыць, а мёртвыя ўваскрасалі. Яны чулі, як Ісус сцішыў небяспечную буру. Яны бачылі, як тысячы насыціліся праз памнажэнне некалькіх хлябоў і рыбак. Спіс цудаў Ісуса быў такім невычарпальным, што, паводле Бібліі, усе кнігі свету не маглі б змясціць яго.

Ніколі раней чалавецтва не перажывала цудоўнага дзеяння

Божага настолькі поўна і адчувальна. Але не гэтыя цуды падштурхнулі здзіўленых вучняў да сумніваў. Не, гэты выклік чакаў іх бліжэй да канца зямнога служэння Ісуса. Ісус настаўляў Сваіх вучняў: «Калі ж саграшыць супраць цябе брат твой... сем разоў у дзень, і сем разоў у дзень зьвернецца да цябе, кажучы: “Каюся”, даруй яму». І сказалі апосталы Госпаду: «Дадай нам веры» (Лукі 17:3–5). Не цуды натхнілі іх прасіць большай веры, або уваскрасення мёртвых або сцішанай буры на моры, але простае прыказанне прабачаць тых, хто пакрыўдзіў іх!

Ісус сказаў: “Згаршэньні ня могуць не прыйсьці” (Лукі 17:1). Пытанне не ў тым, ці будзе ў вас нагода пакрыўдзіцца, але ў тым, як вы на яе адрэагуеце. На жаль, факты сведчаць, што не толькі некаторыя, але многія крыўдзяцца і застаюцца ў палоне крыўдаў.

Гэтай кнізе ўжо дзесяць гадоў. За гэты час мы атрымалі безліч лістоў і сведчанняў асобных людзей, сем’яў і служэнняў, якія атрымалі ацаленне і перамяніліся праз праўду Слова Божага ў гэтай кнізе. Каб натхніць вас, мы ўключаем сюды адно з іх. За ўсе іх мы радуемся і аддаем Богу ўсю славу! Адзін лідар дзяліўся: «Наша царква стаяла на мяжы вялізнага падзелу. Усё выглядала безнадзейна. Я даў кнігу “Прынада шатана» кожнаму з прэсвітэраў. Падзел спыніўся, і сёння наша царква мае еднасць!»

Таксама было ўратавана шмат шлюбаў. Нядаўна, пасля выступу ў Нябрасцы, да мяне падышла пара. Жонка сказала: «Дзесяць гадоў таму я пакрыўдзілася на лідараў царквы. Я стала падазрона да ўсіх ставіцца, пастаянна абараняць сябе і сваё меркаванне. Ад гэтага пастрадаў мой шлюб, і муж збіраўся са мной разводзіцца. Ён не быў вернікам і не хацеў мець нічога агульнага з царквой. Хтосьці даў мне кнігу “Прынада шатана». Прачытаўшы яе, неўзабаве я атрымала свабоду ад крыўды і горычы. Калі муж убачыў змены ў маім жыцці, ён прыняў Ісуса Хрыста як Госпада і спыніў разводны працэс». Муж стаяў побач і ўсміхаўся. Калі яна скончыла, ён пацвердзіў, што ў яго жыцці і сям’і адбыліся цудоўныя змены!

Сведчанне, якое больш за ўсё кранула маё сэрца, я пачуў падчас служэння ў Нэйплс, штат Флорыда. Акурат перад пачаткам майго выступу padняўся мажны мужчына сярэдняга веку, які са слязамі распавёў: «Усё жыццё я адчуваў нейкую сцяну паміж мной і Богам. Я прыходзіў на набажэнствы, дзе іншыя людзі адчувалі Божую прысутнасць, а я проста стаяў і назіраў. Нават калі я маліўся, мне не было палёгкі, я не адчуваў прысутнасці Бога. Некалькі тыдняў таму мне падарылі кнігу «Прынада шатана». Я прачытаў яе ад пачатку да канца. Я зразумеў, што шмат гадоў таму папаўся на прынаду шатана. Я ненавідзеў сваю маці, якая пакінула мяне, калі мне было шэсць месяцаў. Мне трэба было ёй прабачыць. Я пазваніў і паразмаўляў з ёй у другі раз за трыццаць шэсць гадоў. Я плакаў: “Мама, я ўсё жыццё не мог прабачыць табе за тое, што ты ад мяне адмовілася”. Яна таксама пачала плакаць: “Сын, апошнія трыццаць шэсць гадоў я ненавідзела сябе за гэта”».

Мужчына працягваў: «Я прабачыў ёй, а яна – сабе, і мы прымірыліся».

І далей было самае цікавае: «Цяпер тая сцяна, якая аддзяляла мяне ад прысутнасці Божай, знікла!»

Тут ён зусім расхваляваўся і апошнія  словы прагучалі праз слёзы і ўсхліпванні: «Цяпер я магу плакаць у прысутнасці Бога, як дзіця».

Я ведаю сілу і рэальнасць гэтага палону. Шмат гадоў я быў яго закладнікам ў глухім маўчанні. Гэтая кніга – не тэорыя, гэта Слова Божае, якое стала целам. Яна поўная той праўды, якую я асабіста пераражыў. Я веру, што яна ўмацуе вас. Чытаючы, прасіце Госпада памножыць вашую веру! Калі вы будзеце расці ў веры, Ён атрымае славу, а вы напоўніцеся радасцю! Няхай Бог шматкроць дабраславіць вас.

– ДЖОН БЭВІР

# ПРАДМОВА

Кожны, хто ставіў пасткі на жывёлаў, ведае, што для поспеху трэба некалькі рэчаў. Пастку трэба схаваць, каб жывёла яе не заўважыла, і там мусіць быць прынада, якая заманіць здабычу ў  смяротныя абдымкі.

Шатан, вораг нашых душаў, выкарыстоўвае гэтую стратэгію, рыхтуючы для нас самыя падманлівыя і смертаносныя пасткі. Яны схаваныя і маюць прынаду.

Шатан і яго хаўруснікі не такія глупыя, як думаюць многія вернікі. Іх падман і спакусы тонка разлічаныя. Яны дзейнічаюць хітра, умела і спрактыкавана. Памятайце: д’ябал умее маскіравацца ў весніка святла. Калі мы не навучаныя праз Слова Божае правільна адрозніваць дабро і зло, мы не заўважым гэтыя пасткі.

Адна з самых падманлівых і падступных прынадаў – тое, з чым сутыкаецца кожны хрысціянін, – крыўда. Сама крыўда не смяротная, калі яна застаецца ў пастцы. Але калі мы бярэм яе, глытаем і трымаем у сэрцы, мы становімся пакрыўджанымі. Пакрыўджаныя людзі прыносяць плод болю, гнева, шалу, рэўнасці, спрэчак, канфліктаў, горычы, нянавісці і зайздрасці. Іншыя наступствы гэтай прынады – абразы, нападкі, раны, падзелы, руйнаванне адносінаў, здрады і адступніцтва.

Часта тыя, хто пакрыўдзіўся, нават не ўсведамляюць, што яны патрапілі ў пастку. Яны не разумеюць свайго стану, бо засяроджваюцца на тым, як няправільна да іх паставіліся. Яны адмаўляюць праўду. Самы эфектыўны спосаб, якім вораг нас асляпляе, – ён прымушае нас засяродзіцца на сабе.

У гэтай кнізе выкрываецца гэта смяротна небяспечная пастка, а таксама я пакажу, як яе пазбегнуць. Свабода ад крыўды вельмі важная для кожнага хрысціяніна, бо Ісус сказаў, што немагчыма будзе прайсці праз жыццё, не сутыкнуўшыся з крыўдамі (Лукі 17:1).

У цэрквах Амерыкі і іншых народаў, дзе я дзяліўся гэтым пасланнем, на заклік да малітвы адгукалася больш за палову прысутных. Гэта шмат, але гэта не ўсе людзі. Ганарлівасць не дазваляе некаторым людзям выйсці наперад. Я бачыў, як людзі, вызваленыя з гэтай пасткі, атрымлівалі ацаленне, свабоду, адказы на малітвы і напаўняліся Дух Святым. Звычайна яны кажуць, што гадамі шукалі таго, што атрымалі ў той самы момант, калі вызваліліся ад крыўды.

У другой палове дваццатага стагоддзя ў царкве памножылася веданне. Але з гэтым памнажэннем, як падаецца, стала і больш падзелаў паміж вернікамі, лідарамі і супольнасцямі. Прычына: крыўда лютуе ў цэрквах праз адсутнасць шчырай любові. «Але веданьне робіць ганарыстым, а любоў будуе» (1 Кар. 8:1). Так шмат людзей трапляюць у пастку гэтага падману, што мы амаль паверылі, што гэта нармальна.

Але напярэдадні вяртання Хрыста сапраўдныя вернікі з’яднаюцца як ніколі ў мінулым. Я веру, што сёння безліч мужчын і жанчын атрымаюць вызваленне з пасткі крыўды. Гэта стане адным з крокаў да абуджэння ў народзе. Няверуючыя ўбачаць Ісуса праз любоў паміж намі там, дзе раней яны заставаліся сляпымі да Яго дзеянняў.

Я не хачу проста напісаць кнігу дзеля кнігі. Бог даў агонь гэтай весткі ў маё сэрца, і я бачу, што яе плод трывае. Пасля служэння, на якім я прапаведаваў гэтую вестку, адзін пастар сказаў мне: «Я ніколі не бачыў, каб так шмат людзей атрымалі вызваленне адразу».

Бог прамовіў да мяне, што гэта толькі пачатак. Многія атрымаюць свабоду, ацаленне і аднаўленне, чытаючы гэтую кнігу і слухаючыся падказак Духа Святога. Я веру, што калі вы чытаеце словы на гэтых старонках, Настаўнік і Дарадца скіруе іх наўпрост да вас. І тады гэта слова прынясе вялікую свабоду ў ваша жыццё і служэнне.

Давайце памолімся перад пачаткам чытання:

*Айцец, у імя Ісуса, я прашу, каб Ты Сваім Духам адкрываў мне Сваё Слова падчас чытання гэтай кнігі. Адкрывай усё тое, што хаваецца ў маім сэрцы і перашкаджае мне ведаць Цябе і служыць Табе больш эфектыўна. Я чакаю дзеяння Твайго Духа і прашу, каб Твая ласка рабіла тое, што ты хочаш, у–ва мне. Дапамажы мне бліжэй даведацца Цябе і чуць голас Твой праз гэтую кнігу.*

## НАША РЭАКЦЫЯ НА КРЫЎДУ ВЫЗНАЧАЕ НАШУ БУДУЧЫНЮ.

Кніга «Прынада шатана» перамяніла нашыя жыцці і наша служэнне. Мы паглядзелі відэа не менш за дваццаць раз і некалькі раз перачыталі кнігу. Наша служэнне выкарыстоўвала кнігу і відэаурокі, каб перамяніць наша жыццё, а таксама і жыццё многіх іншых. Гэтая вестка моцная і своечасовая.

—С. К., КАНЭКТЫКУТ

# 1

# Я ПАКРЫЎДЖАНЫ?

*Згаршэньні ня могуць не прыйсьці.*

**—ЛУКІ 17:1**

Падарожнічаючы са служэннем праз Злучаныя Штаты, я заўважыў адну з самых смяротных і падступных пастак ворага. У яе трапляе безліч хрысціян, яна шкодзіць адносінам і аддаляе нас ад іншых. Гэта пастка крыўды.

Шмат хто не можа належна выконваць сваё пакліканне праз раны і боль, прынесеныя ў іх жыццё крыўдамі. Людзі знявечаныя, і гэта перашкаджае ім поўнасцю рэалізаваць свой патэнцыял. Найчасцей іх параніў іншы вернік. Тады яны лічаць гэтую крыўду здрадай. У Псальме 55 (54):13–15 Давід плача: «Бо ня вораг мяне зьневажае, я дараваў бы [гэта], ня той, што мяне

ненавідзіць, узьвялічваецца супраць мяне, ад яго б я схаваўся, але ты, чалавек, як я, сябра мой і знаёмы мой, з якім мы разам вялі шчырыя гутаркі, з якім у Дом Божы хадзілі ў грамадзе».

Гэта людзі, з якімі мы разам сядзім і спяваем, можа, нават і той, хто прапаведуе. Мы сустракаемся з імі на святах, сацыяльных мерапрыемствах або працуем. Магчыма, нават бліжэй. Мы расцём разам з гэтымі людзьмі, давяраем ім, спім з імі разам. Чым бліжэй адносіны, тым большая крыўда! Больш за ўсё ненавідзяць адзін аднаго людзі, якія некалі былі блізкімі.

Адвакаты раскажуць вам, што самыя гарачыя спрэчкі бываюць падчас разводаў. Амерыканскія СМІ пастаянна паведамляюць пра забойствы людзей членамі іх сем’яў. Дом, які мусіць быць месцам супакою, забеспячэння і роста, дзе мы вучымся аддаваць і прымаць любоў, часта становіцца коранем нашага болю. Як сведчыць гісторыя, самыя крывавыя войны вядуць брат супраць брата, сын супраць айца або наадварот.

Магчымасці для крыўдаў такія ж бясконцыя, як і спіс адносінаў, незалежна ад таго, простыя яны ці складаныя. Адно толькі дакладна: вас могуць пакрыўдзіць толькі тыя, хто важны для вас. Ад іх вы чакаеце больш – урэшце, вы ж ім аддаяце больш сваіх сіл і часу. Чым болей чаканні, тым больш падзенне.

У нашым грамадстве валадарыць эгаізм. Мужчыны і жанчыны сёння клапоцяцца пра сябе, таму занядбоўваюць і раняць тых, хто побач. Няхай гэта нас не здзіўляе. Біблія вельмі выразна кажа, што ў апошнія дні «людзі будуць самалюбныя» (2 Цім. 3:2). Мы чакаем гэтага ад няверуючых, але Павал казаў не пра тых, хто быў не з царквы. Ён казаў пра тых, хто быў у царкве. Многія параненыя і расчараваныя. Яны пакрыўджаныя! Але яны не разумеюць, што патрапілі ў пастку шатана.

Ці ж гэта наша віна? Ісус выразна сказаў: немагчыма пражыць жыццё і не сутыкнуцца са згаршэннямі. Але большасць вернікаў шакаваныя, збянтэжаныя і здзіўленыя, калі так адбываецца. Мы верым, што няправільна абышліся толькі з намі. Такі адказ

робіць нас уразлівымі перад коранем горычы. Мы павінны быць гатовыя і ўзброеныя перад крыўдамі, бо наша рэакцыя вызначае нашу будучыню.

## ПАДСТУПНАЯ ПАСТКА

Грэцкае слова «згаршэнне» ў Лукі 17:1 паходзіць ад слова *«skandalon»*. Першапачаткова гэта слова тычылася той часткі пасткі, на якую чаплялі прынаду. Таму гэта слова значыць «паставіць пастку ў кагосьці на шляху». У Новым Запавеце яно часта апісвае пастку, якую выкарыстоўваюць ворагі. Крыўда – зброя д'ябла, з дапамогай якой ён бярэ людзей у палон. Павал настаўляў маладога Цімафея:

> …а слуга Госпада ня мусіць вадзіцца, але быць ветлівым да ўсіх, здольным навучаць, цярплівым, у ціхасьці настаўляць тых, *якія працівяцца*, ці ня дасьць ім Бог навяртаньня дзеля пазнаньня праўды, каб яны *вызваліліся з пасткі д'яблавай*, які *славіў іх пад сваю волю.*
>
> – 2 ЦІМАФЕЯ 2:24–26, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Тыя, хто спрачаецца або працівіцца, трапляе ў пастку і і застаюцца ў палоне, выконваючы волю д'ябла. Што яшчэ горш, яны не разумеюць, што знаходзяцца ў палоне! Як блудны сын, яны павінны сустрэцца з самімі сабой, зразумець свой стан. Яны не разумеюць, што з іх льецца горкая, а не чыстая вада. Калі чалавек падмануты, ён лічыць, што з ім усё добра, хоць гэта і не так.

Незалежна ад сцэнарыя, мы можам раздзяліць усіх пакрыўджаных на дзве вялікія катэгорыі: (1) тыя, з кім абышліся несправядліва або (2) тыя, хто *лічыць*, што з імі абышліся несправядліва. Прадстаўнікі другой групы шчыра лічаць, што з імі абышліся няправільна. Іх высновы часта робяцца на аснове

недакладнай інфармацыі. Часам іх інфармацыя дакладная, але высновы няправільныя. У любым выпадку ім балюча і іх разуменне азмрочанае. Яны судзяць паводле меркаванняў, знешнасці і чутак.

## САПРАЎДНЫ СТАН СЭРЦА

Адзін са спосабаў, якім вораг трымае чалавека ў пакрыўджаным стане, – гэта схаваць крыўду, ахінуць яе ганарлівасцю. Пыха не дазволіць вам прызнацца ў сваім сапраўдным стане.

Аднойчы некалькі служыцеляў зрабілі мне вельмі балюча. Людзі казалі: «Мы не можам паверыць, што яны так з вамі абышліся. Вам не крыўдна?»

І я хутка адказваў: «Не, усё добра. Я не крыўдую». Я ведаў, што крыўдзіцца няправільна, таму я адмаўляў і стрымліваў крыўду. Я пераканаў сябе, што не крыўдзіўся, але насамрэч было наадварот. Ганарлівасць маскіравала сапраўдны стан майго сэрца.

Ганарлівасць перашкаджае нам прыняць праўду. Яна скажае наша бачанне. Вы не можаце змяніцца, калі думаеце, што ўсё выдатна. Ганарлівасць робіць ваша сэрца цвёрдым і азмрочвае ваша разуменне. Яна не дае вашаму сэрцу памяняцца: пакаяцца, каб атрымаць свабоду (гл. 2 Цімафею 2:24–26.)

Ганарлівасць прымушае вас думаць, што вы сталі ахвярай: «Да мяне няправільна паставіліся, пра мяне няправільна падумалі, таму мае паводзіны можна апраўдаць». Вы лічыце сябе невінаватым, няправільна абвінавачаным, стрымліваеце прабачэнне. Хаця сапраўдны стан вашага сэрца схаваны ад вас, ён не схаваны ад Бога. Тое, што да вас паставіліся няправільна, не дае вам дазволу трымаць крыўду на іншых. У гэтым выпадку два мінусы не даюць плюс!

# АЦАЛЕННЕ

У кнізе Адкрыцця Ісус звяртаецца да царквы ў Лаадыкеі і спачатку кажа, што яны лічаць сябе багатымі, заможнымі і не маюць патрэбы ні ў чым, а потым адкрывае іх сапраўдны стан: «Гаротны, і жалю годны, і ўбогі, і сляпы, і голы» (Адкр. 3:14–20). Яны прынялі свой фінансавы стан і сілу за духоўную сілу. Ганарлівасць схавала іх сапраўдны стан.

Цяпер шмат з кім так адбываецца. Людзі не бачаць сапраўднага стану сваіх сэрцаў, як і я не бачыў крыўды, якую я трымаў адносна тых служыцеляў. Я пераканаў сябе, што не быў паранены. Ісус сказаў царкве ў Лаадыкеі, як выйсці з падману: купіць Божае золата і ўбачыць свой сапраўдны стан.

***Купіць Божае золата.***

Першай рэкамендацыяй Ісуса для вызвалення ад падмана было «купіць у Мяне золата, ачышчанае ў агні» (Адкр. 3:18).

Ачышчанае золата гладкае і гнуткае, у ім няма бруду і дамешкаў. Толькі калі золата змяшанае з іншымі металамі (медзь, жалеза, нікель і г.д.), яно становіцца цвёрдым і не такім гнуткім, і больш паддаецца карозіі. Такая сумесь называецца сплавам. Чым вышэй адсотак іншых металаў, тым цвярдзейшым становіцца золата. І наадварот, чым менш дамешкаў у сплаве, тым мягчэйшае і больш гнуткае будзе золата.

Мы адразу бачым паралель: чыстае сэрца падобнае да чыстага золата – мяккае, пяшчотнае і гнуткае. Гебраям 3:13 кажа, што праз падман грэху нашы сэрцы камянеюць! Калі мы не справімся з крыўдай, яна прынясе яшчэ большы плод грэху: горыч, гнеў і абурэнне. Дамешанае рэчыва робіць нашы сэрцы цвёрдымі, як сплавы робяць цвёрдым золата. Дамешак змяншае або знішчае мяккасць і пяшчоту, пазбаўляе нас чуллівасці. Гэта перашкаджае нашай здольнасці чуць голас Бога. Мы не можам добра бачыць. Гэта ідэальная сітуацыя для падману.

Першы крок у ачышчэнні золата – перамалоць яго ў

парашок і змяшаць з рэчывам, якое называюць флюс. Потым сумесь змяшчаюць ў плавільную печ і награваюць пры вельмі высокай тэмпературы. Сплавы і дамешкі прыцягваюцца да флюса і ўсплываюць на паверхню. Золата цяжэйшае, і таму яно застаецца ўнізе. Потым *шлакі* (медзь, жалеза, і цынк разам з флюсам) прыбіраюць, і застаецца нашмат чысцейшы метал.

Цяпер паглядзім на тое, што сказаў Бог:

> Вось, Я гператапіў цябе, але ня як срэбра, Я выспрабаваў цябе ў печы нядолі.
>
> – ІСАЯ 48:10

І яшчэ:

> З гэтага радуйцеся, крыху цяпер, калі трэба, ад *розных спакусаў* пасмуткаваўшы, каб выпрабаваньне веры вашае, якая шмат каштоўнейшая за золата, што гіне, хоць і *агнём выпрабоўваецца*, было знойдзена на хвалу, і пашану, і славу ў адкрыцьці Ісуса Хрыста.
>
> – 1 ПЯТРА 1:6–7, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Бог ачышчае нас праз нядолю, выпрабаванні і пакуты, праз гарачыню, якая аддзяляе нячыстасці непрабачэння, спрэчак, горычы, гневу і г.д. ад Божага характара ў нашым жыцці.

Грэх лёгка хаваецца, калі няма нядолі і выпрабаванняў. У часы росквіту і поспеху нават злы чалавек падаецца добрым і шчодрым. Аднак у часы выпрабаванняў на паверхню выходзіць нячыстасць.

У маім жыцці былі часы, калі я праходзіў праз такія складанасці, з якімі ніколі не сутыкаўся раней. Я стаў грубым і жорсткім са сваімі самымі блізкімі людзмі. Мая сям’я і сябры сталі мяне пазбягаць.

Я плакаў перад Госпадам: «Адкуль ідзе ўвесь гэты гнеў? Раней яго не было!»

Госпад адказаў: «Сын, нячыстасці з’яўляюцца, калі золата

плавіцца ў агні». А потым Ён задаў мне пытанне, якое змяніла маё жыццё: «Ці можаш ты *бачыць* нячыстасць у золаце, пакуль яно не патрапіла ў агонь?»

«Не», – адказаў я.

«Але гэта не значыць, што яе там няма», – працягнуў Ён. – «Калі агонь выпрабаванняў дайшоў да цябе, на паверхню выйшла нечыстасць. Ад цябе гэта хавалася, але Я заўсёды яе бачыў. Цяпер ты маеш выбар, які вызначыць тваю будучыню. Ты можаш працягваць злавацца, вінаваціць сваю жонку, сяброў, пастара і калег, або ты можаш прыняць шлак грэху як шлак грэху і пакаяцца, прыняць прабачэнне, і Я прыбяру гэтую нячыстасць з твайго жыцця».

***Убачыць свой сапраўдны стан.***

Ісус кажа, што наша здольнасць бачыць правільна – яшчэ адзін ключ да свабоды ад падману. Часта, калі нам крыўдна, мы лічым сябе ахвярамі і вінавацім тых, хто пакрыўдзіў нас. Мы апраўдваем сваю горыч, непрабачэнне, гнеў, зайздрасць і злосць па меры іх з'яўлення. Часам мы злуёмся нават на тых, хто нагадвае нам пра людзей, якія паранілі нас. Менавіта таму Ісус раіць: «Мазьзю для вачэй пamaж вочы твае, каб ты бачыў» (Адкр. 3:18). Каб бачыў што? Свой сапраўдны стан! Для нас гэта адзіны спасаб стаць «руплівымі і навярнуцца», як далей загадвае Ісус. Вы пакаецеся толькі тады, калі перастанеце вінаваціць іншых людзей.

Калі мы вінавацім іншых і абараняем сваю пазіцыю, мы сляпыя. Мы імкнемся прыбраць парушынку з вока іншых, калі ў нашым воку бервяно. Свабоду нам прыносіць разуменне ісціны. Калі Дух Божы паказвае нам нашы грахі, Ён заўсёды робіць так, што гэта падаецца нам асобным ад нас, і прыводзіць да разумення грэху, а не да асуджэння.

Я малюся, каб падчас чытання гэтай кнігі Слова Божае дала вам святло і вы ўбачылі свой сапраўдны стан і вызваліліся ад любой крыўды, якую вы трымаеце. Не дазваляйце ганарлівасці асляпіць вас і ўтрымаць ад пакаяння.

## ПАКРЫЎДЖАНЫ ХРЫСЦІЯНІН – ТОЙ, ХТО БЯРЭ НЕШТА АД ЖЫЦЦЯ, АЛЕ ПРАЗ СТРАХ НЕ МОЖА НІЧОГА АДДАВАЦЬ.

Дзесяць гадоў таму, пасля дваццаці гадоў шлюбу, мой муж сышоў ад мяне, бо больш «не быў шчаслівым». Я была цалкам разбітая. Я доўга спрабавала пераадолець боль, самоту і пачуццё адрынутасці, якія выклікаў яго сыход з сям'і. Я прасіла Бога дапамагчы мне прабачыць яму, і я сапраўды думала, што прабачыла, але не магла да канца перамагчы боль у сэрцы. Мне было вельмі балюча, калі прыходзілася яго бачыць. Калі я прачытала «Прынаду шатана», Дух Святы натхніў мяне паразмаўляць з былым мужам і папрасіць яго прабачыць мне за маю крыўду. Мы паразмаўлялі ўпершыню за дзесяць гадоў. Я веру, што сапраўды атрымала ацаленне і свабоду. Я дзякую Богу за вызваленне ад ярма, у палоне якога была так доўга.

—Д. Б., НЬЮ–ЁРК

## 2

# МАСАВЫЯ КРЫЎДЫ

*І тады згоршацца многія; і будуць выдаваць адзін аднаго, і ненавідзець адзін аднаго. І многія фальшывыя прарокі паўстануць, і падмануць многіх. І дзеля памнажэньня беззаконьня ў многіх асьцюдзянее любоў. А хто вытрывае да канца, будзе збаўлены.*

**– МАЦВЕЯ 24:10–13**

У гэтым раздзеле Евангелля ад Мацвея Ісус гаворыць пра знакі канца гэтага часу. Яго вучні спыталіся: «Які знак Твайго прыходу?»

Большасць згодныя, што мы жывём у часе Яго вяртання. Бессэнсоўна спрабаваць вылічыць дакладны дзень Яго вяртання – гэта ведае толькі Айцец. Але Ісус сказаў, што мы

зразумеем, калі гэты час настане. І гэты час настаў цяпер! Ніколі раней мы не бачылі такіх прароцкіх падзеяў у царкве, Ізраілі і ў прыродзе. Мы можам упэўнена сказаць, што жывем у часе, апісаным Ісусам у Евангеллі паводле Мацвея, раздзел 24.

Звярніце ўвагу на адзін са знакаў Яго блізкага вяртання: «І тады згоршацца *многія*...» Не некаторыя, не малая колькасць, але *многія*.

Спачатку мы мусім спытаць: «Хто гэтыя згоршаныя?» Гэта хрысціяне ці грамадства агулам? Працягваючы чытаць, мы знаходзім адказ: «І дзеля памнажэння беззаконня ў многіх асцюдзянее *любоў*». Грэцкае слова *«агапэ»* перакладаецца тут як *«любоў»*. У грэцкай мове для любові ёсць некалькі словаў, але два найболей частыя – *«агапэ»* і *«філеа»*.

*«Філеа»* абазначае любоў паміж сябрамі. Гэта ўмоўная любоў–прывязанасць. «*Філеа»* кажа «Дапамажы мне, і я дапамагу табе» або «Стаўся добра да мяне, і я пастаўлюся добра да цябе».

З іншага боку, «*агапэ»* – гэта любоў, якую Бог дае ў сэрцы Сваіх дзяцей. Такую любоў Ісус шчодра дае нам. Яна безумоўная. Яна не залежыць ад вынікаў ці адказу на яе. Такая любоў дае нават тады, калі яе адрынулі.

Без Бога мы можам любіць толькі эгаістычнай любоўю, той, якая не можа даваць і вяртаць, калі нічога не атрымала. Аднак *«агапэ»* любіць незалежна ад адказа. Калі Ісус прабачыў на крыжы, Ён дэманстраваў «*агапэ»*. Таму тыя «многія», пра каго кажа Ісус, – гэта хрысціяне, чыя любоў *«агапэ»* астыла.

Некалі я рабіў усё магчымае, каб прадэманстраваць любоў аднаму чалавеку. Але падавалася, што кожны раз, калі я імкнуўся праявіць любоў, гэты чалавек рэагаваў крытыкай і жорсткім стаўленнем. Гэта працягвалася некалькі месяцаў. Аднойчы я зразумеў, што з мяне дастаткова.

> Я стаў скардзіцца Богу: «З мяне досыць. Мне трэба, каб Ты паразмаўляў са мной пра гэта. Кожны раз, калі я праяўляю

> Тваю любоў гэтаму чалавеку, ён адказвае гневам!»
>
> Госпад пачаў прамаўляць да мяне: «Джон, табе трэба паверыць у любоў Божую!»
>
> «Што Ты хочаш сказаць?» – спытаўся я. «Хто сее ў цела сваё, з цела пажне сапсутасьць, – патлумачыў Ён, – а хто сее ў Дух, з Духа будзе жаць жыцьцё вечнае. А робячы дабро, ня будзем журыцца, бо ў свой час будзем жаць, калі не саслабеем» (гл. Галятам 6:8–9).

Вам трэба зразумець: калі вы сееце любоў Божую, вы *пажняце* любоў Бога. Вам трэба мець веру ў гэты духоўны закон, нават нягледзячы на тое, што вы можаце не пажаць на тым самым полі, на якім сеялі, або пажняце не так хутка, як чакалі.

Госпад працягнуў: «У час Маёй найвялікшай патрэбы Мае самыя блізкія сябры пакінулі Мяне. Юда здрадзіў Мне, Пётр выракся Мяне, а астатнія ўцяклі, каб застацца ў жывых. Толькі Ян ішоў удалечыні. Я быў з імі тры гады, карміў і вучыў іх. Але, паміраючы за грахі свету, Я прабачыў. Я прабачыў усім – ад сяброў, якія пакінулі Мяне, да рымляніна, які ўкрыжаваў Мяне. Яны не прасілі прабачэння, але Я даў яго. Я верыў у любоў Айца.

Я ведаў, што праз пасеяную Мной любоў Я змагу пажаць любоў ад многіх сыноў і дочак Валадарства. Яны будуць любіць Мяне праз Маю ахвяру».

> «А Я кажу вам: любіце ворагаў вашых, дабраслаўляйце тых, якія праклінаюць вас, рабіце дабро тым, якія ненавідзяць вас, і маліцеся за тых, якія крыўдзяць вас і перасьледуюць вас, каб сталіся вы сынамі Айца вашага, Які ў небе, бо Ён узьнімае сонца Сваё над добрымі і злымі і спасылае дождж на праведных і няправедных. Бо калі вы любіце тых, якія вас любяць, якая вам нагарода? Ці ж ня так робяць і мытнікі? І калі вы вітаеце толькі братоў вашых, што асабліва робіце? Ці ж не такім чынам робяць і мытнікі?» (Мцв. 5:44–47).

## ВЯЛІКІЯ ЧАКАННІ

Я зразумеў, што любоў, якую я аддаваў, сеялася ў Духа, і ўрэшце я змагу пажаць плод гэтых зерняў любові. Я не ведаў, адкуль, але ведаў, што ўраджай прыйдзе. Я больш не бачыў няўдачы ў тым, што чалавек, якога я любіў, не адказваў мне тым самым. Гэта дало мне свабоду любіць яго яшчэ больш!

Калі б больш хрысціян прызнавалі гэта, яны б не здаваліся і не крыўдзіліся. Звычайна гэтая любоў не ўласцівая нам. Мы звыклыя да эгаістычнай любові, якая лёгка расчароўваецца, калі штосьці не адпавядае нашым чаканням.

Калі я чагосьці чакаю ад пэўных людзей, гэтыя людзі могуць мяне падвесці. Яны расчаруюць мяне так моцна, што я перастану ад іх чагосьці чакаць. Але калі я нічога не чакаю ад іншых, любая сітуацыя – дабраславенне, а не штосьці, што мне павінны іншыя. Калі мы патрабуем пэўных паводзінаў ад іншых людзей, мы рыхтуем сябе для крыўды. Чым вышэй нашы чаканні, тым большая патэнцыйная крыўда.

## АБАРОНЧЫЯ СЦЕНЫ?

> Пакрыўджаны брат — як умацаваны горад, а сваркі — як завалы ў замку.
>
> – ПРЫПОВЕСЦІ 18:19

Пакрыўджанага брата ці сястру складаней заваяваць, чым умацаваны горад. Вакол умацаваных гарадоў ёсць сцены. Гэтыя муры запэўнівалі горад у супакоі. Яны дапамагалі пазбавіцца непажаданых гасцей. Усіх наведнікаў можна было праверыць. Тыя, хто не заплаціў падаткі, не маглі ўвайсці, пакуль не заплацяць. Тым, каго лічылі пагрозай здароўю або бяспецы горада, не давалі зайсці.

Мы будуем сцены, калі нам балюча, каб абараніць сваё

сэрца і не дазволіць з’явіцца іншым ранам. Мы пачынаем выбіраць і не дазваляем уваходзіць тым, хто можа нас параніць. Мы адсейваем тых, хто, на нашу думку, нам нешта вінен. Мы не пускаем іх у сэрца, пакуль яны не выплацяць свае даўгі. Мы адкрываем сваё жыццё толькі тым, хто на нашым баку.

Але часта гэтыя людзі таксама пакрыўджаныя. Таму замест дапамогі мы кладзем дадатковыя камяні на тыя сцены, што ўжо стаяць. Мы і самі гэтага не заўважаем, але абарончыя муры становяцца турмамі. У гэты момант мы не проста адсейваем тых, хто можа ўвайсці, але ў жаху ад таго, што і самі не можам выбрацца са сваёй крэпасці.

Пакрыўджаныя хрысціяне засяроджваюцца на ўнутраных пытаннях. Мы старанна абараняем свае правы і асабістыя адносіны. Мы трацім сілы на тое, каб не дапусціць ранаў у будучыні. Калі мы не гатовыя быць параненымі, мы не можам аддаваць безумоўную любоў. Безумоўная любоў дае іншым права раніць нас.

Любоў не шукае свайго, але параненыя людзі ўсё болей шукаюць свайго і засяроджваюцца на сабе. У такім клімаце любоў Божая астывае. Два моры ў Святой Зямлі даюць нам прыродны прыклад. У Галілейскае мора вада ўцякае і выцякае. Там разнастайная флора і фаўна, мноства розных відаў рыб і раслін. Воды Галілейскага мора праз раку Ярдан цякуць у Мёртвае мора. Але ў Мёртвае мора вада толькі ўцякае, але не выцякае з яго. У ім няма раслін або рыбы. Жывыя воды з Галілейскага мора становяцца мёртвымі, калі змешваюцца з водамі Мёртвага мора. Жыццё не можа захоўвацца, калі ім не дзяліцца з іншымі.

Таму пакрыўджаны хрысціянін – той, хто прымае жыццё, але праз страх не можа яго аддаваць. У выніку нават тое жыццё, якое трапляе ў яго, спыняецца, бо трапляе ў турэмныя сцены крыўды. Новы Запавет называе такія сцены цвярдынямі.

> Бо зброя змаганьня нашага не цялесная, але магутная ад Бога на руйнаваньне цьвярдыняў. [Мы змагаемся,] руйнуючы думкі і ўсякае ўзьвялічваньне, якія ўздымаюцца супраць веданьня Бога, і беручы ў палон усякую думку на паслухмянасьць Хрысту.
>
> —2 КАРЫНЦЯНАМ 10:4–5

Гэтыя цвярдыні ствараюць пэўныя шаблоны, праз якія апрацоўваецца ўся ўваходзячая інфармацыя. Хоць напачатку яны былі створаныя для абароны, яны становяцца крыніцай пакутаў і скажэння, бо яны вядуць вайну супраць ведання Бога.

Калі мы фільтруем усю інфармацыю праз мінулы боль, адрынутасць і досвед, для нас становіцца немагчымым верыць Богу. Мы не можам паверыць, што Ён кажа нам праўду. Мы сумняемся ў Яго дабрыні і вернасці, бо судзім Яго паводле стандартаў, якія вызначае чалавек. Але ж «*Бог — гэта не чалавек*, каб Ён падманваў» (Лікі 23:19). «Бо Яго шляхі — гэта не нашы шляхі, а Яго думкі – не нашы думкі» (Іс. 55:8–9).

Пакрыўджаныя людзі змогуць прывесці ўрыўкі з Пісання ў падтрымку сваёй пазіцыі, але дзяліць так Слова Божае няправільна. Веданне Слова Божага без любові – гэта разбуральная сіла, якая робіць нас ганарыстымі законнікамі (1 Кар. 8:1–3). Гэта прымушае нас апраўдваць сябе, а не каяцца ў непрабачэнні.

Гэта стварае атмасферу, у якой мы можам падманвацца, бо веды без Бога прывядуць да падману.

Ісус папярэджвае пра фальшывых прарокаў адразу пасля таго, як кажа, што многія будуць спакушаныя і пакрыўджаныя: «І многія фальшывыя пракрокі паўстануць, і падмануць многіх» (Мцв. 24:11). Хто гэтыя многія, якіх яны падмануць? Адказ: пакрыўджаныя, чыя любоў астыла (Мцв. 24:12).

## ФАЛЬШЫВЫЯ ПРАРОКІ

Ісус называе фальшывых прарокаў «ваўкамі ў авечым адзеньні» (Мцв. 7:15). Гэта эгаісты, якія робяць выгляд, што яны хрысціяне (авечае адзенне), але маюць прыроду ваўка. Ваўкам падабаецца быць побач з авечкамі. Іх можна знайсці як сярод прыхаджан, так і за катэдрай. Вораг адпраўляе іх, каб прабрацца ў шэрагі вернікаў і падмануць іх. Іх трэба пазнаваць па пладах, а не па вучэннях або прароцтвах. Часта вучэнне падаецца здаровым, а плод у іх жыцці і служэнні – не здаровы. Служыцель або хрысціянін – гэта тое, *як ён жыве*, а не тое, што ён прапаведуе.

Ваўкі заўсёды ловяць параненых і маладых авец, а не здаровых і моцных. Гэтыя ваўкі скажуць людзям тое, што яны *хочуць* чуць, а не тое, што ім *патрэбна* пачуць. Гэтыя людзі не шукаюць здаровай дактрыны, яны хочуць, каб нехта казаў ім прыемнае. Паглядзім, што кажа Павал пра апошнія дні:

> Ведай жа тое, што ў апошнія дні надыйдуць злыя часы. Бо людзі будуць... *самалюбныя* ***(у анг. перакладзе: тыя, што не прабачаюць)****... якія маюць выгляд пабожнасьці, а сілы яе адракліся.* Ад гэтакіх адварочвайся... Бо будзе час, калі здаровага навучаньня цярпець ня будуць, але паводле сваіх пажаданьняў будуць выбіраць сабе настаўнікаў, якія лашчаць слых, і ад праўды слых адвернуць, а збочаць да баек.
>
> —2 ЦІМАФЕЮ 3:1–5; 4:3–4, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Звярніце ўвагу: «якія маюць выгляд пабожнасьці, а сілы яе адракліся». Як яны адракуцца яе сілы? Яны адмаўляюць, што хрысціянства прывядзе іх ад непрабачэння да прабачэння. Яны хваляцца тым, што ідуць за Ісусам і кажуць пра перажыванне «нараджэння звыш», але тое, пра што яны кажуць, не кранула іх сэрцы, не сфармавала ў іх характар Хрыста.

## ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАКАЛЕННЕ

Павал бачыў, што падманутыя мужчыны і жанчыны будуць прагнуць ведаў, але застануцца такімі, як раней, бо не будуць гэта выкарыстоўваць для сябе. Ён апісваў іх як тых, «якія заўсёды вучацца і ніколі ня могуць дайсці да пазнаньня праўды» (2 Цім. 3:7).

Калі б Павал жыў сёння, ён бы смуткаваў, убачыўшы тое, пра што ён прарочыў. Ён бы ўбачыў мноства людзей, якія наведваюць канферэнцыі, набажэнствы і семінары, назапашваючы веды з Пісання. Ён убачыў бы, як яны шукаюць «новага адкрыцця», каб жыць больш эгаістычным, паспяховым жыццём. Ён убачыў бы служыцеляў, якія судзяцца паміж сабой паводле «праведных прычынаў».

Ён заўважыў бы хрысціянскія публікацыі і радыёперадачы, якія знеслаўляюць мужчын і жанчын Божых. Ён убачыў бы харызматычных вернікаў, якія бегаюць з царквы ў царкву ад крыўдаў, абвяшчаючы, што Ісус – Госпад іх жыцця, і не маюць здольнасці прабачыць. Павал бы выкрыкнуў: «Пакайцеся і атрымайце свабоду ад падману, род крывадушны!»

Няважна, наколькі сучасныя вашы адкрыцці з мноства семінараў і біблейскіх школ, якія вы наведалі ці кніг, якія вы прачыталі, ці нават колькі гадзін вы маліліся і вывучалі Слова. Калі вы пакрыўджаныя і не можаце прабачыць, калі адмаўляецеся пакаяцца, вы не прыйшлі да пазнання ісціны. Вы падманутыя і падманваеце іншых сваім крывадушным жыццём. Незалежна ад адкрыццяў, ваш плод будзе сведчыць пра іншае. Вы станеце крыніцай, з якой льюцца горкія воды падману, а не ісціны.

## ЗДРАДА

> І тады *згоршацца* многія; і будуць *выдаваць* адзін аднаго, і *ненавідзець* адзін аднаго.
>
> —МАЦВЕЯ 24:10, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Давайце разгледзім гэтае сцверджанне. Калі мы прыгледзімся ўважліва, мы ўбачым заканамернасць. Крыўда вядзе да здрады, а здрада вядзе да нянавісці.

Як сцвярджалася раней, пакрыўджаныя людзі будуюць сцены для абароны. Мы засяроджваемся на самазахаванні. Мы павінны абараняць сябе і любым коштам заставацца ў бяспецы. Гэта робіць нас здольнымі да здрады. Калі мы здраджваем, мы спрабуем абараніць сябе за кошт іншых, звычайна, блізкіх або сяброў.

Такім чынам, здрада ў Валадарстве Божым адбываецца, калі вернік шукае сваёй выгоды або абароны за кошт іншага верніка. Чым бліжэй адносіны, тым горшая здрада. Здрадзіць камусьці – значыць цалкам вырачыся запавету. Калі адбываецца здрада, адносіны немагчыма аднавіць без сапраўднага пакаяння.

Тады здрада вядзе да нянавісці і сур’ёзных наступстваў. Біблія выразна кажа: любы, хто ненавідзіць свайго брата, – забойца, а ніякі забойца не мае жыцця вечнага (1 Яна 3:15).

Як сумна, што сёння сярод вернікаў можна ўбачыць прыклады крыўды, здрады і нянавісці. Яны так распаўсюдзіліся ў нашых дамах і цэрквах, што лічацца нармальнымі паводзінамі. Нам не хапае сіл смуткаваць, калі мы бачым, як адзін служыцель судзіцца з другім. Мы ўжо не здзіўляемся, калі хрысціяне разводзяцца. Падзелы ў цэрквах сталі нярэдкімі і прадказальнымі. Дзейнічае распрацаваная палітыка служэнняў. Яна маскіруецца як распрацаваная ў найлепшых інтарэсах Валадарства або царквы.

«Хрысціяне» абараняюць свае правы, каб іх не пакрыўдзілі ці не выкарысталі іншыя хрысціяне. Ці забылі мы словы Новага Запавета?

> Чаму вам ня лепш быць пакрыўджанымі? Чаму вам ня лепш мець шкоду?
>
> —1 КАРЫНЬЦЯНАМ 6:7

Хіба мы забыліся словы Ісуса?

> А Я кажу вам: любіце ворагаў вашых, дабраслаўляйце тых, якія праклінаюць вас, рабіце дабро тым, якія ненавідзяць вас, і маліцеся за тых, якія крыўдзяць вас і перасьледуюць вас.
>
> —МАЦВЕЯ 5:44

Хіба мы забылі прыказанне Божае?

> Нічога ня [робячы] дзеля сварлівасьці ці дзеля пустое пахвальбы, але ў пакоры розуму шануючы адзін аднога як вышэйшых за сябе.
>
> —ФІЛІПЯНАМ 2:3

Чаму мы не жывём па гэтых законах любові? Чаму мы хутка здраджваем, а не аддаем сваё жыццё за іншых, нават калі рызыкуем тым, што нас падмануць? Прычына: наша любоў астыла, і таму мы па–ранейшаму абараняем сябе. Мы не можам з даверам аддаваць сябе ў рукі Божыя, калі спрабуем паклапаціцца пра сябе самі.

Калі да Ісуса ставіліся няправільна, Ён нічога не рабіў у адказ, але аддаў Сябе ў Божыя рукі дзеля праведнага суда. Нас заклікаюць ісці Яго шляхамі.

> Бо вы на гэта пакліканыя, бо і Хрыстос перацярпеў за нас, пакінуўшы нам прыклад, каб мы ішлі па сьлядах Ягоных. Ён не зрабіў аніякага грэху, і не было подступу ў вуснах Ягоных. Ён, зьняважаны, не зьняважаў у адказ, церпячы, не пагражаў, а перадаў [суд] Таму, Хто судзіць справядліва.
>
> —1 ПЯТРА 2:21–23

## ТОЙ, ХТО ДАЕ НАМ ЗДОЛЬНАСЦЬ

Мы мусім прыйсці да таго, каб давяраць Богу, а не целу. Многія славяць Бога вуснамі, называючы Яго крыніцай свайго жыцця, але жывуць як сіроты. Яны бяруць жыццё ў свае рукі, і вызнаюць вуснамі: «Ён мой Госпад і Бог».

Цяпер вы ўжо разумееце, наколькі сур’ёзны *грэх* крыўды. Калі з ёй не разабрацца, крыўда на выніку прывядзе да смерці. Але калі вы супрацьстаіце спакусе пакрыўдзіцца, Бог прыносіць вялікую перамогу.

## КАЛІ Б Д’ЯБАЛ МОГ ЗНІШЧЫЦЬ НАС У ЛЮБЫ МОМАНТ, ЁН ДАЎНО СЦЁР БЫ НАС З АБЛІЧЧА ЗЯМЛІ.

Да таго, як я пачала чытаць гэтую кнігу, я перастала размаўляць з Богам. Я была збаўленай, але штосьці паміж мной і Богам было няправільна. Я ведала, што праблема была не з боку Госпада, але я ніяк не магла зразумець, у чым яна хавалася. Аднойчы я была ў сяброўкі, у якой была кніга «Прынада шатана» Джона Бэвіра. Я ўзяла яе пачытаць. Разгарнуўшы кнігу, я не змагла ад яе адарвацца. Яна была такой памазанай, што мне хацелася чытаць далей і далей. Прыкладна на палове кнігі я раптам зразумела, што паміж мной і Госпадам акурат стаяў дух крыўды.

—К. К., ДЖОРДЖЫЯ

## 3

# ЯК ГЭТА МАГЛО СА МНОЙ ЗДАРЫЦЦА?

*І сказаў ім Язэп: І вы надумалі ліха супраць мяне, але Бог надумаў гэта на дабро.*

**—БЫЦЦЁ 50:19–20**

У першым раздзеле мы падзялілі ўсіх пакрыўджаных на дзве вялікія катэгорыі: (1) тыя, з кім насамрэч несправядліва абышліся, і (2) тыя, хто лічыць, што з імі няправільна абышліся, але на самай справе гэта не так. У гэтым раздзеле я хачу паразмаўляць пра першую катэгорыю.

Давайце пачнём з пытання: калі з вамі сапраўды няправільна абышліся, ці маеце вы права пакрыўдзіцца? Для адказу зірнем на жыццё Язэпа, любімага сына Якуба (гл. Быццё 37–48.)

# СОН СТАНОВІЦЦА ЖАХАМ

Язэп быў адзінаццатым сынам Якуба. Старэйшыя браты не любілі яго, бо ён быў любімым сынам айца, і той выдзяліў Язэпа сярод іншых, падарыўшы яму рознакаляровыя шаты. Бог даў Язэпу два сны. У першым ён убачыў звязаныя снапы ў полі. Сноп Язэпа ўстаў, а снапы братоў пакланіліся яму. У другім сне Язэп бачыў сонца, месяц і адзінаццаць зорак (якія прадстаўлялі яго айца, маці і братоў), што схіляюцца перад ім. Калі ён расказаў гэтыя сны братам, тыя, што цалкам зразумела, не падзялялі яго энтузіязм. Яны ўзненавідзелі брата яшчэ больш.

Неўзабаве дзесяць старэйшых братоў выправіліся ў поле да статкаў айца. Якуб адправіў Язэпа адведаць братоў. Калі старэйшыя браты ўбачылі Язэпа, яны змовіліся супраць яго, кажучы: «Вось, ідзе гэты гаспадар сноў. Давайце заб’ём яго! Тады паглядзім, што будзе з ягоных сноў! Ён кажа, што будзе валадарыць над намі. Хай паспрабуе зрабіць гэта мёртвым!» І яны кінулі Язэпа паміраць у яму. Шаты Язэпа браты забралі, парвалі і запэцкалі крывёй жывёлаў, каб пераканаць айца, што Язэпа забіў дзікі звер.

Аднак кінуўшы брата ў яму, яны ўбачылі ізмаэльцаў, якія кіраваліся ў Егіпет. І Юда сказаў: «Пачакайце, хлопцы. Калі мы дадзім яму згніць у той яме, нам не будзе з гэтага прыбытку. Давайце троху заробім і прададзім яго ў рабства. Гэта ўсё адно што памерці: ён ніколі не будзе нас зноў турбаваць, а грошы мы падзелім!» Таму яны прадалі брата за дваццаць срэбранікаў. Язэп так пакрыўдзіў іх, што яны яму здрадзілі, забраўшы яго спадчыну і сям’ю. Памятайце, што гэта зрабілі яго браты – яны мелі аднаго айца, паходзілі ад адной крыві.

Наша культура настолькі адрозніваецца, што нам цяжка зразумець усе аспекты таго, што яны зрабілі. Горшым было б толькі забойства. У біблійныя часы было вельмі важна мець сыноў. Сыны працягвалі род і атрымлівалі ў спадчыну зямлю бацькі. Браты Язэпа не дазволілі яму насіць імя айца і атрымаць

спадчыну. Браты сцерлі імя Язэпа, цалкам пазбавілі яго тоеснасці. Усё вядомае Язэпу знікла.

Калі чалавека прадавалі ў рабства ў іншую краіну, ён заставаўся там рабом да смерці. Яго будучая жонка мусіла стаць рабыняй, і ўсе яго дзеці станавіліся рабамі!

Цяжка нарадзіцца рабом, але нашмат горш нарадзіцца спадчыннікам у багатай сям'і з вялікай будучыняй, і раптам гэтага пазбавіцца. Было б лягчэй, калі б Язэп ніколі не ведаў іншага жыцця. А так ён стаў нібыта жывым мерцвяком. Я ўпэўнены, што часам яму хацелася, каб браты яго забілі. Сутнасць у тым, што ўчынак братоў Язэпа быў жорсткім і злым.

## ЗІРНУЦЬ У МІНУЛАЕ

Чытаючы мой пераказ гісторыі Язэпа, вы, верагодна, ужо ведаеце канец. Калі ведаць канец, гэтая гісторыя натхняльная. Але адчуванні Язэпа былі зусім іншымі. Яму падавалася, што ён ніколі не ўбачыць свайго айца і здзясненне мараў. Ён быў рабом у іншай краіне. Ён не мог пакінуць Егіпет. Ён назаўсёды стаў уласнасцю іншага чалавека.

Язэпа прадалі Патыфару, начальніку целаахоўнікаў фараона. Язэп служыў яму амаль дзесяць гадоў, ніколі нічога не чуў пра сваю сям'ю і ведаў, што айцец лічыў яго мёртвым. Жыццё сям'і працягвалася без яго. Язэп не меў надзеі, што айцец выратуе яго.

З цягам часу Язэп заваяваў прыхільнасць свайго валадара, і да яго сталі добра ставіцца. Патыфар паставіў Язэпа начальнікам над сваім домам і ўсёй маёмасцю.

Але ў той самы час, калі жыццё Язэпа стала паляпшацца, штосьці жахлівае адбывалася ў сэрцы жонкі яго гаспадара. Яна даўно прыхільна пазірала на яго і хацела здзейсніць з ім чужалоства. Жанчына штодня спрабавала яго спакусіць, але Язэп адмаўляўся. Аднойчы яна засталася з ім адна ў доме, падсцерагла яго і настойвала на тым, каб ён пераспаў з ёй. Язэп адмовіўся і

ўцёк, пакінуўшы ў яе руцэ сваё адзенне. Яна закрычала, што яе згвалтавалі. Патыфар загадаў кінуць Язэпа ў турму фараона.

Турма фараона вельмі адрознівалася ад турмаў у Амэрыцы. Я служыў у некалькіх турмах, і якімі б непрыемнымі яны ні былі, у параўнанні з вязніцай фараона гэта былі вясковыя клубы. Ніякага святла, няма дзе прагуляцца, проста змрочны пакой або яма, у якой цёмна і холадна. Умовы маглі быць жорсткімі або зусім бесчалавечнымі. Вязняў кідалі туды паміраць: ім давалі толькі хлеб і ваду «пакутаў» (1 Валадароў 22:27). Ім давалі дастаткова ежы, каб выжыць і адчуць пакуты. Паводле Псальма 105:18, ногі Язэпа зашчамілі ў кайданы, жалезам сціснулі яго душу. Яго кінулі ў вязніцу, каб ён памёр.

Калі б ён быў егіпцянінам, ён меў бы шанцы на вызваленне, але ён быў рабом–іншаземцам, абвінавачаным у згвалтаванні, і таму надзеі не было. Горш стаць ужо не магло. Язэп аказаўся так нізка, як толькі было магчыма для жывога чалавека.

Ці можаце вы ўявіць яго думкі ў цемры той вязніцы? «*Больш за дзесяць гадоў я служыў свайму гаспадару шчыра і сумленна. Я вярнейшы за яго жонку. Я застаўся верным Богу і майму гаспадару, штодня ўцякаючы ад сэксуальнага грэху. Якая мне ўзнагарода? Вязніца!*

*Здаецца, чым больш я стараюся зрабіць тое, што правільна, тым горш становіцца. Як Бог мог гэта дазволіць? Ці маглі мае браты скрасці таксама і Божае абяцанне? Чаму магутны Бог запавету не ўступіўся за мяне? Хіба ж так любячы і верны Бог клапоціцца пра Сваіх слугаў? Чаму я? Чым я гэта заслужыў? Я проста верыў, што чуў слова ад Бога*».

Я ўпэўнены, што ў яго былі такія або падобныя думкі.

Яго свабода была вельмі моцна абмежаваная, але ён меў права выбраць тое, як рэагаваць на ўсё, што з ім здарылася. Ці пакрыўдзіцца ён на сваіх братоў, а ўрэшце і на Бога? Ці будзе іх ненавідзець? Ці адмовіцца ад надзеі на выкананне абяцання, пазбавіўшы сябе апошняга стымула жыць?

### *Ці Бог сапраўды Ўсёмагутны?*

Мне падаецца, пакуль усё не скончылася, Язэпу нават не прыходзіла думка, што такім чынам Бог рыхтаваў яго да ўлады. Як ён выкарыстае сваю будучую ўладу над братамі, якія здрадзілі яму? Язэп вучыўся паслухмянасці праз свае пакуты. Яго браты былі выдатна адкалібраванымі інструментамі ў Божых руках. Ці будзе Язэп трымацца абяцання і шукаць Бога?

Магчыма, калі Язэп бачыў свае сны, ён палічыў іх пацверджаннем дабраславення ў сваім жыцці. Язэп яшчэ не ведаў, што ўлада даецца для служэння, а не для таго, каб зрабіць кагосьці асаблівым. У такія перыяды замест Божай велічы мы часта засяроджваемся на тым, што нашы абставіны немагчыма вытрываць. На выніку мы расчароўваемся, нам хочацца кагосьці абвінаваціць, і мы шукаем адказнага за наш адчай. Калі ж мы сутыкаемся з тым, што Бог мог бы не дазволіць усяму гэтаму з намі адбыцца, але дазволіў, мы часта вінавацім Яго.

Гэта гучала ў розуме Язэпа: «Я жыў адпаведна з тым, што я ведаю пра Бога. Я не парушыў Яго законаў або прыроды. Я толькі паўтарыў той сон, які Сам Бог даў мне. І які ж быў вынік? Браты мне здрадзілі, прадалі мяне ў рабства! Мой айцец думае, што я памёр, і не прыйдзе ў Егіпет шукаць мяне».

Для Язэпа асноўнай прычынай бедаў былі браты. Яны былі сілай, што кінула яго ў вязніцу. Магчыма, ён цешыўся думкамі, як усё памяняецца, калі ён прыйдзе да ўлады і зойме тое месца, што ў снах яму паказаў Бог. Як усё памянялася б, калі б яго браты не скасавалі яго будучыні.

Як часта мы чуем, што нашы браты і сёстры трапляюць у тую ж пастку абвінавачвання іншых? Напрыклад:

«Калі б не жонка, я б займаўся служэннем. Яна перашкаджае мне і руйнуе тое, пра што я марыў».

«Калі б не мае бацькі, у мяне было б нармальнае жыццё. Яны вінаватыя, што я стаў такім. Як атрымалася, што ў іншых

нармальныя бацькі, а ў мяне – не? Калі б мае бацькі не развяліся, мой шлюб склаўся б значна лепей».

«Калі б мой пастар не падаўляў мой дар, я быў бы свабодны і не меў перашкодаў. Ён не даў мне несці маё служэнне. Ён настроіў людзей у царкве супраць мяне».

«Калі б не мой былы муж, у нас з дзецьмі не было б фінансавых праблем».

«Калі б не тая жанчына ў царкве, кіраўніцтва па–ранейшаму добра ставілася б да мяне. Сваімі плёткамі яна знішчыла мяне і любую надзею на павагу».

Спіс бясконцы. Вельмі лёгка вінаваціць іншых ў сваіх праблемах і ўяўляць, наколькі лепей ўсё магло б скласціся, калі б не ўсе гэтыя людзі вакол вас. Вы ведаеце, што ваша расчараванне і боль – гэта іх віна.

Я хачу падкрэсліць наступнае: *ніхто, абсалютна ніхто, ніводны мужчына, жанчына, дзіця або д’ябал не могуць скрасці вас з волі Божай. Ніхто, апроч Бога, не мае ўлады над вашым лёсам.* Браты Язэпа імкнуліся знішчыць бачанне, якое даў яму Бог. Яны лічылі, што для Язэпа ўсё было скончана. Сваімі вуснамі яны казалі: «Хадзем, заб’ем яго і кінем яго ў яму... *Пaглядзім, што выйдзе з яго сноў!*» (Быц. 37:20, выдзелена аўтарам). Браты хацелі знішчыць яго. Гэта была не выпадковасць. Гэта было наўмысна! Браты не хацелі даваць яму шансаў на поспех.

Што, на вашу думку, зрабіў Бог, калі Язэпа прадалі ў рабства? Глянуў на Сына і Духа Святога і сказаў: «Што ж цяпер рабіць? Які жах! Што нарабілі браты! Яны зруйнавалі Божы план для Язэпа. Лепш прыдумаць нешта яшчэ, і як мага хутчэй! Які тут можа быць запасны план?»

Многія хрысціяне рэагуюць на крызісныя сітуацыя, як быццам у нябёсах адбываецца менавіта такая размова. Ці можаце вы ўявіць, як Айцец кажа Ісусу: «Сын, Джыма звольнілі, таму што яго супрацоўнік пра яго схлусіў. Што рабіць? Ці ёсць

у Цябе паблізу нейкія вакансіі?» Або: «Ісус, Салі ўжо трыццаць чатыры, і яна яшчэ не замужам. Ці ёсць у Цябе там унізе добрыя хлопцы? Мужчына, за якога яна марыла выйсці замуж, ажаніўся з яе лепшай сяброўкай, якая пляткарыла пра яе і настроіла яго супраць Салі». Абсурд, але наша рэакцыя кажа, што менавіта так мы бачым Бога.

Паразважаем, як Язэп мог бы абысціся з крыўдзіцелямі ў цэрквах сёння. Калі б ён быў такім як большасць з нас, ведаеце, што б ён рабіў? Думаў пра помсту. Ён суцяшаў бы сябе думкамі: «Калі я да іх дабяруся, я іх заб'ю! Я заб'ю іх за тое, што яны мне зрабілі. Яны за гэта заплацяць!»

Калі б Язэп сапраўды так думаў, Бог пакінуў бы яго гніць у вязніцы! Калі б Язэп выйшаў з турмы з такім стаўленнем, ён забіў бы дзесяць з дванаццаці пачынальнікаў каленаў Ізраіля. Сярод іх быў бы і Юда, з калена якога прыйшоў Хрыстос.

Так, тыя, хто настолькі кепска абышоўся з Язэпам, былі патрыярхамі Ізраіля! І Бог паабяцаў Абрагаму, што з іх народзіцца народ. Праз іх урэшце прыйдзе Госпад Ісус! Язэп не запляміў сябе крыўдай, і задума Божая стала рэалізоўвацца ў яго жыцці і жыцці яго братоў.

## ЦІ МОЖА СТАЦЬ ЯШЧЭ ГОРШ?

Турма была часам прасейвання для Язэпа, але таксама яна была часам магчымасцяў. З Язэпам было двое вязняў, і абое яны прыснілі яскравыя сны, і гэта не давала ім супакою. Язэп на дзіва дакладна патлумачыў ім сны. Аднаго з вязняў мусілі вярнуць на працу, а другога – пакараць смерцю. Язэп папрасіў першага вязня нагадаць пра яго фараону, калі той зноў будзе прыязна ставіцца да яго. Вязень вярнуўся на службу да фараона, але два гады ад яго нічога не было чутно. Гэта было яшчэ адным расчараваннем для Язэпа, яшчэ адной магчымасцю пакрыўдзіцца.

***У Бога заўжды ёсць план.***

Прыйшоў час, калі фараон прысніў сон, які вельмі яго ўсхваляваў. Ніхто з чараўнікоў і мудрацоў фараона не змог яго патлумачыць. І вось тады слуга, якога вярнулі на працу з вязніцы, прыгадаў Язэпа. Ён расказаў, як Язэп патлумачыў яго сон і сон яго былога калегі ў вязніцы. Язэпа прывялі да фараона, і ён патлумачыў яму значэнне сну: надыходзіў голад. Таксама ён даў мудрыя настаўленні адносна падрыхтоўкі да цяжкіх часоў. Фараон адразу паставіў Язэпа другім пасля сябе над усім Егіптам. Праз мудрасць, якую Язэпу даў Бог, ён падрыхтаваўся да страшнага голаду, што мусіў надысці.

Пазней, калі голад распаўсюдзіўся на ўсе навакольныя краіны, браты Язэпа былі вымушаныя прыйсці ў Егіпет па дапамогу. Калі Язэп трымаў у сэрцы нешта супраць братоў, менавіта ў гэты час гэтым можна было б скарыстацца. Ён мог кінуць іх у турму на ўсё жыццё, катаваць і нават беспакарана забіць, бо быў другім пасля фараона ў Егіпце. Яго браты не былі важнымі для фараона.

Але Язэп даў ім зерне бясплатна. Потым братам і іх сем’ям далі самую лепшую зямлю ў Егіпце, і яны жылі там і карысталіся ёй. Падсумоўваючы, можна сказаць, што ім аддалі найлепшае. Урэшце Язэп дабраславіў тых, хто праклінаў яго, і зрабіў дабро тым, хто ненавідзеў яго (гл. Мацвея 5:44.)

Бог ведаў, што зробяць браты Язэпа, яшчэ да таго, як яны гэта здзейснілі. Насамрэч, Госпад ведаў, што яны так зробяць яшчэ да таго, як даў Язэпу сны, нават да таго, як усе яны нарадзіліся.

Каб зрабіць яшчэ адзін крок наперад, падумайце пра тое, што Язэп сказаў братам, калі сустрэўся з імі. «Але цяпер не сумуйце, і няхай ня будзе жалю ў вачах вашых, што вы прадалі мяне сюды, бо дзеля захаваньня жыцьця *паслаў мяне Бог* перад вамі. Бо вось, два гады голаду на зямлі, і яшчэ пяць гадоў, у якія нельга будзе ані араць, ані жаць. І *паслаў мяне Бог* перад вамі, каб пакінуць з вас рэшту на зямлі і захаваць жыцьцё вашае

збаўленьнем вялікім. *І цяпер ня вы паслалі мяне сюды, але Бог*» (Быц. 45:5–8, выдзелена аўтарам).

Прыслухайцеся да таго, што кажа аўтар Псальмаў: «І паклікаў Ён голад на зямлю, усякую падпору хлеба зламаў, *і паслаў перад абліччам іхнім чалавека, які быў прададзены як нявольнік, Язэпа»* (Пс. 105:16–17, выдзелена аўтарам).

Хто паслаў Язэпа? Яго браты ці Бог? З вуснаў двух сведкаў мы чуем, што яго паслаў Бог. Язэп сказаў сваім братам: «І цяпер ня вы паслалі мяне сюды». Паслухайце, што кажа Дух!

Як я ўжо казаў, ані чалавек, ані д'ябал не можа падмяніць Божы план для вашага жыцця. Калі вы зразумееце гэтую праўду, гэта дасць вам свабоду. Ёсць толькі адзін чалавек, які можа зрынуць волю Божую для вас, і гэта вы!

Падумайце пра дзяцей Ізраіля. Бог паслаў вызваліцеля, Майсея, каб вывесці іх з егіпецкага рабства ў Абяцаную Зямлю. Праз год у пустыні князі народа пайшлі агледзець зямлю. Яны вярнуліся са скаргамі. Яны напалохаліся вялікіх і ваяўнічых народаў у той зямлі.

Увесь народ, за выключэннем Егошуа і Халева, пагадзіўся з князямі. Народу падавалася, што Бог вывеў іх туды паміраць. Людзі былі пакрыўджаныя на Майсея і на Бога. Гэта працягвалася больш за год. Іх крыўда прывяла да таго, што гэта пакаленне так і не ўбачыла зямлю, якую Бог абяцаў даць ім у валоданне.

Многія людзі верна і аддана служаць Госпаду і трапляюць у складаныя жыццёвыя сітуацыі праз няправільнае стаўленне злых людзей або цялесных хрысціян. Гэта праўда, з імі абышліся несправядліва. Але крыўда прывядзе да таго, што ажыццявіцца мэта д'ябла вывесці іх з волі Божай.

Калі вы зможаце ўтрымацца ад крыўды, вы застанецеся ў волі Божай. Калі вы пакрыўдзіцеся, то станеце палонным ворага, выконваючы яго мэты і волю. Выбірайце. Значна карыснейшым будзе застававацца свабодным ад крыўды.

Мы павінны памятаць, што Госпад ведае пра ўсё, што

выступіць супраць нас, яшчэ да таго, як гэта здарыцца. Калі б д’ябал мог знішчыць нас у любы момант, ён даўно сцёр бы нас з аблічча зямлі, бо ён люта ненавідзіць людзей. Заўсёды памятайце гэта папярэджанне:

> Вас наведала спакуса ня іншая, як чалавечая. Але верны Бог, Які не пакіне вас быць спакушанымі больш, чым вы можаце [вытрымаць], але са спакусай зробіць і *выхад (у анг.перакладзе – канкрэтны спосаб збаўлення)*, каб вы маглі яе перанесьці.
>
> —1 КАРЫНЦЯНАЎ 10:13, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Звярніце ўвагу, што тут сказана «*канкрэтны* спосаб збаўлення», а не проста «нейкі выхад». Бог ужо бачыць усе варожыя сітуацыі, з якімі мы сутыкнемся, вялікія і малыя, і Ён запланаваў канкрэтны спосаб выхаду з іх. Што яшчэ цікавей, часта тое, што падаецца канцом Божага плана, насамрэч аказваецца дарогай да яго рэалізацыі, калі мы застаемся паслухмянымі і не крыўдзімся.

Таму памятайце: заставайцеся паслухмянымі Богу, не паддавайцеся крыўдзе; супрацьстаньце д’яблу і ён уцячэ ад вас (Якуба 4:7). Мы супрацьстаім д’яблу, калі не паддаёмся крыўдзе. Гэтая мара або бачанне верагодна будзе рэалізаваная не так, як вы сабе ўяўляеце, але Яго Слова і абяцанні не падвядуць вас. Мы можам адмяніць іх толькі праз сваю непаслухмянасць.

## ІНШЫ ВІД ЗДРАДЫ

Мала хто сутыкаўся з такім стаўленнем, як стаўленне братоў да Язэпа. Калі б так да яго паставіліся ворагі, было б не так балюча. Але гэта былі яго браты, яго цела і кроў. Яны мусілі падтрымліваць, натхняць, абараняць і клапаціцца пра яго. Што магло быць горшым за тое стаўленне, якое перажыў Язэп?

## АДНА СПРАВА – ПЕРАЖЫВАЦЬ АДРЫНУТАСЦЬ І ЗЛОБУ З БОКУ БРАТА ЦІ СЯСТРЫ, АЛЕ ЗУСІМ ІНШАЕ – ПЕРАЖЫВАЦЬ ГЭТА З БОКУ АЙЦА.

Я выкладаю ў розных класах сярэдняй і старэйшай школы. Нядаўна я прачытала кнігу «Прынада шатана» і атрымала некалькі адкрыццяў. Разам з вучнямі мы паглядзелі відэа, і Дух Святы так моцна дзейнічаў у класе, што ўсе пачалі вызнаваць крыўды і прасіць прабачэння. Некалькі вучняў сказалі, што гэта быў самы лепшы дзень за цэлы год. Адна вучаніца памірылася з татам пасля сур’ёзнага канфлікту; яшчэ адна распачала працэс ацалення ад глыбокіх ранаў, пакінутых бабуляй. Госпад сапраўды магутна паслужыў гэтым дзецям. Дзякуй за тое, чым вы дзеліцеся.

—Р. Ф., ІНДЫЯНА

# 4

# ОЙЧА МОЙ, ОЙЧА МОЙ!

*Бацька мой ... І даведайся, і пабач, што няма ў руцэ маёй ані зла, ані бунту, і не саграшыў я супраць цябе. А ты шукаеш душы маёй, каб забраць яе.*

**—1 САМУЭЛЯ 24:12**

У мінулым раздзеле мы бачылі, як браты Язэпа імкнуліся знішчыць яго. Мы бачылі боль, які ён перажыў праз гэтую здраду. Магчыма, вы знаходзіцеся ў падобнай сітуацыі. Вам здрадзілі вашы бліжнія, людзі, ад якіх вы чакалі любові і падтрымкі.

У гэтым раздзеле я хачу разгледзець сітуацыю, нашмат больш балючую, чым здрада брата. Адна справа быць адрынутым братам, які трымае на цябе зло, і зусім іншая –

перажыць адрынутасць і злосць айца. Кажучы пра айцоў, я маю на ўвазе не толькі біялагічнага бацьку, але любога кіраўніка, якога Бог ставіць над намі. Гэта людзі, ад якіх мы чакаем любові, навучання, клопату і ўзрошчвання.

## АДНОСІНЫ ЛЮБОВІ І НЯНАВІСЦІ

Мы можам убачыць айца, які здрадзіў, на прыкладзе адносінаў паміж царом Саўлам і Давідам (гл. 1 Самуэля 16–31.) Іх жыцці перасякаліся яшчэ да іх знаёмства, бо Самуэль, прарок Божы, памазаў Давіда стаць наступным царом Ізраіля. Давіда мусіла перапаўняць захапленне. Магчыма, ён думаў: «Гэта той самы чалавек, які памазаў Саўла. Я сапраўды стану царом!»

А Саўл у палацы пакутаваў ад злога духа, бо не паслухаўся Бога. Адзінай палёгкай быў час, калі нехта граў на гуслях. Слугі Саўла пачалі шукаць маладога чалавека, які мог бы сядзець ля цара і служыць яму. Адзін са слугаў прапанаваў Давіда, сына Есэя. Цар Саўл паслаў па Давіда і загадаў яму прыйсці ў палац і служыць яму.

Давід, напэўна, думаў, што *Бог ужо здзяйсняе Сваё абяцанне праз прарока. Я дакладна знайду міласць у вачах цара. Напэўна, адсюль і пачнецца мой рост.*

Час ішоў, і бацька Давіда папрасіў яго аднесці ежу старэйшым братам, якія ўдзельнічалі ў вайне з філістынцамі. Прыйшоўшы ў стан Ізраіля, Давід убачыў філістынскага ваяра Галіята, які здзекваўся з войска народа Божага, і так працягвалася ўжо сорак дзён. Ён даведаўся, што цар прапанаваў аддаць сваю дачку за таго, хто пераможа асілка.

Давід пайшоў да цара і папрасіў дазвол ваяваць супраць Галіята. Давід забіў Галіята і атрымаў за жонку дачку Саўла. На той час ён ужо заваяваў прыхільнасць Саўла і пастаянна жыў у яго палацы. Ёнатан, старэйшы сын Саўла, заключыў запавет вечнага сяброўства з Давідам. Ва ўсім, што Саўл давяраў Давіду,

рука Божая была з ім і ён меў поспех. Цар патрабаваў, каб ён еў за сталом з ім і яго сынамі.

Давід быў узрадаваны. Ён жыў у палацы, еў за сталом цара, быў мужам дачкі цара, сябраваў з Ёнатанам і меў поспех ва ўсіх сваіх паходах. Ён нават заваёўваў папулярнасць у народа. Давід бачыў, як прароцтва здзяйсняецца ў яго на вачах.

Саўл ставіў Давіда вышэй за іншых слуг. Ён стаў для яго айцом. Давід быў упэўнены, што Саўл будзе вучыць і настаўляць яго і аднойчы з гонарам узвядзе яго на трон. Давід радаваўся вернасці і добрасці Божай.

Але аднойчы ўсё памянялася.

Калі Саўл і Давід разам вярталіся з бітвы, жанчыны з розных гарадоў Ізраіля выйшлі ім насустрач з танцамі і спевамі: «Саўл перамог тысячы, а Давід – дзясяткі тысяч». Гэта раз’юшыла Саўла, і з таго дня ён ненавідзеў Давіда. Двойчы, калі Давід граў Саўлу на гуслях, той спрабаваў яго забіць.

Біблія кажа, што Саўл ненавідзеў Давіда, бо ведаў, што Бог быў з Давідам, а не з ім. Давід быў вымушаны ўцякаць, каб уратавацца. Яму не было куды ісці, і ён уцёк у пустыню.

«Што здарылася?» – думаў Давід. – «Абяцанне здзяйснялася, а цяпер усё разбурылася. Мой настаўнік спрабуе забіць мяне. Што мне рабіць? Саўл – памазаны Богам слуга. Калі ён супраць мяне, якія ў мяне шанцы? Ён – цар, Божы чалавек над Божым народам. Чаму Бог гэта дапускае?»

Саўл, у суправаджэнні трох тысяч найлепшых ваяроў Ізраіля, гнаў Давіда з пустыні ў пустыню, з пячоры ў пячору. Перад імі стаяла адна задача: забіць Давіда.

У гэты момант абяцанне падавалася мрояй. Давід больш не жыў у палацы і не еў за сталом цара. Ён хаваўся ў пячорах і еў дзічыну, здабытую ў пустыні. Ён больш не ездзіў побач з царом, але на яго палявалі людзі, якія некалі ваявалі з ім побач. Не было цёплага ложка, слугаў і прыёмаў царскага двара. Яго жонку аддалі іншаму. Ён зведаў самоту чалавека–выгнанца.

Звярніце ўвагу, што Бог, а не д’ябал, прывёў Давіда ў палац Саўла. Чаму Бог гэта не проста дазволіў, але і спланаваў? Чаму прыхільнасць пранеслася перад вачыма Давіда, а потым ён раптоўна яе пазбавіўся? Для Давіда гэта было цудоўнай магчымасцю пакрыўдзіцца, і не толькі на Саўла, але і на Бога. Усе неадказаныя пытанні павялічвалі спакусу паставіць Божую мудрасць і план пад пытанне.

Саўл быў рашуча настроены забіць маладога слугу любым коштам, і яго шаленства расло. Саўл быў у адчаі. Святары ў горадзе Ноб далі Давіду прытулак, ежу і меч Галіята. Яны нічога не ведалі пра тое, што Давід уцякаў ад Саўла, лічылі, што ён пайшоў па справе цара. Яны запыталіся ў Госпада для Давіда і выправілі яго.

Калі Саўл даведаўся пра гэта, ён быў у ярасці. Ён забіў восемдзясят пяць бязвінных святароў Госпада і ўвесь горад Ноб мечам, усіх мужчын, жанчын, дзяцей, немаўлят, кароў, аслоў і авечак. Ён зрабіў з імі, нявіннымі, тое, што мусіў зрабіць з амалекцамі. Ён быў забойцам. Як жа Бог мог даць Свайго Духа такому чалавеку?

Неяк Саўл даведаўся, што Давід быў у пустыні Эн–Гэдзі, і выправіўся па яго з трыма тысячамі чалавек. Падчас падарожжа яны спыніліся адпачыць у пячоры, не ведаючы, што ў яе глыбіні схаваўся Давід. Саўл зняў верхняе адзенне і паклаў яго побач. Давід ціхенька выслізнуў з месца, дзе хаваўся, адрэзаў кавалак шатаў і сышоў незаўважаным.

Калі Саўл выйшаў з пячоры, Давід схіліўся да зямлі і крыкнуў яму наўздагон: «Дык пабач, бацька мой, крысо плашча твайго ў руцэ маёй... даведайся, і пабач, што няма ў руцэ маёй *ані зла, ані бунту*, і не саграшыў я супраць цябе. А ты шукаеш душы маёй, каб забраць яе» (1 Сам. 24:11, выдзелена аўтарам).

Давід звяртаўся да Саўла: «Бацька мой, бацька мой!» Папросту кажучы, ён крычаў: «Зірні на маё сэрца! Будзь мне бацькам. Мне патрэбны кіраўнік, які мяне будзе вучыць, а не

знішчаць!» Хоць Саўл і спрабаваў яго забіць, у сэрцы Давіда яшчэ была надзея.

## ДЗЕ АЙЦЫ?

Я чуў гэты крык ад мноства мужчын і жанчын у целе Хрыста. Большасць з іх – маладыя людзі, якія маюць моцнае пакліканне ад Бога. Яны клічуць айцоў, тых, хто іх навучыць, будзе любіць, падтрымліваць і натхняць. Вось чаму Бог сказаў, што «зьверне сэрца бацькоў [кіраўнікоў, лідараў] да сыноў [народа] іхніх, і сэрца сыноў — да бацькоў іхніх, каб Я, прыйшоўшы, ня ўдарыў зямлі [выгубленьнем] з закляцьцем» (Мал. 4:6).

Наш народ страціў сваіх айцоў (бацькоў, кіраўнікоў ці служыцеляў) у 1940–х і 1950–х гг, і сёння наш стан усё пагаршаецца. Як і Саўл, многія лідары нашых дамоў, карпарацый і цэркваў больш заклапочаныя сваімі мэтамі, чым сваімі нашчадкамі.

Праз такое стаўленне гэтыя кіраўнікі разглядаюць народ Божы як рэсурс, які служыць іх бачанню, замест таго, каб лічыць бачанне рэсурсам для служэння народу. Поспехам бачання апраўдваюць кошт параненых жыццяў і знішчаных людзей. Справядлівасць, міласць, цэласнасць і любоў ставяцца пад удар дзеля поспеху. Рашэнні прымаюцца дзеля грошай, лічбаў і вынікаў.

Гэта адчыняе дзверы такога стаўлення, як да Давіда: урэшце, Саўл абараняў сваё царства. Такое стаўленне прымальнае ў розуме лідараў, бо яны лічаць, што спрыяюць распаўсюду Эвангельля.

Колькі лідараў скарацілі сваіх падпарадкаваных праз падазрэнні? Чаму яны іх падазравалі? Бо яны не служаць Богу. Яны служаць бачанню. Як і Саўл, яны адчуваюць сябе няўпэўненымі ў сваім пакліканні, і гэта нараджае зайздрасць і пыху. Яны прызнаюць якасці ў тых людзях, якіх лічаць

пабожнымі, і хочуць выкарыстоўваць гэтых людзей, пакуль ім гэта зручна. Саўлу падабаўся поспех Давіда, пакуль ён не стаў бачыць у ім пагрозу для сябе. Тады ён панізіў Давіда і стаў шукаць прычыну знішчыць яго.

Я размаўляў з мноствам маладых мужчын і жанчын, якія шукалі справаздачнасці. Яны хацелі слухацца лідара, які б вучыў іх. Яны адчувалі сябе ізаляванымі і самотнымі. Яны шукалі таго, хто стане для іх айцом. Але Бог дазволіў ім прайсці праз адрынутасць, бо жадаў зрабіць у іх жыцці тое, што зрабіў у жыцці Давіда. Уважліва слухайце тое, што кажа Дух.

Давід хваляваўся, бо Саўл лічыў, што ён паўстаў супраць яго і задумаў зло. Давід, верагодна, зноў і зноў думаў: «Што я зрабіў няправільна? Чаму сэрца Саўла так хутка настроілася супраць мяне?» Вось чаму ён выгукнуў: «І гаварылі мне, каб я забіў цябе, але я пашкадаваў цябе, Я толькі адрэзаў крысо плашча твайго, каб *ты ведаў і бачыў, што няма ў руцэ маёй зла ці бунту*» (гл. 1 Самуэля 24:11). Давід думаў, што калі ён зможа даказаць сваю любоў да Саўла, Саўл зноў будзе добра ставіцца да яго, і прароцтва здзейсніцца.

Людзі, якія перажылі адрынутасць з боку айца або кіраўніка, схільныя браць усю віну на сябе. Яны ў палоне сваіх думак: *«Што я зрабіў? Хіба маё сэрца было нячыстае?»* Часам яны думаюць: «*Хто настроіў майго кіраўніка супраць мяне?»* і пастаянна спрабуюць даказаць кіраўнікам сваю невінаватасць. Яны лічаць, што іх прымуць, калі яны змогуць паказаць сваю адданасць і каштоўнасць. На жаль, чым больш яны спрабуюць, тым больш адрынутымі сябе адчуваюць.

## ХТО ЗА МЯНЕ АДПОМСЦІЦЬ?

Саўл прызнаў добрым учынак Давіда, калі ўбачыў, што Давід мог яго забіць, але не забіў. Таму Саўл і яго людзі сышлі. Давід, напэўна, думаў: «*Цяпер цар верне мяне на пасаду.*

*Прароцтва здзейсніцца. Ён убачыць маё сэрца і будзе лепш да мяне ставіцца».*

Не так хутка, Давід. Праз нейкі час Саўлу паведамілі, што Давід быў на ўзгорышчы Хахіля. Саўл выправіўся туды з тымі ж трыма тысячамі людзей. Я ўпэўнены: такі ўчынак Давід ледзь вытрымаў. Яму стала ясна: гэта не проста непаразуменне. Саўл наўмысна, без правакацый з боку Давіда, хоча яго забіць. Давід адчуваў сябе цалкам адрынутым. Саўл ведаў яго стаўленне і ўсё ж ішоў супраць.

Давід разам з Абішаем праслізнулі ў лагер Саўла. Ніхто з вартаўнікоў не ўбачыў іх, таму што Бог паслаў ахове глыбокі сон. Гэтыя двое прабраліся праз усё войска туды, дзе спаў Саўл.

Абішай прасіў Давіда: «Сёння Бог аддае ворага твайго ў рукі твае. Цяпер дазволь, і я прыб’ю яго дзідаю да зямлі раз, і другі ўжо раз ня будзе патрэбы» (1 Сам. 26:8).

У Абішая былі вельмі важкія прычыны лічыць, што Давід мусіць дазволіць яму забіць Саўла. Па–першае, Саўл хладнакроўна забіў восемьдзесят пяць святароў разам з іх сем’ямі!

Па–другое, ён сабраў войска з трох тысяч ваяроў, каб забіць Давіда і яго паплечнікаў. Абішай даводзіў: «Калі ты не заб’еш ворага першым, ён дакладна заб’е цябе. Гэта самаабарона. Любы суд дазваляе гэта!»

Па–трэцяе, Бог праз Самуэля памазаў Давіда як наступнага цара Ізраіля. Давід павінны запатрабаваць сваю спадчыну, інакш ён памрэ і не ўбачыць здзяйсненне прароцтва.

Па–чацвёртае, Бог навёў сон на ўсё войска, каб Давід і Абішай маглі дайсці якраз да Саўла. Навошта ж яшчэ Бог так зрабіў? Абішай меркаваў, што Давіду больш ніколі не выпадзе такая магчымасць.

Усе прычыны падаваліся добрымі. У іх быў сэнс, і Давід меў пацверджанне ад іншага брата. Таму, калі б Давід быў хоць крыху пакрыўджаны, ён бы адчуваў справядлівасць сітуацыі і дазволіў бы Абішаю забіць Саўла.

Паслухайце адказ Давіда: «Не забівай яго, бо ці ж можа быць невінаваты той, хто падняў руку сваю на памазанца *ГОСПАДАВАГА*?... Як жывы ГОСПАД, ГОСПАД пакарае яго, або прыйдзе дзень ягоны і ён памрэ, або ён загіне, пайшоўшы на вайну. Няхай захавае мяне ГОСПАД, каб я падняў руку сваю на памазанца ГОСПАДАВАГА» (1 Сам. 26:9–11, выдзелена аўтарам).

Давід не забіў Саўла, хаця Саўл пазбавіў жыцця нявінных людзей і таксама хацеў забіць Давіда. Давід не помсціў за сябе, але аддаў усё ў Божыя рукі.

Вядома, было б лягчэй адразу пакласці канец усяму. Лягчэй для Давіда *і* для народа Ізраіля. Ён ведаў, што народ быў як статак авечак без пастуха. Ён ведаў, што воўк абкрадаў іх дзеля сваіх эгаістычных жаданняў. Давіду было цяжка не абараняць сябе, але магчыма, нават цяжэй не збавіць свой народ ад цара–вар'ята. Давід прыняў гэта рашэнне, хоць і ведаў, што адзіным суцяшэннем Саўла была думка пра яго забойства.

Давід даказаў, што меў чыстае сэрца, калі ў першы раз пашкадаваў Саўла. Хоць Давіду выпаў другі шанец забіць Саўла, ён не дакрануўся да яго. Саўл быў памазанцам Госпада, і Давід пакінуў суд Божы ў руках Божых.

Колькі людзей сёння маюць такое сэрца, як Давід? Мы больш не забіваем адзін аднаго фізічнымі мячамі, але выкарыстоўваем іншую зброю – язык. «Смерць і жыццё ў руцэ языка» (Прып. 18:21).

У цэрквах адбываюцца падзелы, сем'і і шлюбы разбураюцца, любоў памірае пад лавінай слоў, сказаных праз боль і горыч. Пакрыўджаныя сябрамі, сям'ёй і лідарамі, мы б'ём іншых словамі, завостранымі горыччу і гневам. Хоць інфармацыя і факты могуць быць правільнымі, матывы нячыстыя.

У Прыповесцях 6:16–19 напісана, што сеяць нязгоду паміж братамі – гэта мярзота перад Госпадам. Калі мы паўтараем нешта (нават праўду) з намерам разбурыць або пашкодзіць адносіны ці рэпутацыі, гэта ўсё яшчэ абраза для Бога.

# ЦІ ВЫКАРЫСТОЎВАЕ МЯНЕ БОГ, КАБ ВЫКРЫЦЬ ГРАХІ МАЙГО ЛІДАРА?

Перад тым, як мы з жонкай пачалі цяперашняе служэнне, я сем гадоў браў удзел у служэнні дапамогі і быў моладзевым пастарам. Калі я служыў моладзевым пастарам, у царкве быў чалавек, якому не падабаўся я і мае пропаведзі. Звычайна мяне гэта не турбуе, але той чалавек меў высокую пасаду.

Я верыў, што Бог паклікаў мяне несці вестку чысціні і адвагі моладзі, і сын гэтага чалавека быў у маёй групе.

Бог прамаўляў у сэрца маладога чалавека і выкрываў яго. Аднойчы ён прыйшоў да нас у слязах і з роспаччу прызнаўся: лад жыцця ў яго сям’і не дасягаў тых стандартаў, да якіх я заклікаў маладых людзей.

Гэты выпадак і іншыя канфлікты, як падаецца, падштурхоўвалі яго бацьку, каб пазбавіцца мяне. Ён прыходзіў да старэйшага пастара, каб ілжыва мяне абвінаваціць і настроіць супраць мяне. Потым ён расказваў: старэйшы пастар быў настроены супраць мяне, аднак за мяне заступіўся. У службовых паведамленнях бацька маладога чалавека крытыкаваў мяне, хоць і не ўзгадваў маё імя. Аднак па розных дэталях мяне можна было пазнаць. Гэты чалавек мне ўсміхаўся, але меў намер мяне знішчыць.

Некалькі членаў моладзевай групы казалі, што мяне звольняць. Малады чалавек распаўсюджваў гэтую думку не са зла, ён проста паўтараў тое, што чуў дома. Я злаваўся і не разумеў, што адбываецца. Я размаўляў з яго бацькам, і той прызнаў, што казаў гэта, бо толькі паўтараў думкі старэйшага пастара.

Ішлі месяцы, і падавалася, сітуацыю нельга змяніць. Гэты чалавек спыніў усе адносіны паміж мной і маім старэйшым пастарам. Так здаралася з кожным пастарам, які яму не падабаўся.

Мая сям’я была пад пастаянным ціскам, мы не ведалі, ці зможам застацца ў гэтай царкве, ці будзем вымушаны пайсці. Мы купілі дом, жонка чакала дзіця, і нам не было куды ісці. Я

не хацеў рассылаць рэзюмэ, бо верыў: Бог прывёў мяне ў гэтую царкву, і я хацеў застацца. У мяне не было запаснога плану.

Мая жонка нервавалася:

— Я ведаю, што цябе збіраюцца звольніць. Усе мне кажуць пра гэта.

— Мяне яшчэ не звольнілі, і не могуць звольніць без Божага дазволу, — адказваў я.

Жонка думала, што я не мог прыняць рэальнасць, і ўгаворвала мяне сысці самому.

Урэшце да мяне дайшлі навіны, што прынята рашэнне звольніць мяне. Старэйшы пастар абʼявіў царкве, што моладзевую групу чакаюць змены. Я ўсё яшчэ не паразмаўляў з пастарам пра канфлікт з лідарам, якога ён паставіў нада мной. На наступны дзень у мяне была прызначаная сустрэча з пастарам і маім лідарам. Бог вельмі канкрэтна паказаў, што мне не трэба абараняць сябе.

Калі на наступны дзень я прыйшоў у офіс, я здзівіўся, што пастар быў там адзін. Зірнуўшы на мяне, ён сказаў:

— Джон, Бог паслаў цябе ў нашу царкву. Я не дазволю табе сысці.

Я выдыхнуў з палёгкай. У апошні момант Бог абараніў мяне.

— Чаму гэты чалавек настроены супраць цябе? — спытаўся у мяне пастар. — Паразмаўляй з ім і выправі адносіны.

У хуткім часе пасля размовы я атрымаў пісьмовы доказ рашэння, якое той лідар прыняў адносна маёй сферы адказнасці. Гэта паказвала яго сапраўдныя матывы. Я быў гатовы перадаць доказ старэйшаму пастару.

У той дзень я хадзіў туды–сюды па пакоі і маліўся сорак пяць хвілін, спрабуючы пераадолець непрыемныя пачуцці. Я паўтараў: «Бог, гэты чалавек быў несумленным і злым. Яго трэба выкрыць. Ён знішчае служэнне. Я павінен сказаць пастару, які ён насамрэч!»

Я далей апраўдваў свае намеры выкрыць лідара. «Усё, што я кажу, — задакументаваны факт, не эмоцыі. Калі яго не спыніць, беззаконне напоўніць усю царкву».

Урэшце, расстроены, я ўсклікнуў: «Бог, Ты не хочаш, каб я выкрыў яго, ці не так?»

Калі я так сказаў, Божы мір напоўніў маё сэрца. Я здзіўлена пахітаў галавой. Я ведаў, што Бог не хацеў, каб я нешта рабіў, таму я выкінуў доказ. Пазней, калі я змог зірнуць на сітуацыю больш аб'ектыўна, я зразумеў, што хацеў адпомсціць за сябе больш, чым абараніць іншых у служэнні. Я пераканаў сябе ў тым, што мае матывы не былі эгаістычнымі. Мая інфармацыя была дакладнай, але матывы былі нячыстымі.

Час ішоў, і аднойчы, калі я маліўся каля царквы перад пачаткам працы, гэты чалавек пад'ехаў да царквы. Бог даў мне жаданне падысці да яго і пакаяцца. Я адразу ж пачаў сябе абараняць. «Не, Госпад, гэта ён мусіць да мяне падысці! Ён прычына ўсіх праблем».

Я маліўся далей, але Госпад зноў сказаў мне, што я мушу зараз жа падысці да яго і ўпакорыцца. Я ведаў, што гэта быў Бог. Я патэлефанаваў гэтаму чалавеку з офіса і пайшоў да яго. Але тое, што я сказаў, вельмі адрознівалася ад таго, што я мог бы сказаць, калі б Бог са мной не працаваў.

Я вельмі шчыра папрасіў у яго прабачэння. «Я крытыкаваў і судзіў вас», — прызнаўся я.

Ён адразу ж памякчэў, і мы размаўлялі цэлую гадзіну. З таго дня яго нападкі на мяне спыніліся, хоць праблемы паміж ім і некаторымі іншымі пастарамі яшчэ засталіся.

Праз шэсць месяцаў, пакуль я служыў у іншым месцы, усе няправільныя рэчы, якія рабіў гэты чалавек, былі выкрытыя перад старэйшым пастарам. Гэта не мела нічога супольнага са мной, а было звязана з іншымі сферамі служэння. Ён рабіў рэчы, значна горшыя за тое, што было вядома мне. Яго адразу ж звольнілі.

Суд прыйшоў, але не маёй рукой. З ім здарылася акурат тое, што ён спрабаваў зрабіць са мной. Але калі гэта адбылося, я не радаваўся. Мне было прыкра за гэтага чалавека і яго сям'ю. Я разумеў яго боль, бо сам перажываў падобнае раней праз яго ўчынкі.

Я прабачыў яму паўгады таму і цяпер не жадаў яму зла. Калі б яго звольнілі раней, я быў бы напоўнены гневам і радаваўся б. Цяпер я дакладна ведаў, што быў свабодны ад ранейшай крыўды. Упакоранасць і нежаданне помсціць за сябе былі ключамі да вызвалення з вязніцы крыўды.

Праз год я ўбачыў яго ў аэрапорце. Мяне перапоўніла любоў Божая. Я падбег да яго і абняў. Я шчыра ўзрадаваўся, пачуўшы, што ў яго ўсё добра. Калі б я не ўпакорыўся і не падышоў да яго тады ў офісе, я не змог бы глядзець яму ў вочы ў той дзень у аэрапорце. З нашай сустрэчы прайшло ўжо некалькі гадоў, але я адчуваю толькі любоў і шчырае жаданне бачыць яго ў волі Божай.

Давід праявіў мудрасць, калі вырашыў даць Богу судзіць Саўла. Вы спытаеце: «Каго Бог выкарыстаў, каб судзіць Свайго слугу Саўла?» Філістынцаў. Саўл і яго сыны загінулі, змагаючыся з імі. Калі навіна дайшла да Давіда, ён не святкаваў. Ён плакаў.

Нейкі чалавек пахваліўся перад Давідам, што забіў Саўла, спадзеючыся здабыць прыхільнасць Давіда, але здарылася наадварот. «Як ты адважыўся падняць руку тваю і забіць памазанца ГОСПАДАВАГА?» — спытаў у яго Давід. Ён загадаў забіць гэтага чалавека (гл. 2 Самуэля 1:14 – 15).

Потым Давід склаў спеў, каб народ Юды выконваў яго ў гонар Саўла і яго сыноў. Ён загадаў людзям не казаць пра гэта на вуліцах філістынскіх гарадоў, каб ворагі не радаваліся. Давід абвяшчаў, што не будзе дажджу ці ўрадлівых палёў там, дзе быў забіты Саўл. Ён заклікаў увесь Ізраіль плакаць па Саўлу. Гэта сэрца не пакрыўджанага чалавека. Пакрыўджаны сказаў бы: «Ён атрымаў тое, што заслужыў!»

Давід пайшоў яшчэ далей і не вынішчыў тых, хто застаўся з

дома Саўла. Замест гэтага ён выказаў ім ласку: даў ім зямлю і харчаванне, а таксама месца за царскім сталом. Ці падобна гэта на пакрыўджанага чалавека?

Хаця Давід і быў адрынуты тым, хто мусіў ставіцца да яго як бацька, ён заставаўся верным нават пасля смерці Саўла. Лёгка быць верным лідару ці айцу, які любіць вас, але што наконт таго, хто хоча вас знішчыць? Вы будзеце мужчынам ці жанчынай паводле сэрца Божага альбо будзеце імкнуцца адпомсціць за сябе?

**КАЛІ БОГ ПАСЫЛАЕ АДПЛАТУ ЗА СВАІХ СЛУГ, ГЭТА ПРАВЕДНА. КАЛІ СЛУГІ БОЖЫЯ ПОМСЦЯЦЬ ЗА СЯБЕ, ГЭТА НЯПРАВЕДНА.**

М–р Бэвір, я сёння пачаў чытаць вашу кнігу «*Прынада шатана*» — не змог ад яе адарвацца! Гэта дакладна адна з найлепшых кніг, якія я чытаў.

—П. А., МІСУРЫ

# 5

# ЯК НАРАДЖАЮЦЦА ДУХОЎНЫЯ ВАЛАЦУГІ

*«Няхай даруе мне ГОСПАД, каб я зрабіў такую рэч гаспадару майму, памазанцу ГОСПАДАВУ, каб выцягнуў руку маю на яго, бо ён — памазанец ГОСПАДАЎ». І стрымаў Давід людзей сваіх гэтымі словамі, і ня даў ім, каб яны напалі на Саўла.*

**—1 САМУЭЛЯ 24:6 – 7**

У мінулым раздзеле мы бачылі, як чалавек, якога Давід хацеў бачыць сваім духоўным айцом, няправільна ставіўся да яго. Давід спрабаваў зразумець, што зрабіў няправільна. Што ён зрабіў, каб настроіць Саўла супраць сябе, і як ён мог гэта выправіць? Ён даказаў сваю вернасць, пашкадаваўшы жыццё Саўла, хоць Саўл і імкнуўся забраць яго

жыццё.

Давід упаў тварам на зямлю і закрычаў Саўлу: «Даведайся, і пабач, што няма ў руцэ маёй ані зла, ані бунту, і не саграшыў я супраць цябе».

Калі Давід паказаў сваю вернасць кіраўніку, яго розум супакоіўся і атрымаў палёгку. Пазней прыйшлі жахлівыя навіны: Саўл па–ранейшаму хацеў знішчыць яго. Але Давід адмовіўся падняць  руку на таго, хто хацеў забраць яго жыццё, хоць Бог і паслаў сон на ўсіх ваяроў і даў кампаньёна, які прасіў дазволу забіць Саўла. Давід адчуў, што ваяры паснулі не проста так, мэта была іншай: выпрабаваць яго сэрца.

Бог хацеў убачыць, ці заб’е Давід дзеля здабыцця валадарства, як гэта зрабіў Саўл, ці дазволіць Богу ўсталяваць яго трон у праведнасці навечна.

> Ня помсьціце за сябе, улюбёныя, але дайце месца гневу [Божаму], бо напісана: “Мне [належыць] помста, Я аддам”, — кажа Госпад.
>
> —РЫМЛЯНАМ 12:19.

Калі Бог пасылае адплату за Сваіх слугаў, гэта праведна. Калі Божыя слугі помсцяць за сябе, гэта няправедна. Саўл быў чалавекам, які помсціў за сябе. Ён перасledаваў Давіда, чалавека гонару, на працягу чатырнаццаці гадоў, і забіваў святароў і іх сем’і.

Калі Давід глядзеў на спячага Саўла, ён выконваў важны тэст, які правяраў: Давід мае шляхетнае сэрца або ён няўпэўнены, як Саўл? Ці застанецца Давід чалавекам паводле сэрца Божага? Спачатку нашмат лягчэй узяць справы ў свае рукі, а не чакаць дзеяння праведнага Бога.

Бог выпрабоўвае Сваіх слугаў паслухмянасцю. Ён наўмысна ставіць нас у сітуацыю, калі стандарты рэлігіі і грамадства, як падаецца, апраўдваюць нашыя ўчынкі. Бог дазваляе іншым, асабліва нашым блізкім, заклікаць нас да самаабароны. Мы

можам нават думаць, што будзем шляхетнымі і абаронім іншых, адпомсціўшы за сябе. Але гэта не Божы шлях. Гэта шлях мудрасці гэтага свету. Ён зямны і цялесны.

Калі я думаю пра магчымасць выкрыць свайго кіраўніка, я ўспамінаю, як змагаўся з думкай пра тое, што ён нашкодзіць іншым, калі яго не выкрыць. Я думаў, што *проста скажу праўду. Калі не я, то як гэта ўвогуле скончыцца?* Іншыя ўгаворвалі мяне выкрыць яго.

Але сёння я ведаю: Бог даў мне тую інфармацыю з адной мэтай — выпрабаваць мяне. Я буду такім жа, як і чалавек, што імкнуўся знішчыць маё служэнне, або дазволю дзейнічаць Божаму суду і ласцы, каб ён пакаяўся?

## ЯК БОГ МОЖА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ САПСАВАНЫХ ЛІДАРАЎ

Многія людзі запытваюцца: «Чаму Бог ставіць кіраўнікамі тых, хто робіць сур'ёзныя памылкі, а часам і вялікае зло?»

Паглядзіце на дзяцінства Самуэля (гл. 1 Самуэля 2 – 5). Бог (а не д'ябал) паставіў гэтага маладога чалавека пад уладу сапсаванага святара, якога звалі Гэлій, і яго двух сыноў, Хофні і Пінхаса, якія таксама былі святарамі. Гэтыя людзі рабілі сур'ёзныя грахі: забіралі ахвяраванні праз маніпуляцыі або сілай, чужаложылі з жанчынамі, якія збіраліся ля дзвярэй Намёта.

Ці можаце вы ўявіць служэнне разам з чалавекам, які вядзе такое жыццё? Са служыцелем, які настолькі глухі да дзеяння Духа, што не можа адрозніць жанчыны, якая моліцца, ад п'яной! Настолькі цялесным, што мае лішнюю вагу. Настолькі абыякавым, што не прадпрымае ніякіх дзеянняў адносна сваіх сыноў, якіх ён паставіў лідарамі, а тыя чужаложылі ў царкве.

Большасць сучасных хрысціян пакрыўдзілася б і стала шукаць іншую царкву, расказваючы пра грахоўнае жыццё былога пастара і кіраўнікоў царквы. У такой страшнай сітуацыі

я з радасцю нагадаю тое, што зрабіў малады Самуэль: «Юнак Самуэль служыў ГОСПАДУ пад наглядам Гэлія» (1 Сам. 3:1).

Але сапсаванасць уплывала на ўсё: «І слова ГОСПАДА было рэдкім у тыя дні, і відзежаў не было» (1 Сам. 3:1). Падавалася, што Бог адышоў ад усёй гебрайскай супольнасці. Божы свяцільнік мог вось–вось згаснуць у храме Госпада. Але ці пайшоў Самуэль пакланяцца ў іншае месца? Ці звярнуўся ён да старэйшынаў, каб выкрыць беззаконне Гэлія і яго сыноў? Ці сфармаваў ён камітэт, каб зняць Гэлія і яго сыноў з пастарскага служэння? Не, ён служыў Госпаду!

Бог паставіў Самуэля ў гэтым месцы, і ён не нёс адказнасці за паводзіны Гэлія ці яго сыноў. Ён быў пастаўлены не судзіць, але служыць ім. Самуэль ведаў: Гэлій — слуга Божы, а не яго. Ён ведаў, што Бог мог вырашыць усе пытанні са Сваімі слугамі.

Дзеці не выпраўляюць бацькоў. Але адказнасць бацькоў — вучыць і выпраўляць сваіх дзяцей. Мы павінны вырашаць пытанні і супрацьстаяць тым, каго Бог даў пад нашу адказнасць. Вось наша задача. Роўных нам мы мусім натхняць і ўшчуваць, як братоў і сёстраў. Але ў гэтым раздзеле, як і ў мінулым, я разглядаю нашу рэакцыю на тых, хто стаіць вышэй за нас.

Самуэль служыў прызначанаму Богам служыцелю як мага лепш, не імкнучыся судзіць або выпраўляць. Слова выпраўлення Самуэль сказаў толькі адзін раз, калі Гэлій прыйшоў да Самуэля і спытаў, якое прароцтва Бог даў яму уначы. Але нават тады гэта было слова выпраўлення не ад Самуэля, але ад Бога. Калі б больш людзей трымаліся такога прынцыпу, нашы цэрквы былі б іншымі.

## ЦЭРКВЫ — НЕ КАВЯРНІ

Сёння мужчыны і жанчыны з гатоўнасцю сыходзяць з цэркваў, калі бачаць нейкія праблемы ў кіраўніцтве. Магчыма, пастар няправільна распараджаецца ахвяраваннямі. Магчыма,

няправільна выдаткоўваюцца грошы. Магчыма, людзі сыходзяць, бо ім не падабаюцца пропаведзі пастара: або пастар занадта фармальны, або занадта таварыскі. Спіс бясконцы. Людзі не захоўваюць надзею падчас складанасцяў і бягуць туды, дзе, як падаецца, няма канфлікту.

Давайце прызнаем: адзіны дасканалы пастар — Ісус. Дык чаму мы ўцякаем ад праблем у Амэрыцы замест таго, каб іх вырашыць? Калі мы не вычарпаем канфлікт адразу, мы застаёмся пакрыўджанымі. Часам мы кажам, што ад нашага прароцкага служэння адмовіліся. Тады мы ходзім з царквы ў царкву, шукаючы дасканалых лідараў.

Падчас працы над гэтай кнігай я быў сябрам усяго дзвюх цэркваў у двух розных штатах. І гэта на працягу апошніх чатырнаццаці гадоў. У мяне было больш за дзве (насамрэч — шмат) магчымасці пакрыўдзіцца на кіраўніцтва. Большасць з іх (я хацеў бы дадаць) з'явіліся па маёй віне або няспеласці. У мяне быў шанец стаць крытычна настроеным і судзіць лідараў, але сыходзіць з царквы не было выйсцем. Аднойчы ў вельмі складаных абставінах Госпад прамовіў да мяне праз верш з Пісання: «Я хачу, каб ты вось так пакінуў царкву»:

> Бо вы з радасцю выйдзеце, і *ў супакоі правядуць вас*.
>
> —ІСАЯ 55:12, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ.

Большасць людзей так не сыходзяць. Яны думаюць, што цэрквы як кавярні: можна выбіраць, што захочацца! Людзі адчуваюць сябе вольнымі заставацца, пакуль няма праблем. Але гэта не тое, чаму вучыць Біблія. У якую царкву хадзіць, выбіраеце не вы. Гэта выбірае Бог! Біблія не кажа: «Бог размясціў члены, кожны з іх асобна, у целе, *як яны хацелі*». Наадварот: «Але цяпер Бог размясціў члены, кожны з іх асобна, у целе, *як Сам хацеў*» (1 Кар. 12:18, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ).

Памятайце: калі вы будзеце ў тым месцы, дзе Бог хоча вас бачыць, д'ябал паспрабуе пакрыўдзіць вас, каб вывесці

адтуль. Ён хоча скрасці мужчын і жанчын з таго месца, дзе іх насадзіў Бог. Калі д'ябал скрадзе вас, ён дасягне поспеху. Калі вы не паддадзіцеся, нават у час вялікага канфлікту, вы сапсуеце яго планы.

## ПАДМАН КРЫТЫЦЫЗМУ

Я служыў у адной царкве ўжо некалькі гадоў. Пастар — адзін з найлепшых прапаведнікаў Амерыкі. Прыйшоўшы ў царкву, я сядзеў з адкрытым ротам у захапленні ад біблійнага вучэння ў яго пропаведзях.

З цягам часу я пачаў служыць разам з пастарам, і мог бачыць яго недахопы. Я ставіў пад пытанні некаторыя яго рашэнні адносна служэння. Я крытыкаваў і асуджаў яго, так пачалася крыўда. Пастар прапаведаваў, а я не адчуваў ні натхнення, ні памазання. Яго пропаведзь больш не служыла мне.

Яшчэ адна пара, нашы сябры, таксама працавалі ў царкве і заўважалі, што адбываецца. Бог паслаў іх у іншае месца, і яны пачалі сваё служэнне. Сябры запрасілі нас далучыцца, бо ведалі, як мы змагаліся. Яны натхнялі нас рухацца наперад у нашым пакліканні, і казалі нам пра ўсё, што пастар, яго жонка і кіраўнікі рабілі няправільна. Збіраючыся разам, мы адчувалі сябе ў пастцы, нібыта згубілі надзею.

Падавалася, сябры шчыра клапаціліся пра наш дабрабыт. Але такія размовы толькі распальвалі агонь незадаволенасці і крыўды. У Прыпавесцях 26:20 мы бачым прыклад: «Калі няма дроваў, агонь гасьне, калі няма пляткара, звадка сьціхае». Сябры прыводзілі нам правільныя факты, але ў Божых вачах гэта было няправільна: у агонь крыўды — як у іх, так і ў нас, — траплялі новыя дровы.

«Мы ведаем, што ты — чалавек Божы, — казалі яны мне. — Вось чаму ў цябе праблемы ў царкве, дзе ты знаходзішся». Гучала добра.

Мы з жонкай сказалі адно аднаму: «Вось яно! Мы ў складанай сітуацыі. Нам трэба выбрацца адсюль у царкву, дзе нашы сябры нясуць пастарскае служэнне. Яны любяць нас і стануць нашымі пастарамі. Людзі ў іх царкве прымуць нас і служэнне, якое даў нам Бог».

Мы пакінулі сваю родную царкву і сталі наведваць царкву сяброў, але ўсяго на некалькі месяцаў. Мы думалі, што ўцяклі ад нашых праблем, але заўважылі, што змаганне і складанасці працягваліся. У нас не было радасці. Нас звязваў страх стаць такімі ж, як тыя, каго мы толькі што пакінулі. Усё, што мы рабілі, было змушаным, праз сілу. Мы не маглі зноў адчуць, як рухаўся Божы Дух. Нават адносіны з новым пастарам і яго жонкай сталі нацягнутымі.

Урэшце я зразумеў, што нам трэба вярнуцца ў родную царкву. Зрабіўшы гэта, мы адразу ж зразумелі, што вярнуліся ў волю Божую, хоць і падавалася, што нас будуць лепш прымаць і болей любіць у іншым месцы.

Тады Бог здзівіў мяне: «Джон, Я ніколі не казаў табе сыходзіць з гэтай царквы. Ты сышоў праз крыўду!»

Гэта была наша віна, а не віна нашых сяброў. Яны разумелі нашу роспач і спрабавалі вырашыць тыя самыя пытанні ў сваіх сэрцах. Калі вы сыходзіце з волі Божай, вы не станеце дабраславеннем ці дапамогай для любой царквы. Калі вы не слухаецеся волі Божай, нават добрыя адносіны стануць нацягнутымі. Мы не слухаліся волі Божай.

Пакрыўджаныя людзі рэагуюць на сітуацыю і робяць рэчы, якія падаюцца правільнымі, хоць Бог і не казаў ім гэтага рабіць. Мы пакліканыя не рэагаваць, але дзейнічаць.

Калі мы слухаемся Бога і шукаем Яго, а Ён не адказвае, ці ведаеце вы, што Ён кажа? Магчыма, Ён кажа: «Заставайся там, дзе зараз. Нічога не мяняй».

Часта, калі мы адчуваем ціск, мы шукаем слова ад Бога, якое дасць нам палёгку. Але Бог ставіць нас у вельмі нязручныя

ўмовы, каб загартаваць, ачысціць і ўзмацніць, а не знішчыць!

Праз месяц у мяне была магчымасць сустрэцца з пастарам маёй роднай царквы. Я пакаяўся ў сваім крытыцызме і бунце. Ён ласкава мне прабачыў. Нашы адносіны ўзмацніліся, і ў маё сэрца вярнулася радасць. Я адразу ж пачаў атрымліваць плады пастарскага служэння за кафедрай і застаўся ў царкве на многа гадоў.

## НАСАДЖАНЫЯ КВІТНЕЮЦЬ

У Псальме 92(91):14 Біблія кажа: «*Насаджаныя* ў Доме ГОСПАДА *зеленеюць* на панадворках Бога нашага» (ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ). Звярніце ўвагу: зелянеюць *(у анг. перакл. – квітнеюць), «*насаджаныя ў Доме ГОСПАДА». Што адбываецца з раслінай, якую перасаджваюць кожныя тры тыдні? Як вядома, яе каранёвая сістэма зменшыцца, расліна не будзе квітнець ці разрастацца. Калі вы і далей будзеце яе перасажваць, расліна загіне ад шоку!

Многія людзі ходзяць з царквы ў царкву, з каманды ў каманду, спрабуючы развіваць сваё служэнне. Калі Бог ставіць іх туды, дзе іх не прызнаюць і не натхняюць, яны лёгка крыўдзяцца. Калі яны не згодныя з тым, як штосьці робіцца, то крыўдзяцца і сыходзяць. Яны сыходзяць і вінавацяць кіраўніцтва. Гэтыя людзі не бачаць уласных недахопаў і не разумеюць, што Бог хацеў ачысціць і ўзрасціць іх праз той ціск, з якім яны сутыкнуліся.

Давайце паглядзім на Божыя прыклады раслін і дрэваў. Калі пладовае дрэва садзяць у зямлю, яно сутыкаецца з дажджамі, спёкай і ветрам. Калі б маладое дрэва магло размаўляць, яно б сказала: «Прашу, забярыце мяне адсюль! Пасадзіце мяне туды, дзе няма такой спёкі і моцнага ветру!»

Калі б садоўнік паслухаўся дрэва, ён бы моцна нашкодзіў. Дрэвы вытрымліваюць гарачыню і моцныя дажджы, глыбока ўкараніўшыся ў зямлю. Перашкоды становяцца для іх крыніцай

вялікай стабільнасці. Суровасць навакольных стыхій прымушае іх шукаць іншую крыніцу жыцця. Аднойчы яны прыйдуць туды, дзе нават самая моцная бура не зможа паўплываць на іх здольнасць прыносіць плод.

Некалькі гадоў таму я жыў у Флорыдзе, сталіцы цытрусавых. Большасць жыхароў Флорыды ведаюць: чым халаднейшая зіма, тым саладзейшыя будуць апельсіны. Калі б мы не ўцякалі так хутка ад духоўнага супрацьстаяння, нашы каранёвыя сістэмы мелі б шанец узмацніцца і заглыбіцца, і наш плод быў бы вялікі і салодкі ў вачах Бога, а таксама больш прыемны Яго народу! Мы былі б дарослымі дрэвамі, прыемнымі Госпаду, і нас не выкапалі б праз адсутнасць плоду (Лукі 13:6 — 9). Мы не павінны супрацьстаяць таму, што Бог пасылае для нашага росту.

Псалміст Давід, натхнёны Святым Духам, правёў паралелі паміж крыўдай, законам Божым і нашым духоўным ростам. У першым Псалме ён напісаў:

> Шчасьлівы чалавек,... бо да Закону ГОСПАДА імкненьне ягонае і пра Закон Ягоны будзе разважаць ён днём і ноччу.
>
> —ПСАЛТЫР 1:1 – 2.

Далей, у Псалме 119 (118):165 ён дае нам яшчэ лепей убачыць людзей, якія любяць Божыя законы.

> Вялікі супакой Ты даеш тым, якія любяць Закон Твой, і яны не *спатыкнуцца.*
>
> ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ.

Трэці верш з першага Псалма апісвае лёс такога чалавека.

> І будзе ён як *дрэва*, пасаджанае пры цячэнні водаў, якое прыносіць плод свой у часе сваім, і лістота якога ня вяне, і ўва ўсім, што ён робіць, ён поспех мае.
>
> ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ.

Іншымі словамі, вернік, які прымае рашэнне слухацца Слова Божага сярод непрыемнасцяў, не пакрыўдзіцца. Гэты чалавек будзе як дрэва, карані якога сягаюць глыбока, туды, дзе Дух дае яму сілу і харчаванне. Глыбока ў сваім духу Ён будзе піць з Божай студні. Гэта выгадуе яго да таго часу, калі складанасці стануць каталізатарам для плоду. Алелюя!

Цяпер мы разумеем, як Ісус патлумачыў прыпавесць пра сейбіта.

> Таксама і тыя, што на камяністым месцы пасеяны, пачуўшы слова, адразу з радасцю прыймаюць яго, але ня маюць у сабе кораня, таму *нетрывалыя*; калі надыйдзе прыгнёт ці перасьлед дзеля слова, *адразу ж горшацца.*
>
> — МАРК 4:16 – 17, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ.

Як толькі вы пакідаеце месца, вызначанае Богам, ваша каранёвая сістэма пачынае змяншацца. Наступны раз вам будзе лягчэй вырашыць уцякаць ад складанасцяў, бо вы не закараніліся дастаткова глыбока. У выніку ў вас не застанецца сілы вытрымаць складанасці або пераслед.

Тады вы станеце духоўным валацугам, што блукае з месца на месца і са страхам падазрае, што іншыя кепска з ім абыдуцца. Параненыя і нядольныя прыносіць сапраўдны духоўны плод, вы змагаецеся ў сваім эгаістычным жыцці і харчуецеся рэшткамі пладоў іншых.

Давайце паглядзім на Каіна і Абэля, першых сыноў Адама. Каін прынёс Госпаду ў ахвяру плод сваіх рук з вінаграднiку. Гэта быў вынік цяжкай працы. Каіну трэба было ачысціць зямлю ад камянёў, каранёў і смецця. Потым трэба было яе ўзараць і апрацаваць. Затым пасадзіць, паліваць, угнаіць і абараняць свае плады. Каін уклаў шмат высілкаў у сваё служэнне Богу. Але гэта была не паслухмянасць Божаму шляху, яго ўласная ахвяра, якая сімвалізавала пакланенне Богу сваёй уласнай сілай і здольнасцю, а не праз Божую ласку.

Абэль, з іншага боку, прынёс ахвяру паслухмянасці — найлепшых першародных са свайго статку і іх тлушч. Ён не працаваў так цяжка, як Каін, каб прынесці такую ахвяру, але яна была дарагой для яго. Браты чулі, як іх бацькі спрабавалі прыкрыць сваю галізну фігавымі лістамі, правобразам таго, што яны прыкрывалі грэх сваімі ўласнымі справамі. Але Бог паказаў прыймальную ахвяру, прыкрыўшы Адама і Еву скурамі нявінных жывёлаў. Адам і Ева нічога не ведалі пра гэта недапушчальнае прыкрыццё іх грэху. Але калі Бог паказаў ім Свой шлях, яны ўжо не маглі казаць, што нічога не ведаюць, як і іх дзеці.

Каін спрабаваў атрымаць Божае прыняццё за межамі Божага шляху. Бог адказаў, паказаўшы, што Ён прыме тых, хто адпавядае Яго стандартам ласкі (ахвяра Абэля) і адрыне тое, што ўваходзіць у сферу «пазнання дабра і зла» (рэлігійныя справы Каіна). Потым Ён навучыў Каіна: калі той будзе рабіць дабро, будзе прыняты; але калі не абярэ жыццё, то грэх яго пераможа.

Каін пакрыўдзіўся на Госпада. Замест таго, каб пакаяцца і рабіць правільныя рэчы, дазволіўшы гэтай сітуацыі ўзмацніць яго характар, ён выліў свой гнеў на Абэля, а крыўду — на Бога. Ён забіў Абэля. Бог сказаў Каіну:

> І цяпер пракляты ты ад зямлі, якая адчыніла вусны свае прыняць кроў брата твайго з рукі тваёй. Калі будзеш абрабляць зямлю, яна ня будзе больш даваць табе сілы свае. Выгнанцам і ўцекачом будзеш на зямлі.
>
> —БЫЦЦЁ 4:11 – 12, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ.

Каін наклікаў на сябе Божы суд, тое, чаго ён баяўся больш за ўсё: Бог яго адрынуў. Той самы сродак, якім ён спрабаваў атрымаць пахвалу ад Бога, стаў пракляты праз учынкі Каіна. Праліццё крыві прынесла праклён. Зямля больш не давала яму сваёй сілы. Плод можна было атрымаць толькі праз вялікія высілкі.

Пакрыўджаныя хрысціяне таксама абразаюць сваю

здольнасць прыносіць плод. У прыпавесці пра сейбіта Ісус параўнаў сэрца з глебай. Як поле Каіна не прыносіла плоду, так і пакрыўджанае сэрца не прыносіць плоду, бо атручана горыччу. Пакрыўджаныя людзі могуць перажываць цуды, прароцкія словы, моцныя пропаведзі і ацаленні. Але гэта дары Духа, а не плады. Нас будуць судзіць паводле плода, а не паводле дароў. Дар даецца. Плод узрошчваецца.

Звярніце ўвагу: Бог сказаў, што Каін стане ўцекачом і валацугам у выніку сваіх дзеянняў. У сучасных цэрквах ёсць мноства духоўных уцекачоў і валацугаў. Іх дары спеваў, пропаведзі, прароцтваў не прымаюцца кіраўніцтвам царквы, таму яны сыходзяць. Яны ходзяць па цэрквах без мэты і трымаюць крыўду, шукаючы ідэальную царкву, якая прыме іх дар і дасць ацаленне іх сэрцам.

Яны адчуваюць сябе параненымі і пераследаванымі і адчуваюць сябе сучаснымі Ярэміямі. Ёсць «толькі яны і Бог», а ўсе астатнія – супраць іх. Іх немагчыма навучыць. Гэтыя людзі маюць тое, што я называю комплексам пераследу: «Усе супраць мяне». Яны суцяшаюць сябе тым, што яны – проста пераследаваныя святыя або Божыя прарокі. Яны ўсіх падазраюць. Менавіта так адбылося з Каінам. Паслухайце, што ён кажа:

> І буду я выгнанцам і ўцекачом на зямлі, і *станецца, што кожны, хто сустрэне мяне, заб’е мяне.*
>
> —БЫЦЦЁ 4:14, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ.

Падумайце: у Каіна была параноя, бо яму падавалася, што ўсе палююць на яго! Так здараецца і сёння. Пакрыўджаныя людзі лічаць, што ўсе пераследуюць іх. З такім стаўленнем ім цяжка ўбачыць тыя сферы ў жыцці, якія патрабуюць пераменаў. Яны самаізалююцца і паводзяць сябе так, што гэта выклікае гвалт.

> Свавольны шукае жаданьня [свайго] і кожнай цьвярозай думцы працівіцца.
>
> —ПРЫПАВЕСЦІ 18:1.

Бог стварыў нас не дзеля таго, каб мы жылі ізалявана. Яму падабаецца, калі Яго дзеці клапоцяцца і падтрымліваюць адзін аднаго. Бог не задаволены, калі мы крыўдзімся і шкадуем сябе, робім іншых адказнымі за наша шчасце. Ён хоча, каб мы былі актыўнымі членамі сям'і. Ён хоча, каб крыніца нашага жыцця была ў Ім. Ізаляваны чалавек шукае толькі сваіх мэтаў, а не Божых, не атрымлівае парадаў і рыхтуецца да падману.

Я не кажу пра тыя часы, калі Бог кліча асобных людзей аддзяліцца, каб падрыхтаваць і абнавіць іх. Я маю на ўвазе тых, хто ўвязніў сабе сам. Яны ходзяць з царквы ў царкву, з адносін у адносіны, ізалююцца ў сваім свеце. Яны лічаць, што кожны, хто з імі не згодны, памыляецца і настроены супраць іх асабіста. Яны абараняюць сябе ў ізаляцыі і спакойна пачуваюцца ў кантраляваным асяроддзі, якое самі для сябе стварылі. Яны больш не мусяць супрацьстаяць недахопам свайго характару. Замест супрацьстаяння складанасцям, яны спрабуюць прапусціць выпрабаванне. Развіццё характару, якое адбываецца, калі яны праходзяць канфлікты з іншымі, губляецца, калі зноў пачынаецца цыкл крыўды.

## КРЫЎДА ПЕРАШКАДЖАЕ ВАМ БАЧЫЦЬ НЕДАХОПЫ ВАШАГА ХАРАКТАРУ, ТАМУ ШТО ВЫ ПЕРАКЛАДВАЕЦЕ ВІНУ НА ІНШЫХ.

Мы шмат гадоў трымалі непрабачэнне і крыўды адзін на аднаго. Мы дайшлі да таго, што ў нас засталося вельмі мала сяброў, і я адчувала сябе ізаляванай і нелюбімай, хоць і наведвала выдатную царкву. Потым я прачытала вашу кнігу *«Прынада шатана»*, і ўсё памянялася. Я ўбачыла свае крыўды і непрабачэнне, і з Божай дапамогай атрымала свабоду!

— К. ДЖ., БЕЛФАСТ, ІРЛАНДЫЯ

# 6

# ХАВАЮЧЫСЯ АД РЭАЛЬНАСЦІ

*Якія заўсёды вучацца і ніколі ня могуць дайсці да пазнання праўды.*

**—2 ЦІМАФЕЯ 3:7**

У мяне часта запытваюцца: «Калі можна пакінуць царкву ці служэнне? Наколькі кепска ўсё павіна быць?» Я адказваю: «Хто паслаў вас у вашу цяперашнюю царкву?»

У большасці выпадкаў адказам было: «Бог».

Я адказваю: «Калі вас адправіў Бог, не пакідайце царкву, пакуль гэтага не скажа Бог. Калі Бог маўчыць, часта гэта значыць: “Нічога не мяняй. Нікуды не ідзі. Заставайся там, дзе я цябе паставіў!” Калі Бог скажа вам сысці, вы зробіце гэта ў супакоі, незалежна ад стану служэння».

Бо вы з радасцю выйдзеце, і ў супакоі правядуць вас.
—ІСАЯ 55:12.

Ваш сыход павінен абапірацца не на паводзіны іншых, але на кіраўніцтва Духа. Мы не можам пакідаць служэнне толькі таму, што адбылося нешта кепскае.

Божы план не ўключае ў сябе сыход з крыўдай ці крытыкай. Гэта рэакцыя, а не дзеянне, якое абапіраецца на Яго кіраўніцтва. У Рымлянам 8:14 напісана: «Бо ўсе, якія Духам Божым ведзеныя, ёсьць сыны Божыя». Там не напісана: «Бо ўсе, якія рэагуюць на розныя сітуацыі, ёсць сыны Божыя».

Амаль кожны раз, калі ў Новым Запавеце выкарыстоўваецца слова «сын», у арыгінале мы бачым два грэцкія словы: «*тэкнон*» і «*хьюос*» (*teknon* і *huios*). Добрае азначэнне слова «*teknon*» – «той, хто ёсць сынам праз факт нараджэння».

Калі нарадзіўся мой першы сын, Эдысан, ён быў сынам Джона Бэвіра проста праз тое, што нарадзіўся ад мяне і маёй жонкі. Калі ён знаходзіўся сярод іншых немаўлят, вы не пазналі б, што Эдысан мой сын, проста паглядзеўшы на яго. Калі ў радзільню прыходзілі нашы сваякі і сябры, яны маглі знайсці яго толькі па бірцы з імем на ложачку. Ён нічым не адрозніваўся ад іншых. Эдысана можна было назваць «*teknon*» Джона і Лізы Бэвіраў.

У Рымлянам 8:15 – 16 мы знаходзім гэта слова «*teknon*». Там гаворыцца: праз тое, што мы атрымалі духа ўсынаўлення, «гэты Дух сведчыць духу нашаму, што мы — дзеці [*teknon*] Божыя». Калі чалавек прымае Ісуса Хрыста як Госпада, ён – дзіця Божае праз факт нараджэння звыш (гл. Яна 1:12).

Другое грэцкае слова, якое ў Новым Запавеце азначае «сын», – гэта слова «*хьюос*» (*huios*). Яно шмат разоў выкарыстоўваецца ў Новым Запавеце для апісання таго, «каго можна пазнаць як сына, бо ён праяўляе характар ці ўласцівасці сваіх бацькоў».

Калі мой сын Эдысан падрастаў, ён пачаў выглядаць і паводзіць сябе як яго бацька. Калі Эдысану было шэсць, мы з Лізай паехалі ў падарожжа і пакінулі яго з маімі бацькамі. Мая

маці сказала Лізе, што Эдысан надзвычай падобны на мяне: яго характар нагадваў мой у такім жа ўзросце. Падрастаючы, сын станавіўся ўсё больш падобным на мяне. Цяпер яго пазнаюць як сына Джона Бэвіра не толькі праз факт яго нараджэння, але і праз рысы характару і асобу, якая нагадвае яго тату.

Калі сказаць проста, грэцкае слова *«тэкнон»* значыць «дзеці або малыя сыны», а грэцкае слова *«хьюос*» найчасцей выкарыстоўваецца для апісання «дарослых сыноў».

Зноў звернемся да Рымлянам 8:14, дзе напісана: «Бо ўсе, якія Духам Божым ведзеныя, ёсьць сыны [*хьюос*] Божыя». Мы выразна бачым, што ведзеныя Духам Божым і ёсць дарослымі сынамі. Малыя, няспелыя хрысціяне наўрад ці будуць ведзеныя Духам Божым. Найчасцей яны эмацыйна або інтэлектуальна рэагуюць на абставіны, з якімі сутыкаюцца. Яны яшчэ не навучыліся дзейнічаць толькі паводле таго, як іх вядзе Дух Божы.

Эдысан расце і яго характар развіваецца. Чым больш дарослым ён становіцца, тым большую адказнасць я даверу яму. Будзе няправільна, калі ён застанецца няспелым. Бог не хоча, каб мы заставаліся дзецьмі.

Характар майго сына Эдысана ўзрастаў у тым ліку і праз складаныя сітуацыі. Калі ён пайшоў у школу, яго аднакласнікі дражнілі яго. Я чуў пра тое, што дзеці рабілі і казалі майму сыну, і я хацеў пайсці ў школу і вырашыць гэта пытанне. Але я ведаў, што гэта было б няправільна. Маё ўмяшальніцтва перашкодзіла б Эдысану ўзрастаць.

Таму мы з жонкай размаўлялі з ім дома, рыхтуючы да канфліктаў у школе. Праз паслухмянасць нашым парадам у час канфліктаў ён узмацніўся ў характары. Нешта падобнае з намі робіць Бог. У Бібліі напісана: «Хоць Ён [Ісус] — Сын [*Хьюос*], але *навучыўся паслухмянасьці* праз тое, што *перацярпеў»* (Гебр. 5:8, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ).

Фізічны рост – гэта справа часу. Ніводнае двухгадовае дзіця не бывае ростам метр восемдзесят. Інтэлектуальны рост –

гэта справа навучання. Духоўны рост – гэта справа ні часу, ні навучання, але паслухмянасці. Паслухаем, што кажа Пётр:

> Дык як Хрыстос цярпеў за нас целам, і вы ўзбройцеся такой думкаю, *што той, хто церпіць целам, перастае грашыць.*
>
> —1 ПЯТРА 4:1, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ.

Чалавек, які перастае грашыць, – дасканала паслухмянае Божае дзіця. Ён стаў дарослым. Ён абірае Божыя шляхі, а не свае. Гэтаксама як Ісус навучыўся паслухмянасці праз тое, што пеpажыў, мы вучымся паслухмянасці праз нашы складанасці. Калі мы слухаемся Божага Слова, якое прамаўляе Святы Дух, мы расцём і сталеем у часы канфлікту і пакутаў. Ключ – паслухмянасць, а не наша веданне Пісання.

Цяпер мы разумеем адну прычыну таго, чаму ў царкве ёсць людзі, якія з’яўляюцца  хрысціянамі ўжо дваццаць гадоў, цытуюць вершы і раздзелы Бібліі, яны чулі тысячы пропаведзяў, прачыталі шмат кніг, але па–ранейшаму носяць духоўныя падгузнікі. Сустракаючыся са складанымі сітуацыямі, яны імкнуцца абараніць сябе па–свойму, замест таго, каб шукаць кіраўніцтва Божага Духа. Яны «заўсёды вучацца і ніколі ня могуць дайсьці да пазнаньня праўды» (2 Цім. 3:7). Яны ніколі не даходзяць да пазнання праўды, бо не выкарыстоўваюць яе.

Калі мы плануем расці і сталець, неабходна дазволіць праўдзе дзейнічаць у нашым жыцці так, як яна хоча. Недастаткова згаджацца на словах, не слухаючыся насамрэч. Нават калі мы працягваем вучыцца, мы не сталеем праз непаслухмянасць.

## САМАЗАХАВАННЕ

Крыўда – распаўсюджаная нагода самазахавання праз непаслухмянасць. Калі мы трымаем крыўду, мы маем фальшывае пачуццё самаабароны. Яно не дае вам бачыць недахопы свайго характару, бо віна перакладываецца на

іншага. Вам не трэба бачыць сваю ролю, няспеласць або грэх, бо вы бачыце толькі недахопы таго, хто вас пакрыўдзіў. Таму Бог спрабуе загартаваць ваш характар праз гэта супрацьстаянне. Пакрыўджаны чалавек будзе пазбягаць крыніцы крыўды і ўрэшце ўцячэ, стаўшы духоўным валацугай.

Нядаўна знаёмая расказала мне пра сяброўку, якая сышла з адной царквы і стала наведваць іншую. Яна запрасіла новага пастара на вячэру. Падчас размовы пастар спытаўся, чаму яна сышла з папярэдняй царквы. Гаспадыня адказала, што там былі праблемы ў кіраўніцтве.

Пастар выслухаў жанчыну і паспрабаваў суцешыць. З досведу я ведаю, што пастару лепш было б натхніць гэтую жанчыну з дапамогай Божага Слова справіцца са сваім болем і крытычным стаўленнем. Калі неабходна, ён мог бы прапанаваць ёй вярнуцца ў папярэднюю царкву, пакуль Бог не дасць ёй сысці адтуль у супакоі.

Калі Бог адпускае вас у супакоі, у вас не будзе патрэбы апраўдваць свой сыход перад іншымі. Вы не будзеце адчуваць патрэбы судзіць або крытычна дэманстраваць праблемы папярэдняй царквы. Я ведаў, што пройдзе зусім троху часу – і жанчына адрэагуе на новага пастара і кіраўніцтва гэтаксама, як і раней. Калі мы трымаем у сэрцы крыўду, мы глядзім на ўсё ў жыцці праз яе.

Да гэтай сітуацыі пасуе старая прыпавесць. У тыя дні, калі перасяленцы пераязджалі на Захад, адзін мудры чалавек стаяў на ўзгорку побач з новым горадам. Перасяленцы, што ехалі з усходу, сустракалі яго самым першым. Яны прагна запытваліся, якімі былі жыхары таго гораду.

У адказ ён задаваў адно пытанне: «Якімі былі жыхары таго гораду, дзе вы жылі раней?» Некаторыя адказвалі: «Той горад быў жахлівым. Людзі шмат пляткарылі і крыўдзілі невінаватых. Там было поўна злодзеяў і падманшчыкаў».

Мудры чалавек адказваў: «Гэты горад такі самы, як і той, што вы пакінулі». Людзі дзякавалі мудрацу, што выратаваў ад праблем, ад якіх яны толькі што ўцяклі, і ехалі далей.

Потым прыязджала новая група перасяленцаў і задавала тое ж пытанне: «Які гэты горад?»

Мудры чалавек зноў запытваўся: «Якімі былі жыхары таго гораду, дзе вы жылі раней?»

Яны адказвалі: «Ён быў выдатным! У нас былі цудоўныя сябры. Усе стараліся дапамагаць адзін аднаму. Не было ніякіх цяжкасцяў, бо ўсе клапаціліся адзін пра аднаго. Калі ў кагосьці былі складанасці, увесь горад збіраўся, каб дапамагчы. Нам не хацелася прымаць рашэнне пра ад’езд, але мы вырашылі пракласці шлях для наступных пакаленняў на захадзе».

Мудрэц казаў ім тое самае, што і ранейшай групе: «Гэты горад такі самы, як і той, што вы пакінулі».

Новая група радасна адказвала: «Давайце паселімся тут!»

Іх стаўленне да мінулых адносін было падыходам і апорай для будучых. Вы пачняце служэнне ў новай царкве ці свае новыя адносіны так, як вы сышлі з мінулай царквы ці скончылі папярэднія адносіны. У Яна 20:23 Ісус кажа: «Каму адпусьціце грахі, таму будуць адпушчаны, на кім затрымаеце, на тым будуць затрыманыя».

Мы захоўваем грахі іншых людзей, калі трымаем крыўду і горыч. Калі мы пакідаем царкву або адносіны ў крыўдзе і горычы, мы ўступім у новыя адносіны ці царкву з такім самым стаўленнем. У такім выпадку нам будзе лягчэй пакінуць новыя адносіны, калі з’явяцца праблемы. Мы займаемся не толькі тым болем, які мае месца ў новых адносінах, але і тым, што баліць з нашых мінулых адносін.

Паводле статыстыкі, 60 — 65 % разведзеных людзей зноў разводзяцца пасля паўторнага шлюбу. Тое, як заканчваецца першы шлюб чалавека, вызначае шлях у другім шлюбе. Непрабачэнне адносна першага сужонка перашкаджае будучыні з новым сужонкам. Вінавацячы іншага, яны не бачаць сваёй віны ў разводзе ці ў сваіх недахопах. Пагаршае сітуацыю і тое, што да ўсяго дадаецца страх быць параненым.

Гэты прынцып не абмяжоўваецца толькі шлюбам і разводам,

але тычыцца ўсіх адносін. Чалавек, які раней працаваў на іншага служыцеля, прыйшоў, каб служыць разам з намі. Яго папярэдні лідар зрабіў яму балюча, але прайшоў час, і я адчуваў, што Госпад накіроўваў мяне запрасіць гэтага чалавека далучыцца да нас. Я быў упэўнены, што ён ужо перамог крыўду.

Я пазваніў яго былому наймальніку і падзяліўся планамі. Той падтрымаў мяне, палічыўшы рашэнне добрым, бо ведаў, што я добра ставіўся да іх абодвух. Ён верыў, што ацаленне можна было дасягнуць, пакуль ён працуе з намі. Я сказаў абодвум, што малюся за аднаўленне і ацаленне іх адносін.

Калі гэты чалавек далучыўся да нашага служэння, праблемы паўсталі амаль адразу. Я размаўляў з ім, але палёгка была толькі часовай. Падавалася, ён не мог выкінуць з галавы былыя адносіны. Яны вярталіся і праследавалі яго. Ён нават абвінаваціў мяне ў тым самым, што і свайго мінулага лідара.

Я быў усхваляваны, бо дабрабыт гэтага чалавека быў для мяне важнейшым за тое, што ён мог зрабіць для мяне ў служэнні. Я зрабіў для яго выключэнне, якое ніколі не зрабіў бы для іншага работніка, бо хацеў, каб ён атрымаў ацаленне.

Ужо праз два месяцы ён сышоў, бо адчуваў сябе нібы ў пастцы, як у ранейшай сітуацыі. На развітанне ён сказаў: «Джон, я больш ніколі не буду працаваць у служэнні».

Я дабраславіў яго і развітаўся. Мы любім яго і яго жонку. Сумна, што ў яго было моцнае пакліканне ў служэнні, якое ён пакінуў, хоць гэта і не значыць, што ён не дасягне поспеху ў іншых сферах. Я адчуваў неспакой пасля яго сыходу, таму я шукаў Госпада: «Чаму ён сышоў так хутка, калі мы абодва лічылі гэта месца правільным для яго?»

Праз некалькі тыдняў Госпад адказаў мне на гэта пытанне праз мудрага пастара–сябра: «Бог часта дазваляе людзям уцякаць з розных сітуацый, праз якія Ён хоча іх правесці, калі ў сэрцы яны хочуць уцячы з іх».

Ён нагадаў мне гісторыю Іллі, які ўцякаў ад Езабэлі (гл. 1

Валадароў 18 – 19). Ілля толькі што забіў пракрокаў Баала і Астарты. Гэта былі людзі, што вялі людзей да ідалапаклонства і нават елі за сталом Езабэлі. Калі Езабэль пачула пра гэта, яна пагражала забіць Іллю ў бліжэйшыя суткі.

Бог хацеў, каб Ілля супрацьстаў ёй, але замест гэтага той уцёк. Ён быў настолькі напалоханы, што маліўся, каб памерці. Ілля быў няздольны выканаць задачу. Бог паслаў анёла карміць яго і дазволіў яму ўцячы на сорак дзён дарогі да гары Харэў.

Калі прарок прыйшоў туды, перш за ўсё Бог спытаў: «Што ты робіш тут, Ілля?»

Здавалася, дзіўнае пытанне. Госпад даў яму ежу на дарогу і дазволіў пайсці, толькі каб запытацца ў канцы падарожжа: «Што ты робіш тут?» Бог ведаў, што Ілля хацеў уцячы са складанай сітуацыі. Таму Ён дазволіў гэта, хоць з пытання і было відавочна, што Божы план быў іншым.

Потым Ён сказаў Іллю: «Ідзі і вярніся ў Дамаск шляхам сваім праз пустыню. І прыйдзеш, і памажаш… Егу, сына Німшы,… на валадара Ізраіля, а Элісэя, сына Шафата, з Абэль–Мэхолы, памажаш на прарока замест сябе» (1 Валадароў 19:15 – 16). Гэтая злая царыца і яе бязбожная сістэма былі знішчаны ў час служэння Элісэя і Егу (2 Вал. 9 – 10). Ілля завяршыў гэтую задачу не сам, але праз пераемнікаў, якіх Бог сказаў памазаць.

Пастар сказаў мне: «Калі мы настроены не сутыкацца са складанасцямі, Бог дазволіць гэта нам, нават калі гэта не ёсць Яго дасканалай воляй».

Пазней я прыгадаў урывак з Лікаў 22, які служыць ілюстрацыяй гэтай ідэі. Білеам хацеў праклясці Ізраіля, бо за гэта ён мог атрымаць вялікую ўзнагароду. У першы раз ён запытаўся ў Госпада, ці можна пайсці, і Бог паказаў, што Яго воля была ў адваротным. Калі князі Маава вярнуліся з грашыма і падарункамі, Білеам зноў пайшоў запытвацца ў Бога. Смешна думаць, што Бог памяняе Сваё рашэнне, таму што Білеаму прапанавалі больш грошай і дароў. Але гэтым разам Бог сказаў яму пайсці з князямі.

Дык чаму Бог памяняў Сваё рашэнне? Адказ у тым, што Бог яго *не* памяняў. Білеам так хацеў пайсці, што Бог гэта дазволіў. Таму і ўзгарэўся Яго гнеў на Білеама, калі той з імі пайшоў.

Мы можам надакучваць Богу адносна чагосьці, пра што Ён ужо адкрыў нам Сваю волю. Тады Ён дазволіць нам зрабіць тое, што мы хочам, нават калі гэта пярэчыць Яго ранейшаму плану. Нават калі гэта не найлепшы варыянт для нас.

Божы план часта прымушае нас сутыкнуцца з болем і стаўленнем, якія нам не падабаюцца. Але мы хочам уцячы ад таго самага, што прыносіць сілу ў наша жыццё. Адмова справіцца з крыўдай не вызваліць нас ад праблемы. Гэта дасць нам толькі часовую палёгку. Корань праблемы застаецца некранутым.

Мой досвед з маладым чалавекам, якога я ўзяў на працу, навучыў мяне адной рэчы датычна крыўдаў і адносін. Немагчыма мець здаровыя адносіны з чалавекам, які сышоў з папярэдніх адносін пакрыўджаным і з горыччу. Неабходнае ацаленне. Хоць ён і паўтараў, што прабачыў былога лідара, ён нічога не забыў.

Любоў забывае крыўды, і ў будучыні з’яўляецца надзея. Калі мы сапраўды пераадолелі крыўду, мы шчыра імкнёмся прымірыцца. Такая магчымасць не надарыцца адразу, але мы будзем шукаць спосабы аднавіць адносіны.

Пазней адзін мудры сябар нагадаў старую прыказку: хто апекся на малацэ, будзе дзьмуць на ваду. Колькі людзей баяцца вады, якая можа прынесці ім палёгку, бо аднойчы яны апякліся на малацэ і не могуць прабачыць?

Ісус жадае ацаліць нашыя раны. Але мы часта не дазваляем Яму так зрабіць, бо гэта не самы просты шлях. Гэта шлях упакоранасці і адмаўлення ад эгаізму. Гэты шлях вядзе да ацалення і духоўнай спеласці. Гэта рашэнне паставіць дабрабыт іншага вышэй за ўласны, нават калі чалавек вельмі засмуціў вас.

Ганарлівасць не можа ісці такім шляхам. Толькі тыя, хто хоча міру коштам таго, каб быць адрынутым. Гэта вядзе да прыніжэння. Гэта вядзе да жыцця.

## У ПРЫСУТНАСЦІ ЛЮДЗЕЙ МЫ НЕ МОЖАМ НАВУЧЫЦЦА ТАМУ, ЧАМУ ВУЧЫМСЯ Ў ПРЫСУТНАСЦІ БОГА.

Я прачытаў кнігу «*Прынада шатана*». З таго часу мой погляд на Божае Слова змяніўся. Я перажыў боль, і, калі б не гэтая кніга, я б так і застаўся з гэтымі перажываннямі на ўсё жыццё.

— Ф. Н., МАЛАЙЗІЯ

7

# НАДЗЕЙНЫ ПАДМУРАК

*Дзеля гэтага так кажа Госпад ГОСПАД: «Вось, Я кладу на Сыёне камень, камень выпрабаваны, вуглавы, каштоўны, моцна ўгрунтаваны. Хто верыць у Яго, ня будзе ўцякаць».*

**—ІСАЯ 28:16**

«Хто верыць у Яго, ня будзе ўцякаць». Той, хто дзейнічае паспешліва, – неўстойлівы чалавек, бо яго ўчынкі не маюць належнага падмурку. Пераслед ці выпрабаванні лёгка пахіснуць такого чалавека. Напрыклад, паглядзім, што адбылося з Сымонам Пятром.

Ісус прыйшоў у Цэзарэю Філіпаву і спытаўся ў Сваіх вучняў: «Кім людзі называюць Мяне, Сына Чалавечага?» (Мцв. 16:13)

Некалькі вучняў ахвотна падзяліліся тым, што думалі людзі пра Ісуса. Ісус пачакаў, пакуль яны скончылі, потым зірнуў на іх і запытаўся наўпрост: «А вы кім Мяне называеце?» (верш 15)

Я ўпэўнены, што вучні выглядалі збянтэжанымі і спалоханымі, пакуль разважалі пра Яго пытанне, згубіўшы дар мовы. Раптам тыя, што так імкнуліся выказацца і агучыць меркаванне іншых, змоўклі. Магчыма, яны ніколі не задавалі сабе гэтае пытанне. Як бы ні было, цяпер яны зразумелі, што ў іх не было адказу.

Ісус зрабіў тое, што Ён так цудоўна ўмее. Ён закрануў сэрцы Сваім пытаннем. Ён прывёў іх да сапраўднага разумення таго, што яны ведалі, а што – не. Яны жылі на разважаннях іншых, замест таго, каб самім вырашыць, кім быў Ісус. Яны не задавалі сабе гэта пытанне.

Сымон, якога Ісус назваў Пятром, быў адзіным з вучняў, хто змог адказаць. Ён выпаліў: «Ты – Хрыстос, Сын Бога Жывога» (Мцв. 16:16). І, адказваючы, Ісус сказаў яму: «Шчасьлівы ты, Сымон, сын Ёны, бо ня цела і кроў адкрылі табе гэтае, але Айцец Мой, Які ў небе» (верш 17).

Ісус тлумачыў Сымону Пятру крыніцу такога адкрыцця. Сымон Пётр даведаўся гэта не праз меркаванні іншых ці праз тое, чаму яго навучылі, але праз тое, што Бог адкрыў яму.

Сымон Пётр прагнуў ведаць Божыя таямніцы. Ён задаваў больш за ўсіх пытанняў. Менавіта ён хадзіў па вадзе, у той час як іншыя адзінаццаць глядзелі. Пётр не задавальняўся чужымі меркаваннямі, а хацеў чуць усё наўпрост з вуснаў Божых. Ён атрымаў гэтае разуменне Ісуса не праз пачуцці. Гэта быў дар, які прасвятліў сэрца ў адказ на яго прагненне. Многія бачылі тое, што бачыў Сымон Пётр, але іх сэрцы не так прагнулі ведаць волю Божую, як сэрца Пятра.

У Першым Яна 2:27 напісана: «І памазаньне, якое вы атрымалі ад Яго, у вас застаецца, і вы ня маеце патрэбы, каб хто вучыў вас; але як гэтае самае памазаньне вучыць вас пра ўсё, і яно праўдзівае і не манлівае, дык, як яно навучыла вас.. »

Гэта памазанне вучыла Сымона Пятра. Ён чуў тое, што казалі іншыя, а потым зірнуў унутр, каб убачыць тое, што адкрыў яму Бог. Калі вы атрымліваеце адкрыццё ад Бога, ніхто не можа вас пахіснуць. Калі Бог адкрывае вам нешта, не важна, што кажа ўвесь свет. Ён не можа змяніць ваша сэрца.

Тады Ісус сказаў Сымону Пятру і іншым вучням: «На гэтай скале [пазнанні, дадзеным Богам] Я збудую Царкву Маю, і брамы пекла не перамогуць яе» (Мцв. 16:18). Таму мы выразна бачым, што адкрыццё Слова Божага ёсць сапраўдным падмуркам; у гэтым выпадку такім падмуркам стала разуменне Пятра, што Ісус – Сын Божы.

## СЛОВА БОЖАЕ, АСВЕТЛЕНАЕ ДУХАМ

Калі я прапаведую, то часта кажу цэрквам і асобным людзям слухаць голас Божы праз мяне. Так часта мы запісваем толькі сказаныя словы. Гэта дае разуменне Пісання і яго тлумачэнне – веды для розуму.

Калі мы маем толькі веды розуму, могуць здарыцца дзве рэчы: па–першае, мы лёгка ўцягваемся ў гульню і эмацыйныя ўчынкі або, па–другое, робімся звязанымі сваім інтэлектам. Але гэта не той трывалы падмурак, на якім Ісус будуе Сваю царкву. Ён сказаў, што збудуе яе на адкрыцці Слова, а не проста на завучаных вершах.

Калі мы слухаем памазанага служыцеля або чытаем кнігу, мы мусім шукаць словы або фразы, якія нібыта ўзрываюцца ў нашым духу. Гэта Слова Божае, якое адкрываецца нам. Яно нясе святло і духоўнае разуменне. Як казаў аўтар Псальмаў: «Адкрыцьцё словаў Тваіх асьвятляе, дае разуменьне неразумным» (Пс. 119 (118):130). Адкрыццё Яго Слова ў нашым сэрцы, не ў розуме, асвятляе і дае разуменне.

Часта служыцель можа казаць пра адно, але Бог у маім сэрцы асвятляе нешта зусім іншае. З другога боку, Бог можа

памазаць дакладныя словы служыцеля, і яны «выбухнуць» ува мне. У кожным выпадку гэта Слова Божае, адкрытае мне. Гэта дапамагае нам з простых (пазбаўленых разумення) стаць дарослымі, сталымі (напоўненымі разуменнем). Гэта Слова, асветленае Духам у нашых сэрцах, і ёсць той падмурак, на якім Ісус пабудаваў Сваю царкву.

Ісус параўнаў адкрыццё Слова Божага са скалой. Скала – сімвал стабільнасці і моцы. Мы памятаем прыпавесць пра два дамы, адзін з якіх збудаваны на скале, а другі – на пяску. Калі складанасці – пераслед, пакуты і хваробы – наляцелі на гэтыя дамы, збудаваны на скале разбурыўся, а збудаваны на скале выстаяў.

Некаторыя рэчы, якія нам трэба пачуць ад Бога, нельга знайсці ў Бібліі. Напрыклад, з кім нам стварыць сям’ю? Дзе нам працаваць? У якую царкву нам хадзіць? І гэта няпоўны спіс. Для гэтых рашэнняў нам таксама патрэбнае адкрыццё Слова Божага. Інакш нашы рашэнні стаяць на нетрывалым падмурку.

Тое, што Бог адкрывае Духам, нельга ад нас забраць. Яно павінна быць падмуркам усяго, што мы робім, інакш мы лёгка спакушаемся выпрабаваннямі і пакутамі, якія асляпляюць нас.

Узгадаем, што Ісус казаў пра Слова, якое чуюць і прымаюць з радасцю, але яно не ўкараняецца ў нашых сэрцах. Яно было прынята з радасцю ў розуме і эмоцыях.

> Таксама і тыя, што на камяністым месцы пасеяны, пачуўшы слова, адразу з радасьцю прыймаюць яго, але *ня маюць у сабе кораня*, таму нетрывалыя; калі надыйдзе прыгнёт ці пераслед дзеля слова, адразу ж *горшацца*.
>
> —МАРК 4:16–17, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Словы «корань» і «падмурак» можна лёгка памяняць месцамі, бо яны значаць тое, што падтрымлівае і дае сілу расліне або канструкцыі. Не ўстойлівы чалавек або той, хто не ўкаранёны ў адкрыцці Слова Божага, – першы ў чарзе, каб быць знесеным штормам крыўды.

Колькі вакол людзей, падобных на вучняў Ісуса? Яны жывуць паводле таго, што чулі ад іншых. Меркаванні і сцверджанні іншых лічацца праўдай без парады ці сведчання Духа. Мы можам жыць і абвяшчаць толькі тое, што Бог адкрыў нам. Вось на чым Ісус будуе Сваю царкву.

Аднойчы ў маім офісе была сакратарка, якая сустракалася з маладым чалавекам, што таксама працаваў у царкве. Яны хутка збліжаліся. Усе бачылі, што гэтыя адносіны павінны былі скончыцца шлюбам. Яны ўжо сур’ёзна гэта абмяркоўвалі.

Аднойчы ў нядзелю вечарам старэйшы пастар паклікаў іх да сябе і сказаў: «Так кажа Госпад: вы пажэніцеся».

Наступным ранкам мая сакратарка проста лётала ад шчасця. Яна спыталася, ці абвянчаю я іх, і я адказаў, што гэта будзе для мяне гонарам. Я прызначыў ім сустрэчу для кансультацыі.

Але я пачуваўся няўтульна. Калі маладыя людзі прыйшлі ў мой офіс, мой дух быў устурбаваны. Я спытаўся ў сваёй сакратаркі, ці была яна ўпэўненая, што Бог прызначыў гэтага маладога чалавека для яе. Яна з энтузіязмам адказала: «Так».

Тады я паглядзеў на яго і спытаўся: «Ці верыце вы, што воля Божая для вас – ажаніцца з гэтай жанчынай?» Ён паглядзеў на мяне, раскрыўшы ад здзіўлення рот, на імгненне апусціў галаву і пахітаў, як быццам кажучы: «Не, я не ўпэўнены».

Я зірнуў на іх і звярнуўся да маладога чалавка. «Я не абвянчаю вас. Мне не важна, хто прарочыў вам ці што вам сказалі. Мне не важна, як шмат людзей вам казалі: “З вас выйдзе цудоўная пара”. Калі Бог не адкрыў вам Сваю волю, вам не варта ўступаць у гэты шлюб.

Калі вы ажэніцеся, не ведаючы, што гэта дасканалая воля Божая для вас, – працягваў я, – то калі прыйдзе бура (а яна прыйдзе!), у вас будуць сумневы: “А што, калі б я ажаніўся з іншай дзяўчынай? Ці былі б у мяне гэтыя праблемы? Я мусіў пераканацца, што гэта была воля Божая. Я адчуваю сябе ў пастцы”.

Калі вы стоміцеся ад гэтага, то ўжо не зможаце супрацьстаяць тым бедам, якія могуць прыходзіць у шлюбе. Вашы думкі будуць дваіцца і вы не будзеце мець цвёрдасці ва ўсіх сваіх шляхах».

Я развітаўся з імі і сказаў, што сэнсу ў новых сустрэчах няма. Малады чалавек адчуваў палёгку. А дзяўчына была вельмі засмучаная. Наступны тыдзень наш офіс быў вельмі няўтульным месцам. Але я ведаў, што прыняў правільнае рашэнне. Гэта быў час выпрабавання для яе. Калі Бог сапраўды прамовіў да яе, што гэты чалавек мусіў стаць яе мужам, яна мусіла давяраць Госпаду ў тым, што Ён адкрые гэта яму, і зможа не крыўдзіцца на мяне і Бога. Я сказаў ёй не ўмешвацца і дазволіць яму пачуць Бога. Яна так і зрабіла.

Прайшлі тры тыдні, і яны папрасілі пра іншую сустрэчу. Я адчуў радасць. У гэты раз, калі яны прыйшлі ў мой офіс, ён зірнуў на мяне іншымі вачыма і сказаў: «Я не маю сумніваў у тым, што гэта тая самая жанчына, якую Бог хоча бачыць маёй жонкай!» Яны ажаніліся праз сем месяцаў.

Калі вы ведаеце, што Бог прывёў вас у адносіны ці ў царкву, ворагу будзе значна складаней вывесці вас адтуль. Вы абапіраецеся на адкрыццё Слова Божага і будзеце спраўляцца з канфліктамі, нават калі гэта падаецца немагчымым.

## НЯМА ІНШЫХ ВАРЫЯНТАЎ

Першыя пяць гадоў нашага з жонкай шлюбу былі вельмі складанымі. Мы ранілі адзін аднаго так моцна, што, падавалася, немагчыма вярнуць адносіны любові, якія паміж намі былі раней.

Нас трымала разам толькі адно: мы ведалі, што Бог хацеў нашага шлюбу. Таму мы не разглядалі для сябе развод. Адзіным варыянтам для нас было верыць, што Ён аздаровіць і зменіць нас. Мы абое прынялі рашэнне рухацца ў гэтым, незалежна ад таго, наколькі балюча гэта будзе.

Калі я хацеў здацца, я ўзгадваў абяцанні, якія Бог даваў мне

адносна нашага шлюбу. Я не быў гатовы здацца ў тым, што Бог падрыхтаваў для нашай сям'і.

Адным з абяцанняў, якія Бог даў нам, было тое, што мы з жонкай будзем служыць разам. У той час, калі Ён даў нам гэта абяцанне, мне падавалася, што *я магу гэта бачыць. Яго рука была на нас для служэння.*

Сярод усіх нашых сямейных праблем я больш не мог бачыць абяцанне так выразна. Але я адмаўляўся яго адпускаць. Натуральная надзея пакінула нас праз ганарлівасць і пыху, якія ўвайшлі ў наш шлюб. Але ў маім сэрцы заставалася звышнатуральнае зерне надзеі. Гэта абяцанне было якарам ці падмуркам у тыя часы, калі гэта было мне неабходна.

Як выявілася, Бог не толькі ацаліў нашы адносіны, але і зрабіў іх нашмат мацнейшымі, чым раней. Мы шмат чаму навучыліся праз тыя канфлікты, за якія мы прабачалі адно аднаму. Цяпер мы служым разам. Я лічу жонку не толькі сваёй каханай і найлепшай сяброўкай, але і служыцелем, на якога я магу цалкам разлічваць. Я давяраю ёй больш, чым камусьці яшчэ.

Пасля складаных першых пяці гадоў я зразумеў, што Бог бачыў недахопы ў жыцці кожнага з нас, і нашы адносіны выяўлялі іх.

Я быў у захапленні ад мудрасці Таго, хто злучыў нас як мужа і жонку. Да таго, як я сустрэў Лізу, я старанна маліўся за жанчыну, з якой аднойчы ажанюся. Гэтае рашэнне было другім па важнасці ў маім жыцці пасля паслухмянасці Евангеллю. Я маліўся і чакаў, пакуль Бог пакажа мне маю будучую жонку, і таму думаў, што ў мяне ў шлюбе не будзе такіх праблем, як у іншых. Вох, як я памыляўся!

Бог абраў для мяне жонку, якую толькі можна было пажадаць. Але таксама яна дапамагла мне ўбачыць схаваную ў маім сэрцы эгаістычную няспеласць. І гэтай няспеласці было шмат! Спроба пазбегнуць канфлікту праз развод або справа абвінаваціць ва ўсім Лізу толькі б пахавала маю няспеласць пад яшчэ адным

слоем штучнай абароны пад назвай «крыўда». Веданне Божага Слова адносна шлюбу дапамагло мне не збегчы.

Хачу крыху адхіліцца ад асноўнай тэмы гэтага раздзелу. Некаторыя з маіх чытачоў могуць думаць: «*Я не быў збаўлены, калі стварыў сям'ю*».

Вам Бог кажа: «Тым жа, што пажаніліся, ня я загадваю, але Госпад: жонцы — не разлучацца з мужам, а калі разлучыцца, няхай застаецца бяз мужа ці няхай пагодзіцца з мужам; і мужу — не пакідаць жонкі... . Кожны ў якім [стане] пакліканы, браты, у такім няхай застаецца перад Богам» (1 Кар. 7:10 – 11, 24).

Няхай гэта слова пра запавет шлюбу ўмацуецца ў вашым сэрцы, каб пастка крыўды не змагла пахіснуць вас у прынятым рашэнні. Таксама шукайце слова ад Госпада адносна вашага шлюбу.

Магчыма, нават некаторыя вернікі стварылі сям'ю не адпаведна Божай волі. Каб увайсці ў Божае дабраславенне для вашай сям'і, вы мусіце пакаяцца ў тым, што не шукалі Яго парады, ствараючы сям'ю, і Ён прабачыць вам. Запомніце, што грэх немагчыма выправіць іншым грэхам. Разрыў запавету шлюбу праз крыўду не стане адказам на праблему. Потым прасіце ў Госпада слова для вашага шлюбу.

## НАДЗЕЙНАЯ СКАЛА

Адкрытае Божае Слова – надзейная скала, на якой мы павінны будаваць сваё жыццё і служэнне. Многія людзі расказвалі мне пра шматлікія цэрквы ці служэнні, да якіх яны належалі на працягу кароткага часу. Мне сумна, калі я бачу, што іх вядуць выпрабаванні, а не Божыя загады. Яны красамоўна кажуць пра тое, як усё няправільна, як кепска абышліся з імі ды з іншымі. Яны адчуваюць, што іх рашэнні апраўданыя. Але іх разважанні – толькі яшчэ адзін слой падману, які не дазваляе ўбачыць крыўду і недахопы ўласных характараў.

Свае цяперашнія адносіны са служэннямі і цэрквамі яны апісваюць як «часовыя» або «на дадзены момант Бог змясціў мяне сюды». Я нават чуў, як адзін чалавек сказаў: «Гэтай царкве мяне далі ўзаймы». Яны кажуць так, каб мець запасны шлях адыходу, калі сітуацыя стане складанай. Яны не маюць падмурка ў новых месцах, куды трапляюць: шторм можа лёгка перанесці іх у наступны порт.

## КУДЫ НАМ ІСЦІ?

Вяртаючыся да прыклада, калі Ісус папрасіў вучняў сказаць, кім яны лічаць Яго, мы бачым стабільнасць, якая з'яўляецца, калі вы ведаеце адкрытую волю Божую. Паглядзім на Сымона Пятра.

Калі Сымон сказаў тое, што Айцец адкрыў яму ў сэрцы, Ісус адказаў: «І Я кажу табе: Ты — скала, і на гэтай скале Я збудую Царкву Маю, і брамы пекла не перамогуць яе» (Мцв. 16:18).

Ісус памяняў імя Сымона, назваўшы яго Пятром. Гэта важна, бо імя *«Сымон»* значыць «чуць». Імя *«Пётр»* (грэчаскае слова *petros*) значыць «камень». Пачуўшы ў сэрцы адкрытае Божае Слова, ён стаў каменем. Дом, збудаваны з камянёў на надзейным падмурку скалы, вытрымае буры, якія будуць налятаць на яго.

Слова *«скала»* ў гэтым вершы паходзіць ад грэчаскага слова *«petra»*, што значыць *«вялікі камень».* Ісус казаў Сымону Пятру, што цяпер той быў напоўнены тым, на чым можна будаваць дом.

Пазней у 1 Пятра 2:5 апостал пісаў: «і самі, як жывыя камяні, будуйцеся ў дом духоўны». Камень – гэта маленькая частка вялікай скалы. Сіла, стабільнасць і ўлада – у скале адкрытага Слова Божага, а ў жыцці чалавека, які прымае яго, ёсць плод. Гэты чалавек робіцца моцным сілаю таго, хто ёсць жывым Словам Божым, моцаю Ісуса Хрыста.

Апостал Павал пісаў пра гэта ў 1 Карынцянаў 3:11: «Бо ніхто

ня можа закласьці іншага падмурку, апрача пастаўленага, які ёсьць Ісус Хрыстос». Калі мы шукаем Яго, жывое Божае Слова, Ён адкрыецца нам, і мы ўмацуемся ў веры.

Ва ўрыўку Яна 5:16 мы даведваемся, што ў апошнія дні зямнога служэння Ісуса жыццё Яго вучняў ўскладнілася. Рэлігійныя лідары і габрэі пераследавалі і хацелі забіць Ісуса. Калі сітуацыя стала паляпшацца і людзі хацелі ўзяць Яго і паставіць царом, Ён адмовіўся і сышоў (гл. Яна 6:15).

«Чаму Ён гэта зрабіў? – здзіўляліся вучні. – Для Яго і для нас гэта была такая магчымасць». Яны пачалі хвалявацца. Бура ўзмацнялася.

«Мы пакінулі сем'і і працу, каб ісці за гэтым чалавекам. Мы ўсё паставілі на Яго. Мы верым, што Ён – той Самы Месія. Урэшце, гэта сказаў і Ян Хрысціцель, і мы чулі, як гэта сказаў Сымон Пётр у Цэзарэі Філіпавай. Вось двое сведкаў. Але чаму Ён працягвае раздражняць цяперашніх лідараў? Чаму ўласнымі рукамі рые Сабе яму? Чаму Ён кажа такія складаныя рэчы, напрыклад, "пакаленьне бязьвернае і сапсутае, колькі яшчэ Я буду з вамі?" нам, Сваім уласным вучням?»

У сэрцах гэтых людзей, якія пакінулі ўсё, каб ісці за Ісусам, пачала расці крыўда.

Потым здарылася нешта яшчэ большае. Ісус прапаведаваў тое, што падалося сапраўднай герэзіяй: «Сапраўды, сапраўды кажу вам: калі ня будзеце есьці Цела Сына Чалавечага і піць Кроў Ягоную, ня будзеце мець жыцьця ў сабе» (Яна 6:53).

«Што Ён прапаведуе? – дзівіліся яны. – Гэта ўжо занадта!» Да таго ж Ісус казаў гэта перад начальнікамі сінагогі ў Капернауме. Гэтыя словы для вучняў сталі апошняй кропляй!

> Многія з Яго вучняў, што чулі гэта, казалі: «Жорсткае гэта слова. Хто можа слухаць яго?»
>
> – ЯНА 6:60

Звярніце ўвагу на адказ Ісуса:

> Ісус жа, ведаючы ў Сабе, што вучні Ягоныя наракаюць адносна гэтага, сказаў ім: «Ці гэта вас згаршае?»
>
> —ЯНА 6:61

І гэта Яго вучні! Ісус не забірае назад праўду, але супрацьстаіць гэтым людзям. Ён ведае, што некаторыя жывуць на хісткім падмурку. Ён выкрывае падмурак і дае магчымасць убачыць уласнае сэрца. Але гэтыя людзі не былі падобнымі да Сымона Пятра ці іншых вучняў, якія прагнулі праўды. Паглядзіце на іх рэакцыю:

> З таго часу *многія* з вучняў Ягоных пайшлі назад і ўжо не хадзілі з Ім.
>
> —ЯНА 6:66, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Заўважце, што іх было не мала, тут напісана «многія». Некаторыя, без сумніваў, былі тыя самыя, што казалі раней у Цэзарэі Філіпавай: «Адны — Янам Хрысьціцелем, другія — Ільлём, а іншыя — Ярэміем ці адным з прарокаў» (Мцв. 16:14). Яны не ўгрунтаваліся на адкрытым ім Духам Слове Божым.

Крыўда расла ў іх да таго, пакуль яны не зрабілі тое, што многія робяць і сёння, – яны сышлі. Яны думалі, што іх падманулі, але гэта было не так. Яны не бачылі праўды, бо засяродзіліся на сваіх эгаістычных жаданнях.

Цяпер паглядзіце, што адбываецца з Сымонам Пятром, калі Ісус супрацьстаў дванаццаці: Тады Ісус сказаў Дванаццаці:

> «Ці ня хочаце і вы зыйсці?» Адказаў тады Яму Сымон Пётар: «Госпадзе! Да каго нам ісці? Ты маеш словы жыцця вечнага. І мы паверылі, і пазналі, што *Ты — Хрыстос, Сын Бога Жывога*».
>
> — ЯНА 6:67 – 69, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Ісус не прасіў гэтых людзей: «Калі ласка, не сыходзьце. Я і так большую частку супрацоўнікаў згубіў. Як спраўлюся без вас?»

Не, Ён супрацьстаў ім. «Ці не хочаце і вы зыйсці?»

Звярніце ўвагу, як адказвае Сымон Пётр, хоць ён і змагаўся з той самай магчымасцю пакрыўдзіцца, як і астатнія. «Госпадзе! Да каго нам ісці?»

Пачутае, мусіць, збянтэжыла яго, але ўнутры былі веды, якіх не мелі іншыя. У Цэзарэі Філіпавай Пётр атрымаў адкрыццё пра тое, Хто такі Ісус – «Сын Бога Жывога» (Мцв. 16:16).

Цяпер, у час гэтага выпрабавання, ён сказаў тое, што ўкаранілася ў яго сэрцы: «І мы паверылі, і пазналі, што Ты — Хрыстос, Сын Бога Жывога». Дакладна тыя ж словы, што ён выгукнуў у Цэзарэі Філіпавай. Ён быў каменем, пастаўленым на скале жывога Божага Слова. Ён не сышоў з крыўдай.

## РЭАКЦЫЯ ПАД ЦІСКАМ

Я часта кажу, што выпрабаванні і складанасці *вызначаюць* чалавека. Іншымі словамі, яны вызначаюць, дзе вы знаходзіцеся духоўна. Яны адкрываюць сапраўдны стан вашага сэрца. Тое, як вы паводзіце сябе пад ціскам, – *ваша сапраўдная рэакцыя*.

Найлепшыя майстры могуць збудаваць для вас на пяску прыгожы пяціпавярховы дом з самых каштоўных матэрыялаў. Пакуль свеціць сонца, дом здаецца надзейнай і прыгожай крэпасцю.

Побач з гэтым домам можа быць просценькая аднапавярховая хатка. Яна амаль незаўважная, а магчыма, і непрыгожая ў параўнанні з выкрутасістай будынінай побач. Але яна збудаваная на тым, што нам не бачна: на скале.

Пакуль няма бураў, пяціпавярховы будынак на пяску выглядае нашмат лепей. Але калі наляціць моцная бура, гэты дом абрынецца і разбурыцца. Ён можа перажыць некалькі слабых бураў, але не ўраган. Просты аднапавярховы будынак выстаіць. Чым большы дом, тым гучнейшым і больш заўважным будзе яго падзенне.

Некаторыя людзі ў царкве падобныя на вучняў, якія хутка выказаліся ў Цэзарэі Філіпавай, але пазней былі выкрытыя. Яны могуць выглядаць угрунтаванымі і прыгожымі хрысціянамі, моцнымі і трывалымі. Яны могуць выстаяць некалькі маленькіх і сярэдніх бур. Але калі налятае магутная бура, яны захістаюцца.

Будуйце сваё жыццё на Божым Слове, адкрытым Духам, незалежна ад таго, што кажуць іншыя. Працягвайце шукаць Госпада і слухаць сэрца. Не рабіце і не кажыце чагосьці проста таму, што так робяць усе астатнія. Шукайце Яго і стойце на тым, што адкрыта вашаму сэрцу!

## КАЛІ ВОРАГ ХІСТАЕ ВАС, ЁН ХОЧА ВАС ЗНІШЧЫЦЬ. АЛЕ БОГ МАЕ ІНШУЮ МЭТУ.

Я хацеў бы падзякаваць Богу за пасланне кнігі «*Прынада шатана*». Я пасціўся і маліўся за прарыў у жыцці. Госпад паказаў мне гэтую вестку, і яна радыкальна змяніла маё жыццё. Усім, хто нясе служэнне, абавязкова трэба яе прачытаць.

—К. П., НОВАЯ ЗЭЛАНДЫЯ

# MessengerX

***Ваша праграма для штодзённага вучнёўства***

## Цалкам бясплатна!

Проста спампуйце праграму на вашу мабільную прыладу і карыстайцеся! Або выкарыстоўвайце вэб-версію на сайце:

**MessengerX.com**




## 125+ моваў, і гэта яшчэ не ўсё

- Праглядайце і запампоўвайце матэрыялы на больш чым 125 мовах.
- Дзяліцеся рэсурсамі з сябрамі або пачніце групу па вывучэнні.
- Мы пастаянна дадаём новыя матэрыялы.

## Глядзіце. Чытайце. Слухайце.

Даследуйце вялікую бібліятэку матэрыялаў, якія вы можаце глядзець, чытаць і слухаць: курсы, электронныя кнігі, аўдыякнігі, кароткаметражныя фільмы і многае іншае.









## Рост у самых важных сферах

Даследуйце такія тэмы, як сям'я, здаровыя адносіны, мэта жыцця, свабода ад парнаграфіі, умацаванне веры, адносіны з Богам, лідарства ў бізнесе і многія іншыя!

## Шлях да вашага росту

Мэта **MessengerX** – дапамагчы зрабіць наступны крок, таму мы распрацавалі сістэму вучнёўства і надзейныя інструменты, якія дапамогуць вам застацца на гэтым шляху.




## Больш выдатных функцый, якія вам спадабаюцца!

- Простыя і лёгкія інструменты, якія дапамогуць вам дзяліцца матэрыяламі і ствараць групы для іх вывучэння.
- Chromecast і AirPlay для прагляду на вашых любімых смарт-тэлевізарах.
- Захоўвайце ваш прагрэс на ўсіх прыладах. Захоўвайце ўпадабаныя матэрыялы ў бібліятэку для хуткага доступу.
- Спампоўвайце матэрыялы на свае прылады для прагляду афлайн.
- Магутны пашукавік і фільтры, каб знайсці менавіта тое, што вы шукаеце.
- Аўтаматычнае прайграванне наступных раздзелаў аўдыякніг, аўдыяБібліі і нават пакланенення на вашай мове!

# MessengerX - проста як 1-2-3!




**1** Спампуйце праграму **MessengerX** з App Store ці Google Play.

**2** Стварыце ўліковы запіс і карыстайцеся праграмай на вашай мове.

**3** Праглядайце, чытайце, глядзіце, слухайце, спампоўвайце ўлюбёныя матэрыялы і дзяліцеся імі.

## Станьце вучнямі, рыхтуйце вучняў

Як частка **MessengerX,** вы дапаможаце нам забяспечыць людзей па ўсім свеце перакладзенымі матэрыяламі.

***Бо кожны варты таго, каб ведаць!***

**MessengerX.com**

Спампаваць у App Store

Атрымаць Google Play

</> Даступна ва ўсіх браўзэрах

# 8

# УСЁ, ШТО МОЖА ПАХІСНУЦЦА, ПАХІСНЕЦЦА

*Ён ...цяпер абяцаў, кажучы: «Яшчэ раз страсяну ня толькі зямлю, але і неба». А [словы] «яшчэ раз» паказваюць на змену таго, што хістаецца, як створанага, каб засталося тое, што не хістаецца.*

**—ГЕБРАЯЎ 12:26 – 27**

У папярэднім раздзеле мы бачылі, што адкрытае нам Слова Божае – гэта падмурак, на якім Ісус будуе Сваю Царкву. Мы бачылі Сымона Пятра, які застаўся, калі іншыя пакрыўджаныя вучні сышлі. Нават калі Ісус даў магчымасць сысці, Сымон Пётр вызнаў тое, што цвёрда ўкаранілася ў яго сэрцы.

Цяпер давайце зірнём на іншае выпрабаванне Сымона Пятра ў той дзень, калі Ісус быў выдадзены.

Ісус сядзеў за сталом з дванаццаццю апосталамі, дзякаваў за ежу на Апошняй Вячэры і  сказаў нечаканую рэч: «Але вось, рука таго, хто выдае Мяне, са Мною за сталом. І, сапраўды, Сын Чалавечы ідзе паводле таго, як вызначана, але гора таму чалавеку, які Яго выдае» (Лукі 22:21 – 22). Вось дык абвяшчэнне! Мы сёння сказалі б, што гэтыя словы Ісуса прагучалі як выбух бомбы.

Хоць Ісус ад пачатку ведаў, што будзе выдадзены, вучні пачулі пра гэта ўпершыню. Ці можаце вы ўявіць жахлівую атмасферу ў пакоі, калі Ён сказаў, што адзін з тых, хто быў з Ім ад пачатку, блізкі супрацоўнік, выдасць Яго?

У адказ «яны пачалі пытацца адзін у аднаго, хто гэта з іх меўся зрабіць гэта» (верш 23). Вучні былі ў шоку ад таго, што адзін з іх быў здольны на такую жахлівую справу. Але іх матыў не быў чыстым. Мы ведаем гэта па тым, як скончылася размова. Прычыны такіх пытанняў палягалі ў эгаізме і ганарлівасці. Паглядзіце на наступны верш Пісання:

> Узнялася ж і спрэчка між імі, хто з іх лічыцца большым.
>
> —ЛУКІ 22:24

Уявіце сабе: Ісус сказаў ім, што Яго вось–вось выдадуць першасвятарам, асудзяць на смерць і аддадуць рымлянам на здзекі і пабоі. Той, хто гэта зробіць, сядзіць з Ім за сталом.

Вучні спыталіся, хто гэта, і скончылі спрэчкай наконт таго, хто з іх найбольшы. Гэта было ганебна – нібы дзеці, што спрачаюцца пра спадчыну. Вучні не хваляваліся за Ісуса, але супернічалі ў пагоне за ўладай і пасадай. Які  неверагодны эгаізм!

На месцы Ісуса я б, напэўна, запытаўся, ці чулі яны, што я сказаў, ці было гэта для іх важна. У такой сітуацыі мы бачым прыклад таго, як наш Госпад хадзіў у любові і цярплівасці. Большасць з нас на месцы Ісуса сказалі б: «Ідзіце прэч! У мяне самы складаны час, а вы думаеце толькі пра сябе!» Якая магчымасць пакрыўдзіцца!

Мы можам здагадацца, хто стаў ініцыятарам спрэчкі сярод

вучняў: Сымон Пётр, бо ён дамінаваў сярод вучняў і звычайна выказваўся першым.

Магчыма, ён нярэдка нагадваў астатнім, што ён адзіны, хто хадзіў па вадзе. Або, магчыма, ён пры кожнай магчымасці нагадваў, што першы атрымаў адкрыццё пра тое, хто такі Ісус. Таксама Пётр мог дзяліцца перажываннем, якое меў на гары, калі да Ісуса прыйшлі Майсей і Ілля.

Пётр быў дастаткова ўпэўненым, што ён – самы вялікі з дванаццаці. Але гэтая ўпэўненасць не каранілася ў любові. Хутчэй, яе коранем была пыха. Ісус паглядзеў на вучняў і сказаў, што яны паводзяць сябе як дзеці гэтага веку, а не сыны Валадарства: «Валадары народаў пануюць над імі, і тыя, што маюць над імі ўладу, дабрадзеямі называюцца. Вы ж ня гэтак, але большы сярод вас станься як меншы, і правадыр — як служыцель. Бо хто большы: той, які ўзьлягае за сталом, ці той, які паслугуе? Ці ня той, які ўзьлягае? А Я сярод вас, як той, які паслугуе» (Лукі 22:25 – 27).

## МЭТА ПРАСЕЙВАННЯ

Хоць Сымон Пётр і атрымаў адкрыццё пра тое, кім быў Ісус, ён яшчэ не меў характару і пакорнасці Хрыста. Ён будаваў жыццё і служэнне на мінулых перамогах і ганарлівасці. У 1 Карынцянаў 3:10 Павал заклікае нас зважаць на тое, як мы будуем на падмурку ў Хрысце.

Сымон Пётр не будаваў з матэрыялаў, неабходных для Валадарства Божага, але з моцнай волі і асабістай упэўненасці. Сам таго не разумеючы, ён усё яшчэ чакаў перамянення свайго характару. Яго апірышчам была «пыха жыцьцёвая» (1 Яна 2:16).

Пыха не падрыхтавала б Пятра да выканання таго, што прызначыў яму Хрыстос. Калі ад яе не пазбавіцца, то ўрэшце яна можа зруйнаваць. У Эзэкііля 28:11 – 19 мы бачым, што пыха была таксама і праблемай Люцыфера, памазанага Богам херувіма. І прывяла яго да падзення.

Цяпер зірніце на тое, што Ісус кажа Сымону Пятру:

> І сказаў Госпад: «Сымоне, Сымоне! Вось, шатан зажадаў прасейваць вас, як пшаніцу».
>
> —ЛУКІ 22:31

Пыха адчыніла дзверы, каб каб вораг увайшоў і прасейваў Сымона Пятра. Слова «прасейваць» – гэта пераклад грэчаскага слова «сініязо». Яно значыць «прасейваць, трэсці ў сіце, вобразна – праз унутраную ўзрушанасць і неспакой выпрабоўваць чыюсьці веру да мяжы падзення».

Калі б Ісус думаў, як многія іншыя ў царкве, Ён бы сказаў: «Давайце памолімся і звяжам гэтую д’ябальскую атаку. Мы не дазволім шатану зрабіць гэта з нашым Сымонам!» Але паслухайце, што Ён кажа:

> А Я маліўся за цябе, каб не паменшала вера твая; і ты, некалі павярнуўшыся, умацуй братоў тваіх.
>
> —ЛУКІ 22:32

Ісус не маліўся, каб Сымон Пётр пазбег гэта моцнага выпрабавання да мяжы падзення. Ён маліўся, каб яго вера не аслабела ў гэты час. Ісус ведаў, што з гэтага выпрабавання вырасце новы характар, які спатрэбіцца Сымону Пятру, каб выканаць прызначэнне і ўмацаваць братоў.

Шатан прасіў дазволу прасеяць Сымона Пятра так моцна, каб той страціў сваю веру. Намерам ворага было знішчыць гэтага чалавека з вялікім патэнцыялам, які атрымаў шмат адкрыццяў. Але Бог меў іншую мэту ў прасейванні і, як заўсёды, Бог бачыў нашмат далей за д’ябла. Ён дазволіў ворагу зрабіць гэта, каб пахіснуць у Сымоне ўсё тое, што *трэба* было пахіснуць.

Бог паказаў маёй жонцы Лізе пяць мэтаў такога хістання:

1. Вярнуць бліжэй да падмуркаў.
2. Прыбраць памерлае.

3. Сабраць спелае.

4. Абудзіць.

5. Аб’яднаць ці змяшаць тое, што ўжо нельга раздзяліць.

Любыя думкі або стаўленне, коранем якіх ёсць эгаізм або пыха, будуць ачышчаныя. У выніку гэтага вялізнага прасейвання ўся самаўпэўненасць Сымона Пятра знікне, а застанецца толькі надзейны Божы падмурак. Ён зразумее свой сапраўдны стан, мёртвае будзе прыбрана, а спелы плод – сабраны, што наблізіць Пятра да сапраўднага падмурка. Ён ужо не будзе дзейнічаць незалежна, але стане залежным ад Госпада.

Пётр смела запярэчыў словам Ісуса: «Госпадзе! З Табою я гатовы ісці і ў вязніцу, і на смерць!» Гэта сцверджанне нарадзілася не ад Духа, але з самаўпэўненасці апостала. Ён не бачыў у сабе недахопаў і прадвеснікаў прасейвання.

## ЮДА І СЫМОН

Некаторыя лічаць Пятра вялікім балбатуном і баязліўцам. Але ў садзе, калі вартаўнікі прыйшлі арыштаваць Ісуса, Пётр выхапіў меч і адсёк правае вуха слугі першасвятара (Яна 18:10). Нямногія баязліўцы нападаюць, калі перад імі стаіць мноства жаўнераў–ворагаў. Таму ён быў моцным, але сіла была ў яго асобе, а не ў пакорнасці Богу, бо прасейванне яшчэ не пачалося.

Усё адбылося дакладна так, як казаў Ісус. Той самы смелы, моцны Сымон Пётр, гатовы памерці за Ісуса, той, хто выцягнуў меч у садзе, поўным жаўнераў, стаяў перад маленькай дзяўчынай–служанкай. Ён быў запалоханы і адмаўляў нават тое, што ведаў Ісуса.

Некаторыя думаюць, што людзей прымушаюць спатыкацца вялікія рэчы. Часта нас могуць пахіснуць маленькія падзеі. Гэта паказвае марнасць самаўпэўненасці.

Потым Пётр выракся Ісуса яшчэ два разы. Адразу ж заспяваў певень, а Пётр горка заплакаў і сышоў. Ён згубіў усю

самаўпэўненасць і думаў, што ніколі больш не зможа падняцца на ногі. У яго засталося – хаця ён гэтага і не разумеў – толькі тое, што адкрыў Дух.

Сымон Пётр і Юда шмат у чым былі падобныя, напрыклад, у тым, што здрадзілі Ісусу ў апошнія, самыя важныя дні Яго жыцця. Але паміж імі была вялізная розніца.

Юда ніколі не прагнуў ведаць Ісуса так, як гэтага прагнуў Сымон. Юда не быў угрунтаваны ў Ім. Падавалася, што Юда любіў Ісуса, бо ён усё пакінуў, каб пайсці за Ім, заставаўся з Ім заўсёды, нават у часы пераследу. Юда выганяў дэманаў, ацаляў хворых і прапаведаваў Евангелле. (Прыгадайце, Ісус адправіў прапаведаваць, ацаляць і вызваляць дванаццаць вучняў, а не адзінаццаць). Але яго ахвяры былі не з любові да Ісуса, не з адкрыцця пра тое, кім Ён быў.

Юда ад самага пачатку меў свае інтарэсы. Ён ніколі не каяўся ў эгаістычных матывах. Яго характар бачны ў наступных фразы: «Што хочаце *мне даць*, і я вам выдам Яго?...» (Мцв. 26:14, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ) Ён хлусіў і ліслівіў, каб дасягнуць чагосьці (Мцв. 26:25). Ён узяў грошы са скарбонкі служэння Ісуса для асабістых мэтаў (Яна 12:4 – 6). І гэта няпоўны спіс. Юда не ведаў Госпада, хоць і правёў разам з Ім тры з паловай гады.

Абодва мужчыны шкадавалі пра тое, што зрабілі. Але Юда не меў падмурка, які быў у Пятра. Ён ніколі не прагнуў ведаць Ісуса, таму Ісус і не адкрыўся яму. Калі б Юда меў адкрыццё пра Ісуса, ён ніколі б Яму не здрадзіў. Калі моцная бура прыйшла ў яго жыццё, усё скаланулася і затрэслася! Глядзіце, што адбылося:

> Тады Юда, які выдаў Яго, убачыўшы, што Ён асуджаны, *пакаяўшыся*, зьвярнуў трыццаць срэбнікаў першасьвятарам і старшыням, кажучы: «*Саграшыў я, выдаўшы кроў бязьвінную*». Яны ж сказалі яму: «Што нам да гэтага? Глядзі сам». І, кінуўшы срэбра ў бажніцы, ён выйшаў і, адыйшоўшы, *павесіўся*.
>
> —МАЦВЕЯ 27:3 – 5, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Юда шкадаваў і ведаў, што зграшыў. Але ён не ведаў Хрыста. Ён не меў разумення велічы Таго, Каму Ён здрадзіў. Ён толькі сказаў: «Выдаў я кроў бязвінную». Калі б ён ведаў Хрыста як Сымон Пётр, то вярнуўся б да Яго і пакаяўся, ведаючы добрасць Госпада. Самагубства – яшчэ адзін учынак жыцця незалежна ад ласкі Божай. Патрасенне адкрыла, што Юда не меў падмурка, хоць і хадзіў разам з Госпадам тры гады.

Мноства нованавернутых маліліся малітвай пакаяння, наведвалі царкву, былі актыўнымі і вывучалі Біблію. Але ўсё гэта без адкрыцця аб тым, Хто такі Ісус, хоць яны і вызнавалі Яго вуснамі. Калі здараецца сур'ёзнае расчараванне, такія людзі крыўдзяцца на Бога і не жадаюць мець з Ім нічога супольнага.

Я чуў ад іх словы, што Бог ніколі нічога для іх не рабіў. «Я паспрабаваў быць хрысціянінам, але стаў яшчэ больш няшчасным». Або «я маліўся і прасіў Бога гэта зрабіць, але Ён мяне не выслухаў!» Яны не аддалі свайго жыцця Ісусу, але спрабавалі прыйсці да Яго дзеля Сваёй выгоды. Яны служылі Яму дзеля таго, што Ён мог ім даць. Яны лёгка крыўдзіліся. Вось так пра іх кажа Ісус:

> Таксама і тыя, што на каняністым месцы пасеяны, пачуўшы слова, адразу з радасьцю прыймаюць яго, але *ня маюць у сабе кораня*, таму нетрывалыя; калі надыйдзе прыгнёт ці перасьлед дзеля слова, адразу ж *горшацца*.
>
> —МАРК 4:16 – 17, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Звярніце ўвагу: Ісус сказаў, што яны хутка горшацца, бо не маюць падмурка. У чым мы павінны ўкараняцца? Мы знаходзім адказ у Эфесцам 3:16 – 18: мы мусім укараняцца і ўмацоўвацца ў любові. Наш падмурак – гэта наша любоў да Бога.

Ісус сказаў: «Ніхто ня мае любові большае за тую, калі хто аддасьць душу сваю за сяброў сваіх» (Яна 15:13). Мы не можам аддаць душу за таго, каму не давяраем. Мы не можам пакласці

жыццё за Бога, калі не ведаем Яго дастаткова, каб давяраць Яму. Нам трэба ведаць і разумець прыроду і характар Бога. Мы мусім мець пэўнасць, што Ён ніколі не зробіць нам аніякае шкоды.

Ён заўсёды шукае, што будзе для нас найлепшым. Калі мы не згубім веры, то расчараванні могуць павярнуцца нам на дабро. Бог ёсць любоўю, у Ім няма эгаізму або зла. Знішчыць нас жадае толькі шатан.

Часта мы бачым жыццёвыя сітуацыі ў кароткачасовай перспектыве. Гэта скажае сапраўдную карціну. Бог глядзіць на вечны аспект таго, праз што мы праходзім. Калі мы глядзім на сітуацыю толькі з абмежаванага пункта гледжання, могуць адбыцца дзве рэчы.

Па–першае, пасярод Божага працэсу ачышчэння мы будзем лёгкай здабычай для крыўды на Бога ці аднаго з Яго слугаў. Па–другое, вораг можа лёгка нас падмануць. Шатан будзе выкарыстоўваць тое, што падаецца правільным на дадзены момант, але яго план – выкарыстаць гэта, каб забіць ці знішчыць нас. Калі мы прымаем рашэнне давяраць Богу, мы застаёмся ў клопаце Айца. Мы не будзем паддавацца спакусе клапаціцца пра сябе самастойна.

## ЗАЛЕЖАЦЬ АД БОЖАГА ХАРАКТАРУ

Адзін са спосабаў, якімі вораг спрабуе адцягнуць нас ад давера Богу, – сказіць наша ўспрыняццё Божага характару. Ён зрабіў гэта ў садзе з Евай, спытаўшыся ў яе: «Ці ж гэта сказаў Бог: “*Ня* ешце з кожнага дрэва ў садзе”?» (Быц. 3:1, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ) Ён перайначыў Божае прыказанне, каб напасці на людзей і сказіць характар Бога.

Бог сказаў: «З *кожнага дрэва* ў садзе *будзеш есці*, але з дрэва спазнання дабра і зла ня еш з яго, бо ў дзень, у які будзеш есці з яго, сьмерцю памрэш» (Быц. 2:16 – 17, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ).

Па сутнасці, змей казаў Еве: «Бог хавае ад вас усё добрае».

Але Бог падкрэсліў: «З кожнага дрэва можаце есці, акрамя...» Бог даў чалавецтву цэлы сад, якім можна было цешыцца і ласавацца ўсімі пладамі, акрамя аднаго.

Змей выказаў тое, як жанчына бачыла Бога: «Насамрэч, Бог не клапоціцца пра вас. Якую добрую рэч Ён ад вас хавае? Ён, напэўна, не любіць вас, як вы думаеце. Напэўна, Ён зусім нядобры!» Яна падманулася і паверыла ў хлусню пра Божы характар. Тады з'явілася жаданне грашыць, бо Слова Божае ўжо не было жыццём, але законам. А «сіла грэху – закон» (1 Кар. 15:56).

Вораг дзейнічае так і сёння. Ён скажае характар Бога–Айца ў вачах Яго дзяцей. Мы ўсе маем кагосьці над намі: гэта бацькі, настаўнікі, начальнікі або ўлады, і некаторыя з іх могуць быць эгаістычнымі і не любіць нас. Яны маюць уладу над намі, і таму лёгка спраектаваць іх прыроду на характар Божы, бо Ён ёсць найвышэйшай уладай.

Вораг па–майстэрску перайначыў характар Айца, скажаючы наш погляд на зямных айцоў. Бог кажа, што перад вяртаннем Ісуса сэрцы бацькоў звернуцца да дзяцей (Мал. 4:6). Яго характар або прырода будуць бачныя ў Яго лідарах, і гэта паспрыяе ацаленню.

Калі вы ведаеце, што Бог *ніколі* не зробіць вам ніякай шкоды, і вы ведаеце, што ўсё Яго справы – толькі дзеля вашага найвышэйшага дабра, то вы свабодна даверыцеся Яму. Вы з радасцю пакладзяце жыццё дзеля Валадара.

Калі вы цалкам аддаяце сябе Ісусу і Яго клопату, вы не можаце пакрыўдзіцца, бо не належыце сабе. Тыя, каму нешта баліць, хто расчароўваецца, – гэта людзі, што прыйшлі да Ісуса дзеля таго, што Ён можа для іх зрабіць, а не дзеля Яго Самога.

Калі мы так ставімся, то лёгка расчароўваемся. Засяроджанасць на сабе робіць нас блізарукімі. Мы не здольны бачыць вачамі веры непасрэдныя абставіны. Калі наша жыццё схаванае ў Ісусе, мы ведаем Яго характар і раздзяляем Яго

радасць. Мы не будзем хістацца і не пацерпім крушэнне веры.

Калі мы судзім праз прызму абставінаў, вельмі лёгка пакрыўдзіцца. Такое бачанне – гэта не бачанне вачамі Духа. Бог часта адказвае мне не так або не ў той час, калі мне гэта падаецца неабходным. Але калі я азіраюся на кожны выпадак, я разумею і бачу Яго мудрасць.

Часам нашы дзеці не разумеюць нашых метадаў або логікі выхавання. Мы спрабуем патлумачыць гэта старэйшым дзецям, каб яны скарысталіся нашай мудрасцю. Але часам яны не разумеюць ці не згаджаюцца праз сваю няспеласць. Яны зразумеюць пазней. Або, магчыма, гэта праверка іх паслухмянасці, любові і спеласці. Гэтаксама адбываецца і з нашым Айцом Нябесным. У такіх сітуацыях вера кажа: «Я давяраю Табе, хоць і не разумею».

У Гебраяў 11:35–39 мы чытаем пра тых, хто так і не ўбачыў здзяйснення Божых абяцанняў, але не пахіснуўся: «...а іншыя былі замучаныя, не дачакаўшыся адкупленьня, каб атрымаць лепшае ўваскрашэньне, іншыя паспыталі зьдзекаў і тартураў, а яшчэ путаў і вязьніцы, былі каменаваныя, пілаваныя, спакушаныя, былі забіваныя мячом, бадзяліся ў авечых і казіных скурах, маючы нястачу, прыгнёт, нягоды; тыя, якіх сьвет ня быў варты, туляліся па пустынях і горах, па пячорах і шчылінах зямлі. І ўсе яны, што засьведчаныя вераю, *не атрымалі абяцаньня*» (ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ).

Яны вырашылі, што ім неабходны толькі Бог, незалежна ад кошту. Яны верылі Богу, нават калі паміралі, не ўбачыўшы здзейсненых абяцанняў. Іх немагчыма было пакрыўдзіць!

Мы ўкаранёныя і ўмацаваныя, калі маем такую насычаную любоў і давер Богу. Ніякая бура, якой бы моцнай яна ні была, не можа пахіснуць нас. Гэта не прыходзіць ад моцнай волі ці асобы. Гэта дар ласкі ўсім тым, хто давярае Богу, адкідаючы ўпэўненасць у сабе. Але каб адкінуць спадзяванне на сябе, вы мусіце ведаць Таго, у чыіх руках ваша жыццё.

## ЛАСКА ДАЕЦЦА ЎПАКОРАНЫМ

Сымон Пётр больш не мог хваліцца сваімі якасцямі. Ён згубіў сваю натуральную ўпэўненасць і выразна бачыў марнасць моцнай волі. Ён быў упакораны і стаў выдатным кандыдатам на ласку Божую. Бог дае Сваю ласку скораным. Скоранасць – гэта абавязковае патрабаванне. Гэты ўрок гарэў у сэрцы Пятра, калі ён пісаў у сваім лісце: «апраніцеся ў пакорлівасьць, бо Бог пыхлівым працівіцца, а пакорным ласку дае» (1 Пят. 5:5).

Пётр перажыў патрасенне, якое ледзь не прымусіла здацца. Мы ведаем гэта праз вестку, якую анёл Госпада даў Марыі Магдалене ля магілы: «Але ідзіце, скажыце вучням Ягоным *і Пятру*: “Ён ідзе перад вамі ў Галілею; там Яго ўгледзіце, як Ён сказаў вам”» (Марк 16:7, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ). Анёлу прыйшлося вылучыць Пятра, бо той быў на мяжы караблекрушэння. Бог заклаў у ім падмурак. Патрасенне не прыбрала гэты падмурак, але ўмацавала.

Ісус не толькі прабачыў Пятру, але і аднавіў яго. Цяпер, перажыўшы крызіс, Пётр быў гатовы стаць адным з цэнтральных дзеячоў царквы. Ён адважна абвяшчаў Уваскрасенне Хрыста перад тымі, хто Яго ўкрыжаваў. Ён стаяў перад радай, а не перад служанкай. Ён выступаў з вялікай уладай і адвагай.

Традыцыя кажа, што Пётр шмат год служыў Госпаду, а ў канцы жыцця быў укрыжаваны дагары нагамі. Ён настойваў, што не варты памерці такой жа смерцю, што і Госпад, таму яго ўкрыжавалі дагары нагамі. Пётр больш не баяўся. Ён быў каменем на цвёрдым падмурку Скалы.

Выпрабаванні ў жыцці выкрыюць тое, што напаўняе ваша сэрца, пакажуць, ці ёсць там крыўда на Бога або людзей. Праверкі або прывядуць да таго, што вы пакрыўдзіцеся на Бога і іншых, або умацуюць. Калі вы пройдзеце праверку, вашы карані заглыбяцца, стабілізуюць вас і вашу будучыню. Калі не, то вы пакрыўдзіцеся, а гэта прывядзе да забруджвання і горычы.

## ГОСПАД, Я СЛУЖЫЎ ТАБЕ, ДЫК ЧАМУ Ж... ?

Калі я быў пастарам, у моладзевай групе быў кемлівы чатарнаццацігадовы падлетак, якога вельмі паважалі сябры і лідары групы. Ён быў добрым вучнем і спартоўцам. Прагны да Божых справаў, гэты малады чалавек верна служыў і удзельнічаў ва ўсіх праектах. Ён ездзіў з намі ў місіянерскія падарожжы, сведчыў амаль усім, з кім быў знаёмы.

У нейкі перыяд жыцця ён праводзіў у малітве па чатыры гадзіны ў дзень. Ён шмат чуў ад Госпада і дзяліўся пачутым з іншымі. Гэта заўсёды было дабраславеннем. Ён разумеў сваё пакліканне служыць і хацеў стаць пастарам да таго, як яму споўніцца дваццаць. Ён падаваўся непахіснай скалой.

Мне ён вельмі падабаўся, я бачыў пакліканне Божае і прысвячаў падлетку шмат часу. Мяне турбавала толькі адно: малады чалавек падаваўся занадта самаўпэўненым. Я хацеў сказаць яму штосьці пра гэта, але час яшчэ не прыйшоў. Я ведаў, што прыйдуць перамены. Юнак перажыў некалькі суровых бур, але застаўся моцным. Часам я ставіў сваё меркаванне пад пытанне, калі бачыў, як ён праходзіў цяжкія выпрабаванні.

Прайшло некалькі гадоў. Ён пераехаў, а я шмат падарожнічаў. Але мы падтрымлівалі сувязь. Я ведаў, што яму давядзецца прайсці праз ломку і скрышанасць. Гэта мусіла адбыцца. Я не ведаў, што здарыцца, але разумеў: так было неабходна, каб ён выканаў пакліканне. Гэта было падобна на прасейванне Сымона Пятра.

Калі гэтаму маладому чалавеку было васямнаццаць, у яго таты дыягнаставалі невылечны рак. Юнак і яго маці пасціліся і маліліся, верылі, што іх блізкі атрымае ацаленне. Да іх таксама далучыліся іншыя. За некалькі месяцаў да хваробы яго бацька прысвяціў жыццё Ісусу.

Стан таты пагаршаўся. Калі мне пазваніла жонка і папрасіла тэрмінова звязацца з гэтым маладым чалавекам, я служыў

у іншым горадзе Алабамы. Я пазваніў юнаку і зразумеў: яму патрэбна падтрымка.

Пасля апошняга служэння я паехаў да яго і дабраўся ў чатыры гадзіны раніцы. Стан таты быў такім сур'ёзным, што дактары давалі яму ўсяго некалькі дзён. Ён не мог нават размаўляць.

Малады чалавек быў упэўнены, што айцец атрымае ацаленне. Я паслужыў сям'і і праз некалькі гадзін паехаў далей. На наступны ранак мы атрымалі званок з весткай, што сітуацыя пагоршылася.

Мы з Лізай адразу ж памаліліся. Падчас малітвы Бог даў жонцы бачанне: Ісус стаяў ля ложка хворага, гатовы забраць яго дадому. Праз трыццаць хвілін нам пазваніў сам малады чалавек і сказаў, што айцец памёр. Падавалася, яго вера не пахіснулася. Але гэта быў толькі пачатак.

У той вечар ён пазваніў блізкім сябрам, каб сказаць пра смерць таты. Калі яму адказалі, ён пачуў плач. Юнак падумаў, што, магчыма, знаёмыя ўжо чулі навіну. Але гэта было не так. Яны плакалі па адным з яго найлепшых сяброў, які толькі што загінуў у аварыі. У адзін дзень юнак страціў айца і вельмі добрага сябра.

Пачалося прасейванне. Малады чалавек быў разгублены, збянтэжаны і знямелы ад гора. Падавалася, Божая прысутнасць пакінула яго.

Праз месяц па дарозе дадому гэты малады чалавек убачыў аварыю. Раней ён праходзіў курсы першай дапамогі, таму спыніўся. Людзі ў машынах выявіліся яго блізкімі сябрамі. Нягледзячы на яго спробы дапамагчы, двое з іх памерлі ў яго на руках.

Гэта стала апошняй кропляй для майго маладога сябра. Тры гадзіны ён маліўся і крычаў да Бога ў лесе. «Дзе Ты? Ты сказаў, што будзеш маім Пацяшыцелем, але я не маю пацяшэння!»

Падавалася, Бог адвярнуўся ад яго. Але насамрэч, гэта быў першы раз, калі яго ўласная сіла аказалася недастатковай.

Ён раззлаваўся на Бога. Чаму Ён дапусціў гэта? Ён не злаваўся на пастара, сям'ю ці мяне. Яго крыўда была на Бога. Яго паглынула расчараванне. Бог падвёў яго ў час найвялікшай патрэбы.

«Госпад, я служыў Табе і шмат ад чаго адмовіўся, каб ісці за Табой, – маліўся ён. – Цяпер Ты пакінуў мяне!» – юнак лічыў, што Бог яму нешта вінен, бо ён ад усяго адмовіўся, каб служыць Богу.

Многія людзі перажывалі боль і расчараванне, хтосьці меншае, хтосьці – большае. Многія крыўдзіліся на Госпада. Яны лічаць, што Бог павінен зважаць на ўсё, што яны для Яго зрабілі.

Такія людзі служаць Богу з няправільных прычын. Мы не павінны служыць Госпаду за тое, што Ён можа зрабіць, але дзеля таго, Хто Ён і што Ён ужо зрабіў для нас. Тыя, хто крыўдзіцца, не да канца разумеюць, які вялікі доўг Бог ужо выплаціў за іх свабоду. Яны забылі, ад якой смерці збаўлены, бо глядзяць вачамі фізічнымі, а не вечнымі.

Гэты малады чалавек перастаў наведваць царкву і звязаўся з кепскай кампаніяй, стаў рэгулярна бываць у барах і на вечарынках. У сваім расчараванні ён не хацеў мець нічога агульнага са справай Божай. Ён пазбягаў любога кантакта з Богам.

Ён не змог так жыць больш за два тыдні, бо сэрца моцна яго выкрывала. Але ён адмаўляўся вярнуцца да Госпада яшчэ шэсць месяцаў. Нават тады нябёсы падаваліся меднымі. Здавалася, Божай прысутнасці нідзе няма.

Прайшло больш за год. Праз некалькі выпадкаў ён убачыў, што Бог па–ранейшаму дзейнічае ў яго жыцці. Ён вярнуўся да Бога, але зусім па–іншаму. Ён прыйшоў у пакорлівасці. Калі час выпрабаванняў скончыўся, Госпад паказаў яму, што ніколі яго не пакідаў. Аднаўляючы свой духоўны шлях, ён навучыўся давяраць ласцы Божай, а не сваёй сіле.

Я падтрымліваў адносіны з ім. Праз паўтара года ў размове са мной ён назваў тое, што ўпершыню ўбачыў у сабе. «Я быў

бесхарактарным чалавекам, павярхоўна ставіўся да іншых. Тата выхаваў мяне знешне моцным чалавекам, які ўсяго дасягнуў сам. Я не мог вырасці такім, якім Бог хацеў мяне бачыць. Я ўдзячны Госпаду, што Ён не пакінуў мяне ў такім стане.

Але больш за ўсё мяне засмуціла не тое, што я наведваў бары і піў. Мяне засмуціла, што я адвярнуўся ад Духа Святога. Я моцна люблю Яго. Мае адносіны з Ім ніколі не былі такімі цудоўнымі раней».

У яго жыцці адбылося шмат патрасенняў. Знікла самаўпэўненасць. Але гэты малады чалавек знайшоў падмурак, які меў Сымон Пётр, і яго ўжо немагчыма было прыбраць. Замест таго, каб будаваць сваё жыццё і служэнне на ганарлівасці, ён будуе праз ласку Божую.

Крыўды часта адкрываюць слабасць і кропкі надлому ў нашым жыцці. Часта тое, што мы лічым сваёй сілай, – месца нашай схаванай слабасці. Яна будзе хавацца, пакуль моцная бура не скалане ўсё, што яе хавае. Апостал Павал пісаў: «Бо абрэзаныя — гэта мы, якія служым Богу духам, і хвалімся ў Хрысце Ісусе, і *ня ў целе маем спадзяванне*» (Філ. 3:3, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ).

Самастойна мы не можам зрабіць нічога, што мае вечную вартасць. Гэта лёгка сказаць, але цяжка закараніць гэтую праўду глыбока ў сэрцы.

# ІСУС НЕ ІШОЎ НА КАМПРАМІС АДНОСНА ПРАЎДЫ, КАБ НЕ ПАКРЫЎДЗІЦЬ ЛЮДЗЕЙ.

Ваша кніга «Прынада шатана» адкрыла мне вочы. Мы з мужам служым разам, і я мела ўражанне, што ў мяне з Госпадам было ўсё ў парадку. «Прынада шатана» паказала мне, што мая крыўда пятнаццацігадовай даўніны на маю цётку магла каштаваць мне ўсяго. Нас, хрысціян, заўсёды вучаць прабачаць, але я ніколі не прыкладала гэта да сэрца, пакуль ваша вестка не адкрыла гэты боль у маім мінулым.

—Р. М., ТЭНЭСІ

# 9

# КАМЕНЬ СПАТЫКНЕННЯ

*Вось, Я кладу ў Сыёне кутні Камень, выбраны, каштоўны, і хто верыць у Яго, ня будзе асаромлены. Дык Ён для вас, якія вераць, — каштоўнасць, а для тых, якія ня вераць, — камень, які адкінулі будаўнікі, які стаўся галавой вугла, камень спатыкнення і скала згаршэння для тых, якія спатыкаюцца аб слова, не скараючыся, дзеля чаго і пакінутыя.*

**—1 ПЯТРА 2:6 – 8**

Сёння значэнне гэтага слова стала вельмі слабым. У вачах многіх людзей яно значыць усяго толькі прызнанне пэўнага факту. Шмат для каго яно не звязана з паслухмянасцю. Але ўрывак вышэй дэманструе супрацьлегласць словаў *«верыць»* і «*не скарацца*».

Пісанне заклікае «каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, але меў жыццё вечнае» (Ян 3:16). Вынікам таго, як мы разумеем слова «верыць», становіцца тое, што многія лічаць: ім трэба проста *верыць*, што Ісус жыў і памёр на Галгофе, і тады ў іх будзе ўсё ў парадку з Богам. Калі б гэта было адзіным патрабаваннем, бесы таксама мелі б добрыя адносіны з Ім. У Пісанні мы чытаем: «Ты верыш, што Бог адзін, — добра робіш. І *дэманы вераць* і дрыжаць» (Якуба 2:19, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ). Але збаўлення для іх няма.

Слова *«верыць»* у Пісанні мае большае значэнне, чым прызнанне пэўнага факту або проста разумовая згода з ім. Застаючыся вернымі кантэксту верша вышэй, мы можам сказаць, што галоўны элемент веры – паслухмянасць. Мы маглі б прачытаць гэта так: «Такім чынам, для тых, хто слухаецца, Ён каштоўны; а для *непакорлівых* «камень, які адкінулі будаўнікі, стаў вуглавым каменем» і *“каменем спатыкненьня і спакусы”*».

Лёгка слухацца, калі ведаеш характар і любоў таго, каму падпарадкоўваешся. Любоў – гэта галоўнае ў нашых адносінах з Госпадам. Не любоў да прынцыпаў або вучэнняў, але любоў да Асобы Ісуса Хрыста. Калі гэтая любоў не ўсталявалася ў нас, мы ўспрымальныя да крыўд і спатыкненняў.

Ізраільцяне, якіх Госпад паклікаў быць будаўнікамі, адкінулі галоўны кутні камень Бога – Ісуса. Яны любілі вучэнне Старога Запавету і былі задаволены сваімі інтэрпрэтацыямі, бо імі можна было карыстацца ў сваіх інтарэсах і для кіравання іншымі. З іншага боку, Ісус кінуў выклік законніцтву, якое яны так любілі. Ён прасіў іх: «Дасьледуйце Пісаньні, бо вы думаеце праз іх мець жыцьцё вечнае, і яны сьведчаць пра Мяне» (Ян 5:39).

Ізральцяне не маглі зразумець, што Бог з самага пачатку хацеў мець сыноў і дачок, з якімі Ён мог бы мець адносіны. Яны хацелі кіраваць і панаваць. Закон у іх вачах стаў вышэйшы за адносіны. Ізраільцяне адмаўляліся ад таго, што ім давалася бясплатна, і хацелі гэта зарабіць. Такім чынам, бясплатны дар Божы, Ісус Хрыстос, іх надзея на жыццё і збаўленне, стаў для іх «каменем спатыкненьня і скалой згаршэньня».

Падымаючы на руках немаўлятка Ісуса ў храме, Сымон прарочыў: «Вось, ляжыць Гэты на падзеньне і паўстаньне многіх у Ізраілі» (Лк. 2: 34). Звярніце ўвагу: *на падзенне і паўстанне*. Той, Хто быў пасланы прынесці мір свету, прынёс меч раздзялення тым, да каго быў пасланы (Мцв. 10:34) і жыццё тым, хто быў ахвярамі будаўнікоў (тагачасных служыцеляў).

## ІСУС І СПАКУСЫ

У нядзельнай школе Ісуса часта прадстаўляюць пастухом, які нясе на плячах згубленую авечку ў статак. Або тым, хто абдымае маленькіх дзяцей, дабраслаўляючы іх, усміхаецца і кажа: «Я люблю цябе». Усе гэтыя вобразы праўдзівыя, але яны не даюць поўнай карціны.

Гэты ж Ісус таксама асуджаў фарысеяў за іх самаправеднасць: «Зьмеі, спараджэньні яхідны, як уцячэце вы ад асуджэньня ў геенну?» (Мцв. 23:33). Ён перавярнуў сталы мянялаў у храме і выгнаў іх (Ян 2:13 – 22). Чалавеку, які перш, чым пайсці за Ісусам, хацеў пахаваць бацьку, Ісус сказаў: «Пакінь мёртвым хаваць мёртвых сваіх, а ты ідзі і абвяшчай Валадарства Божае» (Лк. 9:59 – 60). І гэта яшчэ не ўсё. Уважлівы погляд на служэнне Ісуса паказвае Чалавека, які многіх пакрыўдзіў падчас служэння.

Давайце паглядзім на некалькі прыкладаў.

***Ісус пакрыўдзіў фарысеяў.***

Ісус шмат разоў сутыкаўся з гэтымі лідарамі і крыўдзіў іх. Яны паслалі Яго на крыж, бо пакрыўдзіліся і ненавідзелі Яго. Але Ісус палюбіў іх дастаткова, каб сказаць праўду: «Крывадушнікі! Добра прарочыў пра вас Ісая, кажучы: «Людзі гэтыя набліжаюцца да Мяне вуснамі сваімі і шануюць Мяне вуснамі сваімі, а сэрца іхняе далёка ад Мяне». І дарэмна пакланяюцца Мне» (Мцв. 15:7 – 9). Гэтая заява іх пакрыўдзіла.

Звярніце ўвагу на тое, што вучні спыталі ў Ісуса адразу пасля гэтага:

> Тады вучні Ягоныя, падыйшоўшы, казалі Яму: «Ці ведаеш, што фарысэі, пачуўшы слова гэтае, *згоршыліся*?»
>
> – МАЦВЕЯ 15:12, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

А вось Яго адказ:

> Усякая расліна, якую не пасадзіў Айцец Мой Нябесны, будзе выкарчавана. Пакіньце іх; яны — сьляпыя павадыры сьляпых; а калі сьляпы вядзе сьляпога, абодва ўваляцца ў яму.
>
> —МАЦВЕЯ 15:13 – 14

Ісус паказаў, што на самай справе крыўды ачысцяць тых, хто не пасаджаны Яго Айцом. Некаторыя людзі могуць далучацца да цэркваў або каманд служэнняў, але не быць пасланымі Богам. Крыўда, якая прыходзіць, калі прапаведуецца праўда, паказвае іх сапраўдныя матывы і прымушае пакінуць гэтае месца.

Наведваючы іншыя цэрквы, я быў сведкам многіх выпадкаў, калі пастары смуткуюць па супрацоўніках або членах царквы, якія сышлі. У большасці выпадкаў тыя людзі былі засмучаны, бо прапаведавалася праўда, якая супярэчыла іх ладу жыцця. Затым яны сталі крытычна ставіцца да кожнага аспекту царквы і сышлі.

Калі б пастары трымаліся за кожнага, хто прыходзіць у царкву, у рэшце рэшт ім давялося б пайсці на кампраміс з праўдай. «Калі вы прапаведуеце праўду, — кажу я ім, — вы пакрыўдзіце людзей, і яны пакінуць сваё месца і сыдуць. Не сумуйце па іх, але працягвайце карміць і клапаціцца пра тых, каго вам паслаў Бог».

Некаторыя кіраўнікі пазбягаюць канфрантацыі, баючыся страціць людзей. Некаторыя асабліва вагаюцца: тыя, з кім яны не згодны, шмат ахвяруюць або маюць уплыў у царкве ці грамадстве. Іншыя баяцца параніць пачуцці тых, з кім яны ўжо доўга знаёмыя. У выніку пастары губляюць дадзеную Богам уладу абараняць і пасвіць дадзеных ім авечак.

Калі я ўпершыню ўступіў на пастарскую пасаду, адзін мудры чалавек папярэдзіў мяне: «Заставайся пры сваёй уладзе, інакш нехта іншы адбярэ яе ў цябе і выкарыстае супраць цябе».

Самуэль быў Божым чалавекам, які ні з кім не пайшоў на кампраміс, нават з царом. Калі Саўл не паслухаўся Бога, Госпад сказаў Самуэлю супрацьстаць цару. Самуэль так і зрабіў. На жаль, Саўл не адказаў на слова Госпада сапраўдным пакаяннем. Яго больш турбавала тое, як ён выглядаў у вачах іншых людзей. Калі Самуэль адыходзіў ад яго, Саўл схапіўся за яго вопратку і адарваў крысо. Самуэль у адказ спустошыў яго словамі: «Аддзярэ ГОСПАД валадарства Ізраіля ад цябе сёньня» (1 Сам. 15:28).

Самуэль не гэтага хацеў для Саўла. Ён смуткаваў праз яго, бо памазаў Саўла на цара, навучыў яго кіраваць і правёў яго каранацыю. Самуэль быў асабістым сябрам Саўла. Але паслухайце, як Бог адрэагаваў на смутак Самуэля па Саўле: «Дакуль ты будзеш сумаваць дзеля Саўла, якога *Я адкінуў*, каб ён ня быў валадаром над Ізраілем. *Напоўні рог свой алеем і* ідзі. Я пасылаю цябе...» (1 Сам. 16:1, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ).

Бог казаў: каб Самуэль мог і далей рухацца ў свежым алеі або памазанні, трэба было зразумець, што Божая любоў і суд дасканалыя. У Самуэля не было б свежага алею, калі б ён вярнуўся да Саўла пасля таго, як Бог таго адкінуў. Калі б прарок гараваў далей, ён не мог бы рухацца наперад. Урэшце, алей памазання высыхае ў жыцці пастараў, якія смуткуюць і аплакваюць людзей, што пакідаюць царкву, і ў жыцці тых, што адмаўляюцца супрацьстаяць членам царквы, бо тыя прыходзяцца ім сябрамі. Некаторыя служэнні паміраюць, а іншыя проста імітуюць жыццё. Неўсвядомлена яны паставілі адносіны з людзьмі вышэй за адносіны з Богам.

У Бібліі не запісана, што Ісус рэагаваў на тое, што некаторыя людзі Яго пакідалі. Адзінай асалодай для Ісуса было выконваць волю Айца. Робячы гэта, Ён прынёс карысць найбольшай колькасці людзей.

Я ніколі не забуду час, калі прапаведаваў у адной напоўненай Духам царкве. Мы ездзілі па розных цэрквах ужо каля года. У першую нядзелю раніцай я прапаведаваў простае пасланне пакаяння і вяртання да першай любові. Я адчуваў супраціўленне, але ведаў, што гэта паведамленне, якое я павінен быў прынесці.

Пасля служэння пастар сказаў: «Бог паказваў мне тое, што вы прапаведавалі сёння, але я думаў, мая царква не гатова да гэтага».

Мая жонка адчула памкненне ад Святога Духа і спытала яго: «Хто пастар царквы: вы ці Ісус?»

Пастар апусціў галаву. «Гэта менавіта тое, што Госпад адкрыў мне месяц таму. Ён сказаў мне, што ведае, з чым могуць справіцца людзі». Пастар патлумачыў, што траціну царквы складаюць «кансерватары», якія не хочуць ніякіх зменаў ні ў парадку служэння, ні ў музыцы, ні ў пропаведзі. Мы заклікалі яго быць моцным і слухацца Госпада.

Мы правялі ў царкве яшчэ чатыры набажэнствы, кожнае з якіх было ўсё больш складаным. Калі мы пакінулі горад, я адчуваў вялізны цяжар унутры. Я не мог зразумець, чаму станавілася ўсё цяжэй і непрыемней. Звычайна, калі я выходжу з царквы, радасць напаўняе маё сэрца. Я не ведаў, што не так.

Калі я нарэшце застаўся сам–насам з Госпадам, я спытаў: «Ойча, што я зрабіў няправільна? Навошта мне гэты цяжар у душы? Хіба я ўзурпаваў уладу пастара?»

Госпад проста сказаў: «Абтрасі пыл з ног тваіх» (глядзі Лукі 9:5).

Я быў шакаваны, працягваў маліцца і запытвацца ў Яго, толькі каб зноў пачуць тыя самыя словы: «Абтрасі пыл з ног тваіх».

Нарэшце я паслухаўся. Калі я ставіў на падлогу другі чаравік, цяжар знік, і маё сэрца напоўнілася радасцю. Я зноў са здзіўленнем сказаў: «Госпад, але ж яны не нападалі на мяне і не выкінулі мяне з горада. Навошта трэба было так рабіць?»

Бог паказаў мне, што кіраўніцтва і многія з прыхаджанаў адхілілі Яго слова да іх.

«Дай ім больш часу, Госпадзе», — прасіў я.

«Калі б Я даў ім яшчэ пяцьдзясят гадоў, яны б не змяніліся. Іх сэрцы зацвярдзелі».

Я ведаў, што гэты пастар вырашыў не падпарадкоўвацца Богу, а захаваць мір шляхам кампрамісу. Яго рог не быў напоўнены свежым алеем. Была форма, але не было сутнасці. Іншымі словамі, пастар выглядаў напоўненым Духам, але не меў сілы і прысутнасці Бога. Пазней я пачуў, што ён сышоў з пасады пастара, а ў царкве засталося зусім мала людзей.

Ісус не прымае кантролю ад іншых. Ён казаў бы праўду, нават калі б гэта азначала супрацьстаянне і крыўду. Калі вы хочаце ўхвалення ад людзей, Божае памазанне не можа сысці на вас. Вы павінны мець мэту прамаўляць Слова Божае і выконваць волю Бога, нават рызыкуючы пакрыўдзіць іншых.

***Ісус пакрыўдзіў жыхароў роднага горада.***

Ісус прыйшоў у свой горад, каб служыць там. Але Ён не змог даць свабоду і аздараўленне, якія прынёс многім іншым. Паглядзіце, што яны сказалі:

> Ці ж Ён ня сын цесьляра? Ці не Ягоная маці завецца Марыя, і браты Ягоныя — Якуб, і Ёсія, і Сымон, і Юда? І сёстры Ягоныя ці ж ня ўсе сярод нас? Адкуль жа ў Яго ўсё гэтае?» І горшыліся яны праз Яго. А Ісус сказаў ім: «Няма прарока без пашаны, хіба толькі ў бацькаўшчыне сваёй і ў доме сваім».
>
> —МАЦВЕЯ 13:55 – 57, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Ці чуеце вы, як гэтыя мужчыны і жанчыны з Назарэта кажуць: «Кім Ён сябе лічыць, што вучыць нас з уладай? Мы ведаем Яго. Ён тут вырас. Мы Яго старэйшыны. Ён усяго толькі сын цесляра, нават не мае адпаведнай адукацыі».

Зноў жа, Ісус не пайшоў на кампраміс з праўдай, каб утрымаць іх ад крыўды. Гараджане былі настолькі раззлаваныя,

што спрабавалі Яго забіць, скінуўшы са скалы (Лк 4:28 – 30). Нават калі  жыццё было ў небяспецы, Ісус казаў праўду. Як нам сёння патрэбны такія мужчыны і жанчыны!

***Ісус пакрыўдзіў членаў Сваёй сям'і.***

Ісус пакрыўдзіў нават членаў уласнай сям'і. Ім не падабаўся ціск з–за таго, што рабіў Ісус. Ім было цяжка паверыць, што Ісус паводзіць сябе такім чынам. Давайце паглядзім:

> І, пачуўшы [гэта], сваякі Ягоныя пайшлі ўзяць Яго, бо казалі, што Ён зьдзівачэў... І прыходзяць браты Ягоныя і маці Ягоная, і, стоячы вонкі, паслалі да Яго клікаць Яго. І сядзеў кругом Яго натоўп, і сказалі Яму: «Вось, маці Твая і браты Твае вонкі, яны шукаюць Цябе». І, адказваючы ім, гаворыць: «Хто маці Мая і браты Мае?» І, агледзеўшы наўкола тых, што каля Яго сядзелі, кажа: «Вось маці Мая і браты Мае! Бо хто выконвае волю Божую, той Мне брат, і сястра, і маці».
>
> — МАРКА 3:21, 31 – 35

Сям'я Ісуса думала, што Ён здзівачэў. Звярніце ўвагу: Святое Пісанне кажа, як сям'я Ісуса выйшла, каб забраць Яго. Марк сведчыць, што гэта былі маці і браты Ісуса, якія пазней бачылі, як Ён прапаведуе ў чыімсьці доме. Нават у Евангеллі паводле Яна сказана: «Бо і браты Ягоныя таксама ня верылі ў Яго» (Ян 7:5).

Многія не разумеюць, што Ісуса адкінулі тыя, хто быў побач з Ім. Але Ён шукаў не прыняцця ад сваякоў. Ён не згаджаўся падпарадкавацца іх жаданням. Ён выконваў план Айца незалежна ад іх ухвалення.

Я бачыў шмат людзей, асабліва сямейных пар, якія не ішлі за Ісусам, баючыся пакрыўдзіць сваіх партнёраў або членаў сям'і. У выніку яны адступалі або ніколі не раскрывалі поўнага патэнцыялу паклікання.

Калі я нарадзіўся звыш, усе члены маёй сям'і былі

каталікамі і не падзялялі захаплення ад маёй толькі што здабытай веры. Маці была асабліва незадаволена маім рашэннем пакінуць веру, у якой мяне выхоўвала. Вядома, ёсць каштоўныя каталікі, якія любяць Бога, але я ведаў, што Бог кліча мяне выйсці з гэтай царквы.

Другі ўдар быў, калі я абвясціў пра сваё рашэнне пачаць служэнне. Я толькі што атрымаў дыплом інжынера–механіка ва ўніверсітэце, і бацькі ўскладалі на мяне вялікія надзеі. Я ведаў, чаго хоча ад мяне Госпад, і ведаў, што гэта пакрыўдзіць блізкіх. Няёмкая сітуацыя цягнулася гадамі. Было шмат непаразуменняў. Але я вырашыў: як бы яны ні раззлаваліся, я пайду за Ісусам.

Напачатку я спрабаваў пераканаць іх Евангеллем і сказаў, што яны не выратуюцца толькі наведваннем імшы. Я давёў іх да мяжы. Гэта не было мудра. Тады Бог сказаў мне жыць хрысціянскім жыццём перад імі і дазволіць ім убачыць мае добрыя справы. Я не пайшоў на кампраміс, каб дагадзіць сваякам.

Сёння мае бацькі вельмі падтрымліваюць мяне, і мой дзед, які спрачаўся са мной больш за астатніх, атрымаў збаўленне ва ўзросце васьмідзесяці дзевяці гадоў, за два гады да смерці.

Маці і браты Ісуса маглі думаць, што Ён з’ехаў з глузду. Але праз Яго паслухмянасць Айцу ўсе яны былі збаўленыя і апынуліся ў святліцы ў дзень Пяцідзясятніцы. Яго брат Якуб стаў апосталам і кіраўніком царквы ў Ерусаліме.

Калі мы ідзём на кампраміс з тым, што кажа нам Бог, каб дагадзіць членам нашай сям’і, мы страцім свежы алей і будзем перашкаджаць іх вызваленню.

***Ісус пакрыўдзіў Сваіх вучняў.***

У папярэднім раздзеле мы падрабязна абмяркоўвалі пазіцыю вучняў, калі Ісус іх пакрыўдзіў. Давайце даследуем гэта яшчэ раз з пункту гледжання Ісуса.

> Многія з вучняў Ягоных, якія чулі гэта, казалі: «Жорсткае гэта слова. Хто можа слухаць яго?» Ісус жа, ведаючы ў Сабе, што вучні Ягоныя наракаюць адносна гэтага, сказаў ім: *«Ці гэта вас згаршае?»* З таго часу многія з вучняў Ягоных пайшлі назад і ўжо не хадзілі з Ім.
>
> —ЯНА 6:60 – 61, 66, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Усё было дастаткова цяжка. Рэлігійныя лідары рыхтавалі Яго смерць. Яго родны горад адмовіўся ад Яго. Яго сям’я лічыла, што ён з’ехаў з глузду. Як быццам гэтага было мала, многія з Яго вучняў сышлі пакрыўджанымі. Але Ісус усё роўна не пайшоў на кампраміс. Ён проста сказаў тым, хто застаўся, што яны таксама вольныя пайсці, калі захочуць.

Адзінае, што мела значэнне для Ісуса, – выканаць план Айца. Нават калі б Ісус застаўся адзін у той дзень, гэта не змяніла б Яго рашэнне. Ён вырашыў слухацца свайго Айца.

***Ісус пакрыўдзіў некаторых са сваіх блізкіх сяброў.***

> Быў жа нейкі хворы Лазар з Бэтаніі, мястэчка Марыі і Марты, сястры ейнай. А Марыя, якой брат Лазар быў хворы, была тая, якая памазала Госпада мірам і абцерла ногі Ягоныя валасамі сваімі. Дык сёстры паслалі да Яго, кажучы: «Госпадзе! Вось той, з кім Ты сябруеш, нядужы».
>
> —ЯНА 11:1 – 3

Ісус любіў Марту, Марыю і Лазара. Яны былі блізкімі сябрамі і праводзілі разам час. Звярніце ўвагу на Яго адказ, калі прыйшла вестка, што Лазар хворы:

> Калі ж пачуў, што той хворы, дык заставаўся два дні ў тым месцы, дзе знаходзіўся.
>
> —ЯНА 11:6

Ісус ведаў праз адкрыццё, што хвароба Лазара прывядзе да смерці. Гэта была вельмі сур’ёзная справа. Але Ён застаўся

там, дзе быў, яшчэ два дні. Калі Ён нарэшце прыйшоў у Бэтанію, Лазар быў ужо мёртвы.

Марта і Марыя сказалі Яму: «Госпадзе! Калі б Ты быў тут, не памёр бы брат мой» (Ян 11:21, 32). Іншымі словамі: «Чаму Ты не прыйшоў адразу? Ты мог яго выратаваць!»

Хутчэй за ўсё, абедзве сястры крыху пакрыўдзіліся. Яны паслалі ганца па Ісуса, а Ісус марудзіў два дні. Ён не адказаў так, як чакалі сёстры: не кінуў усё, але замест гэтага ішоў па кіраўніцтву Святога Духа. Так было лепш для ўсіх. Аднак тады здавалася, што Ісус быў апатычны, як быццам Яму было ўсё роўна.

Вельмі часта прыхаджане кіруюць служыцелямі. Яны думаюць, што служыцелі цэркваў павінны рабіць усё, што т олькі ў іх не папросіш.

Аднойчы сябра рады напоўненай Духам царквы, якая страціла свайго пастара, сказаў мне: «Нам патрэбны пастар, што задаволіць нашы патрэбы. Напрыклад, прыйдзе да мяне а восьмай раніцы выпіць кавы».

Я падумаў: *«Раз так, вы знойдзеце камунікабельнага чалавека, якога зможаце кантраляваць, а не чалавека, якім кіруе Святы Дух».* Пазней я даведаўся, што тая царква за паўтара года змяніла чатырох пастароў.

Мінула паўгады, як я быў моладзевым пастарам у адной царкве. Аднойчы да мяне прыйшоў малады чалавек. «Ты будзеш маім прыяцелем? — спытаў ён. — Мой апошні моладзевы пастар быў маім прыяцелем!»

Ранейшы моладзевы пастар быў вельмі камунікабельным. Яны гулялі ў розныя спартовыя гульні. Я ведаў, пра што прасіў малады чалавек. Па сутнасці, тое самае, што і сябра праўлення хацеў ад свайго пастара.

Я працытаваў яму Мацвея 10:41, дзе Ісус сказаў: «Хто прыймае прарока ў імя прарока, атрымае нагароду прарока; і хто прыймае праведніка ў імя праведніка, атрымае нагароду праведніка».

– У цябе шмат прыяцеляў? — спытаўся я.

– Так, – адказаў ён.

– Але моладзевы пастар у цябе толькі адзін, праўда?

– Так.

– Ты хочаш ўзнагароду моладзевага пастара або ўзнагароду сябра? Бо ад таго, як ты мяне прымеш, залежыць тое, што ты атрымаеш ад Бога.

Ён зразумеў маю думку.

– Я хачу ўзнагароду моладзевага пастара.

Многія служыцелі баяцца не спраўдзіць чаканняў сваіх прыхаджан, і тады прыхаджане пакрыўдзяцца і не будуць іх падтрымліваць. Такія служыцелі ў пастцы страху пакрыўдзіць іншых. Імі кіруе іх уласны народ, а не Бог. У выніку іх цэрквы дасягаюць мала вечных мэтаў.

***Ісус пакрыўдзіў Яна Хрысціцеля.***

Нават Ян Хрысціцель сутыкнуўся са спакусай пакрыўдзіцца на Ісуса.

> І паведамілі Яну вучні ягоныя пра ўсё гэтае. І, паклікаўшы двух з вучняў сваіх, Ян паслаў іх да Ісуса, кажучы: «Ці Ты Той, Які прыходзіць, ці чакаць нам іншага?» А мужы [гэтыя], прыйшоўшы да Яго, сказалі: «Ян Хрысьціцель паслаў нас да Цябе, кажучы: “Ці Ты Той, Які прыходзіць, ці чакаць нам іншага?”»
>
> – ЛУКІ 7:18 – 20

Чакайце, калі ласка. Чаму Ян пытаецца ў Ісуса, ці Ён той, хто прыходзіць, ці ён Месія? Ян падрыхтаваў Яму дарогу і абвясціў пра Яго прыход: «Вось! Ягня Божае, Які бярэ на Сябе грэх сьвету» (Ян 1:29). Таксама Ян Хрысціцель сказаў: «Ён... Той, Які хрысьціць Духам Сьвятым» (верш 33). Ян  нават сказаў: «Яму трэба расьці, а мне — малець» (Ян 3:30). Такім чынам, Ян

Хрысціцель – адзіны чалавек, які ў той час сапраўды ведаў, хто такі Ісус. (Гэта яшчэ не было адкрыта Сымону Пятру.)

Чаму ён пытаецца: «Ісус — гэта Месія, ці нам чакаць іншага?»

Пастаўце сябе на месца Яна. Вы – чалавек на Божай перадавой. Вы служыце мноству людзей. Ваша евангелізацыйнае служэнне шырока абмяркоўваецца ў краіне. Вы пражылі жыццё самавырачэння, нават не ажаніліся, каб максімальна выкарыстаць увесь патэнцыял паклікання. Вы жылі ў пустыні, елі саранчу і дзікі мёд, часта пасціліся. Таксама супрацьстаялі фарысеям, і вас абвінавацілі ў апантанасці дэманамі. Усё вашае жыццё – гэта падрыхтоўка шляху для прыходу Месіі.

Цяпер вы ў турме, і вы знаходзіцеся там даволі доўга. Да вас прыходзіць мала людзей: вы іх падрыхтавалі, і яны звярнулі ўвагу на Ісуса з Назарэта. Нават вашы ўласныя вучні далучыліся да гэтага Чалавека. Толькі некалькі вучняў засталіся вам служыць. Калі яны прыходзяць да вас, то расказваюць, як гэты Чалавек і Яго вучні жывуць зусім іншым жыццём – ядуць і п’юць з мытнікамі і грэшнікамі, парушаюць суботу і нават не посцяць.

Вы кажаце сабе: «Я бачыў, як Дух сыходзіў на Яго ў выглядзе голуба, але ці так паводзіць сябе Месія?»

Спакуса пакрыўдзіцца тым большая, чым даўжэй вы ў турме. «Гэты Чалавек, для якога я ўсё жыццё рыхтаваў шлях, нават не прыйшоў наведаць мяне ў турме! Як гэта так? Калі Ён Месія, чаму Ён не вызваляе мяне з турмы? Я не зрабіў нічога кепскага».

Такім чынам, вы пасылаеце двух верных вучняў да Ісуса: «Ты Той, Які прыходзіць, ці чакаць нам іншага?»

Давайце паглядзім на адказ Ісуса:

> У гэтую гадзіну Ён многіх аздаравіў ад хваробаў і немачаў, і ад злых духаў, і многім сьляпым вярнуў зрок. І, адказваючы, Ісус сказаў ім: «Пайдзіце, паведаміце Яну, што вы бачылі і чулі, што сьляпыя бачаць, кульгавыя ходзяць, пракажоныя ачышчаюцца, глухія

> чуюць, мёртвыя ўваскрасаюць, убогім дабравесьціцца.
> І шчасьлівы той, хто ня згоршыцца праз Мяне.
>
> — ЛУКІ 7:21 – 23, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Адказ Ісуса ўзяты з прароцтваў. Ён цытуе кнігу Ісаі, добра вядомую Яну. Урыўкі з Ісаі 29:18, 35:4–6 і 61:1 адносяцца да ўсяго, што назіралі вучні Яна, чакаючы сустрэчы з Ісусам. Цытаты сведчылі пра Яго як пра Месію. Але Ісус не спыняецца і дадае: «І шчаслівы той, хто не згоршыцца праз Мяне».

Ён казаў: «Ян, я ведаю, ты не разумееш усяго, што адбываецца з табой, і некаторых Маіх шляхоў. Аднак не крыўдзіся на Мяне, што Я дзейнічаю не так, як вы чакалі». Ісус заклікаў Яна не судзіць паводле ўласнага разумення Божых шляхоў у мінулым жыцці і служэнні. Ян не ведаў поўнай карціны або задумы Бога, як і мы не ведаем усёй карціны сёння. Ісус падбадзёрваў яго, кажучы: «Ты выканаў тое, што было загадана. Твая ўзнагарода будзе вялікая. Толькі не крыўдзіся на Мяне зараз!»

## КРЫЎДА БЕЗ ВЫБАЧЭННЯЎ

Нават калі вы, як Ян, добра ведаеце шляхі Божыя, у вас усё роўна можа быць нагода пакрыўдзіцца на Ісуса. Калі вы сапраўды любіце Яго і верыце ў Яго, вы будзеце імкнуцца не мець крыўды, усведамляючы, што Яго шляхі заўсёды вышэйшыя за вашы.

Да таго ж, калі вы збіраецеся падпарадкоўвацца Духу Божаму, людзі могуць крыўдзіцца на вас. У Яна 3:8 Ісус сказаў: «Дух дыхае, дзе хоча, і голас Яго чуеш, але ня ведаеш, адкуль прыходзіць і куды адыходзіць; гэтак і ўсякі, народжаны з Духа».

Некаторыя не зразумеюць вас, калі вы будзеце рухацца ў Духу. Не дазваляйце іх непрыемнай рэакцыі ўтрымаць вас ад праўды, якую вы разумееце ў глыбіні душы. Не спыняйце плыні Духа дзеля жаданняў людзей. Пётр добра падсумоўвае гэта:

> Дык як Хрыстос цярпеў за нас целам, і вы ўзбройцеся такой думкаю, што той, хто церпіць целам, перастае грашыць, каб рэшту часу ў целе жыць не паводле чалавечых пажаданьняў, але паводле волі Божае.
>
> —1 ПЯТРА 4:1 – 2

Калі вы жывяце па Божай волі, вы не будзеце выконваць жаданні людзей. У выніку вы будзеце пакутаваць целам. Ісусу больш за ўсё супрацівіліся рэлігійныя лідары. Рэлігійныя людзі вераць, што Бог дзейнічае толькі ў межах іх разумення і толькі яны разумеюць Бога. Калі Настаўнік, кіруючыся Духам, пакрыўдзіў рэлігійных людзей дзве тысячы гадоў таму, тыя, хто ідуць за Ім, напэўна пакрыўдзяць іх.

Добры прыклад – пераслед апостала Паўла. Некаторыя людзі ў Галатыі памылкова чулі: Павал паставіў пад пагрозу Евангелле крыжа, стаўшы на бок рэлігійных лідараў, якія казалі, што абразанне неабходна для збаўлення. Але Павал выправіў іх.

«Паглядзіце на мяне, — сказаў ён. — Мяне з усіх бакоў пераследуюць рэлігійныя лідары. Ці рабілі б яны гэта са мной, калі б я прапаведаваў абразанне? Тое, што крыж — гэта адзіны шлях да збаўлення, абражае людзей, але гэта праўда. І я не збіраюся прапаведаваць што–небудзь яшчэ!» (глядзі Галатам 5:11)

Калі хтосьці аспрэчвае праўдзівасць Евангелля, самы час крыўдзіць і не прасіць прабачэння. Мы павінны вызначыць у нашых сэрцах, што будзем падпарадкоўвацца Духу Божаму, колькі б гэта ні каштавала. Тады нам не трэба будзе рабіць выбар пад прымусам. Выбар ужо будзе зроблены.

**ІСУС АБРАЗІЎ НЕКАТОРЫХ ЛЮДЗЕЙ, ПАСЛУХАЎШЫСЯ СВАЙГО АЙЦА, АЛЕ ЁН НІКОЛІ НЕ КРЫЎДЗІЎ ІНШЫХ ДЗЕЛЯ ТАГО, КАБ АДСТОЙВАЦЬ СВАЕ ПРАВЫ.**

Нядаўна я прачытаў вашу кнігу *«Прынада шатана»* і проста хацеў сказаць вам, што яна дала мне свабоду ў той сферы жыцця, у якой я ўжо не спадзяваўся яе мець. Я проста хацеў сказаць дзякуй за напісанне гэтай кнігі, бо яна змяніла маё жыццё!

—К. Р., ТЭНЭСІ

## 10

# КАБ НАМ НЕ СПАКУСІЦЬ ІХ

*Дык ня будзем больш судзіць адзін аднаго, але судзіце лепш пра тое, каб як не пакласьці перад братам спатыкненьня ці згаршэньня.*

**— РЫМЛЯНАЎ 14:13**

Мы толькі што абмеркавалі, як Ісус многіх пакрыўдзіў падчас Свайго служэння. Аказваецца, амаль паўсюль, дзе Ён быў, людзі крыўдзіліся. А зараз я хачу паглядзець на адваротны бок гэтай з'явы.

Ісус і Яго вучні толькі што вярнуліся ў Капернаум. Яны завяршылі служэнне і прыйшлі на кароткі, але вельмі неабходны адпачынак.

Гэтае месца можна лічыць базай служэння Ісуса.

Пакуль яны былі там, да Сымона Пятра падышоў чыноўнік, адказны за збор падатку на святыню.

«Настаўнік ваш ці ня дасьць дыдрахмы?» (Мцв. 17:24)

Пётр адказаў «так» і вярнуўся абмеркаваць гэта з Ісусам.

Ісус прадбачыў просьбу мытніка, таму спытаўся ў Сымона Пятра: «Як ты думаеш, Сымоне, валадары зямныя з каго бяруць мыта ці даніну, ці са сваіх сыноў, ці з чужых?»

Пётар кажа Яму: «З чужых».

«Значыцца, сыны вольныя» (Мцв. 17:25–26).

Ісус звяртае ўвагу Пятра на тое, што «сыны свабодныя». З сыноў не збіраюць падаткі, бо яны карыстаюцца перавагамі сабраных падаткаў. Сыны жывуць у палацы, ядуць за царскім сталом, носяць царскае адзенне – усё гэта забяспечваецца падаткамі. Сыны жывуць бясплатна і маюць забеспячэнне з падаткаў.

Узгаданы чыноўнік збіраў падатак на храм. Але хто быў царом або ўладальнікам храма? У гонар каго ён пабудаваны? У гонар Бога Айца. Пётр толькі што атрымаў адкрыццё ад Бога, што Ісус быў «Хрыстос, *Сын* Бога жывога».

На гэтай падставе Ісус пытаўся ў Пятра: «Калі Я Сын Таго, Каму належыць храм, дык хіба Я не вольны ад выплаты храмавага падатку?» Вядома, вызвалены. Яму было б справядліва не плаціць падатак. Але паглядзіце, што Ісус кажа Сымону Пятру:

> Але, *каб нам не згаршаць іх*, пайшоўшы на мора, кінь вуду, і першую рыбу, якая пападзецца, вазьмі, і, расчыніўшы ёй рот, знойдзеш статыр; узяўшы яго, аддай ім за Мяне і за сябе.
>
> — МАЦВЕЯ 17:27, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Ісус толькі што даказаў Сваю свабоду. Але, каб не пакрыўдзіць, сказаў Пятру: «Заплацім!» Гэта было яшчэ адным пацверджаннем Яго свабоды: Ён загадаў Пятру пайсці лавіць

рыбу і ўзяць першую, што пападзецца; у яе роце будуць грошы. Бог Айцец даў грошы нават на падатак.

Ісус – Госпад усёй зямлі. Ён Сын Божы. Зямля і ўсё, што на ёй, створаны Ім і падпарадкоўваюцца Яму. Такім чынам, Ён ведаў, што грошы будуць у роце рыбы. Яму не трэба было працаваць за гэтыя грошы, бо Ён быў Сынам. І ўсё ж Ён палічыў за лепшае заплаціць падатак і нікога не крыўдзіць.

Хіба гэта той самы Ісус, якога мы бачылі ў мінулым раздзеле? Той, які крыўдзіць людзей і не выбачаецца? Ён даказаў, што вызвалены ад храмавага падатку, але сказаў: «Каб нам не пакрыўдзіць іх, ідзі і заплаці!» Здаецца, тут нейкая неадпаведнасць, праўда? Адказ у наступным вершы.

> У тую гадзіну падыйшлі вучні да Ісуса, кажучы: «Дык хто большы ў Валадарстве Нябесным?» І, паклікаўшы дзіцятка, Ісус паставіў яго пасярод іх і сказаў: «Сапраўды кажу вам: калі не навернецеся і ня станецеся, як дзеці, ня ўвойдзеце ў Валадарства Нябеснае. Дык хто панізіць сябе, як гэтае дзіця, той большы ў Валадарстве Нябесным».
>
> — МАЦВЕЯ 18:1 – 4

Вось ключавая фраза: «Той, хто панізіць сябе». Крыху пазней Ісус узмацніў яе, кажучы:

> А ў вас ня гэтак мае быць, але хто хоча між вамі стацца большым, няхай будзе служыцелем вашым, …як і Сын Чалавечы не прыйшоў, каб Яму служылі, але каб паслужыць і аддаць душу Сваю на адкупленьне многіх.
>
> — МАЦВЕЯ 20:26 – 28

Нішто сабе! Вось гэта заява! Ён прыйшоў не для таго, каб Яму служылі, але каб паслужыць. Ісус быў Сынам. Ён быў вольны і нікому нічога не быў вінны. Ён не падпарадкоўваўся людзям.

Тым не менш, Ён вырашыў выкарыстаць Сваю свабоду для служэння.

## ВЫЗВАЛЕНЫ, КАБ СЛУЖЫЦЬ

Новы Запавет заклікае нас, як сыноў Божых, пераймаць нашага Брата, мець такое ж стаўленне, якое мы бачым у Ісуса.

> Бо вы да свабоды пакліканыя, браты. Толькі каб свабода ня [сталася] нагодай для [пажаданьняў] цела, але праз любоў служыце адзін аднаму.
>
> —ГАЛЯТАЎ 5:13

Іншае слова для свабоды — *прывілей*. Мы, як дзеці жывога Бога, не павінны выкарыстоўваць сваю свабоду, або прывілеі, каб служыць сабе. Свабоду трэба выкарыстоўваць, каб служыць іншым. У служэнні ёсць свабода, а ў рабстве — няволя. Раб – той, хто *павінен* служыць, а слуга – той, хто *жыве*, каб служыць. Давайце паглядзім на некаторыя адрозненні паміж рабом і слугой:

- *Раб* павінен — *слуга* бярэцца за справу.
- *Раб* выконвае мінімальныя патрабаванні – *слуга* дасягае максімальнага патэнцыялу.
- *Раб* праходзіць адну мілю — *слуга* праходзіць лішнюю мілю.
- *Раб* адчувае сябе абрабаваным – *слуга* дае.
- *Раб* звязаны – *слуга* вольны.
- *Раб* змагаецца за свае правы — *слуга* адмаўляецца ад сваіх правоў.

Я бачыў, як многія хрысціяне служаць з крыўдай – неахвотна ахвяруюць і скардзяцца, плацячы падаткі. Яны ўсё яшчэ жывуць як рабы закону, ад якога былі вызваленыя, бо застаюцца рабамі ў сэрцах.

Большую трывогу выклікае тое, што гэты закон пабудаваны на аснове ўрыўкаў з Новага Запавету. Але такія хрысціяне не маюць «духу», у якім Ісус даў Свае загады, і не зразумелі, што іх вызвалілі служыць. Такім чынам, яны працягваюць змагацца за сваю карысць, а не за карысць іншых.

Павал дае яскравы прыклад супрацьстаяння такому стаўленню ў лістах да Рымлянаў і Карынцянаў. Для свабоды гэтых вернікаў была выклікам ежа. Павал пачаў з таго, што заклікаў іх: «А таго, хто слабы ў веры, прыймайце не на [тое, каб] спрачацца пра погляды. Бо нехта верыць, што [можна] есьці ўсё, а слабы есьць гародніну» (Рым. 14:1 – 2).

Ісус растлумачыў: нас апаганьвае не тое, што ўваходзіць у вусны, а тое, што выходзіць з вуснаў. Такім чынам Ён ачысціў для верніка усякую ежу (Марка 7:18 – 19).

Павал сказаў, што некаторыя вернікі ўсё яшчэ былі слабымі ў веры і не маглі есці мяса, баючыся з'есці ахвяру, прынесеную ідалам. Хоць Ісус выказваўся адносна гэтай праблемы, некаторыя людзі ўсё яшчэ не маглі есці мяса з чыстым сумленнем.

> Дык адносна ежы, ахвяраванай ідалам, мы ведаем, што ідал у свеце — нішто ... але ў нас адзін Бог Айцец, з Якога ўсё, і мы для Яго; і адзін Госпад Ісус Хрыстос, праз Якога ўсё, і мы праз Яго. Але не ў–ва ўсіх такое веданьне; некаторыя і дагэтуль з сумленьнем, [якое прызнае] ідалаў, і ядуць [ахвяраванае ідалам] як ахвяры ідалам, і слабое сумленьне іхняе апаганьваецца.
>
> —1 КАРЫНЦЯНАЎ 8:4, 6 – 7

У гэтых цэрквах хрысціяне з больш моцнай верай елі мяса сумніўнага паходжання перад слабейшымі святымі. Гэта выклікала праблемы, хоць Ісус і назваў такую ежу чыстай. Слабейшыя не маглі забыцца пра мяса на ахвярніку ідала. Больш моцныя ў веры святыя ведалі: ідал – нішто, і не адчувалі згрызот сумлення, калі елі.

Але здаецца, яны былі больш занепакоеныя захаваннем сваіх правоў паводле Новага Запавету, чым тым, каб не пакрыўдзіць братоў. Самі таго не разумеючы, яны паставілі камень спатыкнення на шляху слабейшых. Такога стаўлення няма ў сэрцы слугі. Паглядзіце, як Павал звяртаецца да іх:

> Дык ня будзем больш судзіць адзін аднаго, але судзіце лепш пра тое, каб як не пакласьці перад братам спатыкненьня ці згаршэньня... . Бо Валадарства Божае — гэта ня ежа і пітво, але праведнасьць, і супакой, і радасьць у Духу Сьвятым.
>
> — РЫМЛЯНАЎ 14:13, 17

Ён казаў: «Давайце ўспомнім, што такое Валадарства. Гэта праведнасць, мір і радасць у Святым Духу». Новыя вернікі не маглі карыстацца ўсімі гэтымі перавагамі. Больш моцныя вернікі выкарыстоўвалі сваю свабоду не для служэння, а як платформу для сваіх «правоў». Яны ведалі пра сваю новазапаветную свабоду. Але веды без любові разбураюць.

У іх не было сэрца Ісуса ў гэтай справе. Ісус растлумачыў Пятру і астатнім вучням Свае права адносна храмавага падатку, каб паказаць, наколькі важна аддаваць жыццё дзеля служэння. Ён ніколі не хацеў, каб свабода дазваляла патрабаваць захавання нашых правоў і прымушаць іншых крыўдзіцца і спатыкацца.

Павал даў гэтае папярэджанне тым, хто шанаваў свае правы ў Хрысце, не маючы Яго сэрца слугі.

> І праз тваё веданьне загіне нядужы брат, за якога памёр Хрыстос. А гэтак грэшачы супраць братоў і б’ючы па слабым сумленьні іхнім, вы грашыцё супраць Хрыста.
>
> —1 КАРЫНЦЯНАЎ 8:11 – 12

Мы можам выкарыстоўваць сваю свабоду, каб грашыць. Як? Ранячы тых, хто мае слабейшае сумленне, прымушаючы аднаго з малых Хрыста пакрыўдзіцца і спатыкнуцца.

## АДМОВА АД СВАІХ ПРАВАЎ

Пасля таго, як Ісус акрэсліў Сваю свабоду ў дачыненні да храмавага падатку, Ён старанна дэманстраваў Сваім вучням важнасць пакоры.

> А хто згоршыць аднаго з малых гэтых, якія вераць у Мяне, такому лепш было б, каб павесілі млынавы камень на шыю ягоную і ўтапілі яго ў глыбіні мора. Гора сьвету ад згаршэньняў, бо патрэбна, каб прыйшлі згаршэньні; але гора таму чалавеку, праз якога прыходзіць згаршэньне! Калі ж рука твая ці нага твая горшыць цябе, адсячы іх і кінь ад сябе: лепш табе ўвайсьці ў жыцьцё кульгавым ці калекаю, чым, маючы дзьве рукі або дзьве нагі, быць укінутым у агонь вечны. І калі вока тваё горшыць цябе, вырві яго і кінь ад сябе: лепш табе аднавокім увайсьці ў жыцьцё, чым, маючы двое вачэй, быць укінутым у геенну вогненную. Глядзіце, не пагарджайце ані адным з малых гэтых, бо кажу вам, што анёлы іхнія ў небе заўсёды бачаць аблічча Айца Майго Нябеснага.
>
> —МАЦВЕЯ 18:6 – 10

Увесь гэты раздзел Мацвей прысвячае крыўдам і спакусам. Ісус ясна кажа: трэба пазбавіцца ад усяго, што выклікае грэх, нават калі гэта адзін з вашых прывілеяў Новага Запавету. Калі нешта ўводзіць у грэх твайго слабога брата, адсячы гэта перад ім.

Тады вы можаце задацца пытаннем, чаму Ісус крыўдзіў так шмат людзей, як мы бачылі ў папярэднім раздзеле гэтай кнігі. Адказ просты. Ісус пакрыўдзіў некаторых людзей у выніку паслухмянасці Айцу і служэння іншым. Яго правапарушэнне адбылося не праз патрабаванне Яго ўласных правоў.

Фарысеі пакрыўдзіліся, калі Ён аздараўляў у суботу. Яго вучні былі абражаны праўдай, якую прапаведаваў Айцец. Марыя і

Марта былі пакрыўджаныя, калі Ён адклаў Сваё вяртанне, каб вылечыць Лазара. Але вы не ўбачыце, як Ісус крыўдзіць іншых, служачы Самому Сабе.

Павал у пасланні да Карынцянаў даў наступнае папярэджанне:

> Але сьцеражыцеся, каб гэтая ваша свабода не стала каменем спатыкненьня для слабых.
>
> —1 КАРЫНЦЯНАЎ 8:9

Наша свабода дадзена нам, каб мы аддавалі сваё жыццё для служэння. Мы павінны будаваць, а не разбураць. Нам не далі свабоду празмерна запаўняць сваё жыццё рэчамі. Праз тое, што мы карысталіся свабодай такім чынам, стыль жыцця хрысціян сёння многіх абражае.

Зноў звернемся да папярэджання, дадзенага нам у Лісце да Карынцянаў:

> Але сьцеражыцеся, каб гэтая ваша свабода не стала каменем спатыкненьня для слабых.
>
> – 1 КАРЫНЦЯНАЎ 8:9

Вось прыклад парушэння гэтай запаведзі. Калі я ехаў другі раз служыць у Інданезію, я ўзяў з сабой Лізу, дзяцей і няню. Мы прыбылі ў Дэнпасар на курортным востраве Балі.

Старэйшына царквы, якую мы наведвалі, валодаў сціплым гатэлем у вельмі шумным раёне горада. Мы шмат праехалі і вельмі мала спалі, былі знясіленыя. У тую ноч нас некалькі разоў будзіў гучны шум і брэх сабак. Мы правялі ў гатэлі толькі адну ноч і не атрымалі неабходнага адпачынку.

Назаўтра мы паехалі на Яву і на працягу наступных двух тыдняў служылі па вельмі напружаным графіку. У нас быў толькі адзін вольны дзень за два тыдні, і той пайшоў на падарожжа. За дваццаць чатыры гадзіны мы пяць разоў служылі ў трыццацітысячнай царкве.

У канцы паездкі мы вярталіся праз Балі. Пастар паведаміў нам, што мы зноў спынімся ў гатэлі яго старэйшыны. Мы былі не ў захапленні ад перспектывы зноў апынуцца ў кепскіх умовах пасля двух насычаных тыдняў служэння.

Падчас сняданку ў той дзень, калі мы ехалі з Явы на Балі, адна сястра прапанавала аплаціць наша пражыванне ў найлепшым курортным гатэлі Балі. Я быў вельмі ўсцешаны, бо мы маглі спыніцца і адпачыць у прыгожым месцы.

Калі мы пайшлі збіраць рэчы, Ліза сказала мне, што не мае міру адносна прапановы гэтай жанчыны. Мы з перакладчыкам даводзілі, што ўсё будзе добра. У самалёце з Явы на Балі Ліза зноў паўтарала, што мы робім няправільны крок.

Я не слухаў яе. Я сказаў, што гэта нічога не каштуе царкве, і таму будзе добра. Калі мы прыбылі на Балі, Ліза яшчэ раз звярнулася да мяне на выдачы багажу, але я праігнараваў яе.

Мы сустрэліся з пастарам, і я сказаў, што мы не будзем спыняцца ў гатэлі старэйшыны, бо ёсць іншая прапанова. Падалося, яму было непрыемна, таму я спытаў, што здарылася. На шчасце, пастар шчыра сказаў: «Джон, гэта пакрыўдзіць старэйшыну і яго сям'ю. Яны ўжо зарэзервавалі для вас нумар, хаця ўвесь гатэль раскуплены на вечар».

Я, відавочна, пакрыўдзіў пастара, бо не ацаніў тое, што для нас арганізавалі. Урэшце я сказаў, што мы спынімся ў гатэлі старэйшыны і адмовімся ад іншай прапановы.

Госпад разабраўся са мной наконт майго стаўлення. Я ведаў, што пастару было непрыемна. Я бачыў, што адстойванне маіх правоў пакрыўдзіла брата, і гэта быў грэх. Я папрасіў прабачэння, і пастар дараваў мне. Спадзяюся, мне не давядзецца паўтараць гэты ўрок.

## ТЭСТ НА ЗБУДАВАННЕ

Апостал Павал, пішучы да Рымлянаў, акрэсліў Божае стаўленне да гэтага пытання:

> Дык таму будзем імкнуцца да таго, што [служыць] дзеля супакою і ўзаемнага збудаваньня.
>
> — РЫМЛЯНАЎ 14:19

Мы павінны паставіць сабе за мэту не прымушаць іншых спатыкацца з–за нашай асабістай свабоды. Тое, што мы робім, можа быць дазволеным паводле Пісання. Але спытайцеся ў сябе, ці збудоўвае гэта вас або іншага чалавека?

> Усё мне можна, але ня ўсё карысна; усё мне можна, але ня ўсё будуе. Ніхто няхай не шукае свайго, але кожны таго, што для іншага... . Дык ці ясьцё, ці п’іцё, ці нешта робіце, усё рабіце на славу Божую. Ня станьцеся спатыкненьнем ані для Юдэяў, ані для Грэкаў, ані для царквы Божай, як і я дагаджаю ўсім у–ва ўсім, *шукаючы не для сябе карысьці*, але для многіх, каб яны былі збаўленыя.
>
> —1 КАРЫНЦЯНАЎ 10:23 – 24, 31–33,
> ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Я заклікаю вас дазволіць Святому Духу кіраваць кожнай сферай вашага жыцця праз гэты ўрывак з Пісання. Дазвольце Яму паказаць кожны схаваны матыў або план, скіраваны на вашу выгаду, а не на выгаду іншых. Якой бы сферай жыцця вы ні займаліся, прыміце Яго выклік жыць як слуга ўсім.

Выкарыстоўвайце сваю свабоду ў Хрысце, каб вызваліць іншых, а не адстойваць свае правы. Гэта было адным з прынцыпаў служэння Паўла, які пісаў: «Мы нікому ні ў чым не даём спатыкненьня, каб ня ганілася служэньне» (2 Кар. 6:3).

## ЧАЛАВЕК, ЯКІ НЕ МОЖА ДАРАВАЦЬ, ЗАБЫЎСЯ, ЯКІ ВЯЛІКІ ДОЎГ ДАРАВАЎ ЯМУ БОГ.

*«Прынада шатана»* была ў маёй бібліятэцы больш за год, і я нарэшце пачала яе чытаць. Я адразу змагла назваць дух, які пасяліўся ў маім жыцці. Без ценю сумневу я ведала, што Дух Святы скіраваў мяне да гэтай кнігі. Чым больш я чытала, тым больш пераконвалася. У царкве пастар прасіў выйсці наперад тых, каму трэба прабачыць іншых. Я без ваганняў падышла да алтара, каб прабачыць усім, хто мяне пакрыўдзіў, асабліва бацьку. Тады я папрасіла тату дараваць мне. Я ўдзячна, што ён гэта зрабіў, і цяпер я вольная! Дзякуй за гэтую кнігу!

—Р. П., ВІРДЖЫНІЯ

# 11

# ПРАБАЧЭННЕ: КАЛІ НЕ ДАЯЦЕ, ТО І НЕ АТРЫМАЕЦЕ

*Дзеля гэтага кажу вам: усё, пра што ў малітве будзеце прасіць, верце, што атрымаеце, і будзе вам. І калі стаіцё ў малітве, даруйце, калі што маеце супраць каго, каб і Айцец ваш, Які ў небе, дараваў вам грахі вашыя. Калі ж вы не даруеце, дык і Айцец ваш, Які ў небе, не даруе вам грахоў вашых.*

**— МАРК 11:24 – 26**

У далейшых раздзелах кнігі я хачу звярнуць увагу на наступствы нежадання адпусціць крыўду і на тое, як вызваліцца ад яе.

Ісус меў на ўвазе тое, што сказаў: «Калі ж вы не даруеце, дык і Айцец ваш, Які ў небе, не даруе вам грахоў вашых». Мы

жывём у культуры, дзе людзі не заўсёды маюць на ўвазе тое, што кажуць. Такім чынам, мы не верым, што іншыя маюць на ўвазе тое, што кажуць. Слова чалавека не ўспрымаюць усур’ёз.

Гэта пачынаецца ў дзяцінстве. Бацькі кажуць дзіцяці: «Калі ты зробіш гэта яшчэ раз, будзеш пакараны». Дзіця робіць гэта зноў, і зноў, і зноў. Пасля кожнага выпадку дзіця атрымлівае тое самае папярэджанне ад бацькоў. Звычайна не робіцца нічога для выпраўлення сітуацыі. Калі пакаранне ўсё ж будзе, то яно альбо лягчэйшае, чым было абяцана, альбо больш сур’ёзнае, таму што бацькі расстроеныя.

У кожным выпадку дзіця разумее, што вы не маеце на ўвазе тое, што кажаце, або што вы кажаце няпраўду. Дзіця пачынае думаць: не ўсё, што кажуць важныя для яго людзі, – праўда. Такім чынам, яно блытаецца, калі ўспрымаць важных людзей сур’ёзна, і ці рабіць гэта ўвогуле. Такое стаўленне пераносіцца на іншыя сферы жыцця. Дзіця разглядае настаўнікаў, сяброў, лідараў і начальнікаў у такой жа сістэме каардынат. Да таго часу, калі дзіця становіцца дарослым, яно ўжо лічыць гэта нормай. Цяпер яго размовы складаюцца з абяцанняў і заяў, у якіх ужо дарослы чалавек кажа тое, што не мае на ўвазе.

Дазвольце мне прывесці магчымы прыклад такой размовы. Джым бачыць Тома, якога ведае і якога нейкі час не бачыў. Ён спяшаецца і думае: *«Толькі не гэта! Трэба ж было сутыкнуцца з Томам. У мяне няма часу на размовы»*.

Двое мужчын глядзяць адзін на аднаго.

Джым кажа: «Хвала Госпаду, брат. Рады цябе бачыць».

Яны трошку размаўляюць. Джым спяшаецца, таму кажа на развітанне: «Нам трэба неяк сабрацца на абед». Па–першае, Джым не быў у захапленні ад сустрэчы з Томам, бо спяшаўся. Па–другое, ён не думаў пра Госпада і прывітаў Тома словамі «хвала Госпаду». Па–трэцяе, Джым не збіраўся запрашаць Тома на абед. Гэта быў спосаб спыніць размову і супакоіць

сумленне. Мы бачым, што Джым сапраўды не меў на ўвазе нічога з таго, што сказаў у размове.

Такія сітуацыі здараюцца кожны дзень. Сёння большасць людзей не маюць на ўвазе і чвэрці таго, што кажуць. Дык ці варта здзіўляцца, што нам цяжка зразумець, калі верыць чалавеку на слова?

Але Ісус хоча, каб мы ўспрымалі Яго словы сур'ёзна. Мы не можам ставіцца да таго, што Ён кажа, гэтаксама, як глядзім на іншыя аўтарытэты або адносіны ў жыцці. Калі Ісус нешта кажа, Ён мае гэта на ўвазе. Ён верны, нават калі мы няверныя. Яго праўда і цэласнасць пераўзыходзяць межы нашай культуры і грамадства. Ісус кажа: «Калі ж вы не даруеце, дык і Айцец ваш, Які ў небе, не даруе вам грахоў вашых», – і менавіта гэта Ён мае на ўвазе.

Каб развіць гэтую думку, Ісус паўтарае яе ў Евангеллях некалькі разоў і падкрэслівае важнасць такога папярэджання. Давайце паглядзім на некаторыя заявы, зробленыя Ім у розных сітуацыях.

> Бо, калі вы будзеце адпускаць людзям грахі іхнія, то і вам адпусьціць Айцец ваш, Які ў небе. А калі ня будзеце адпускаць людзям грахоў іхніх, то і Айцец ваш не адпусьціць грахоў вашых.
>
> — МАЦВЕЯ 6:14 – 15

І яшчэ:

> Даруйце, і вам будзе даравана.
>
> — ЛУКІ 6:37

У малітве «Ойча наш» мы зноў чытаем:

> І адпусьці нам правіны нашыя, як і *мы адпускаем* вінаватым нашым.
>
> — МАЦВЕЯ 6:12, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Цікава, колькі хрысціян хоча, каб Бог дараваў ім гэтаксама, як яны даравалі сваім крыўдзіцелям? Яны атрымаюць менавіта такое дараванне. Паколькі ў нашых цэрквах вельмі распаўсюджана непрабачэнне, мы не хочам успрымаць словы Ісуса сур’ёзна. Але праўда не мяняецца ў залежнасці ад сітуацыі. Мы атрымаем такое ж прабачэнне, вызваленне і аднаўленне, як тое, што мы даём іншым людзям.

Я пачуў незвычайнае сведчанне пра служыцеля на Філіпінах. Мае сябры ведалі яго і паказалі мне артыкул, дзе распавядалася пра яго перажыванне. Гэты чалавек некалькі гадоў супраціўляўся закліку Бога ў сваім жыцці, бо меў паспяховы бізнес і зарабляў вялікія грошы. Урэшце непадпарадкаванне яго дагнала, і ён тэрмінова трапіў у бальніцу з–за праблем з сэрцам.

На аперацыйным стале ён памёр, потым апынуўся ля брамаў раю. Там стаяў Ісус, Які нагадаў пра непаслухмянасць. Бізнесмен маліў Госпада падоўжыць жыццё і абяцаў служыць. Госпад згадзіўся.

Перш чым вярнуць бізнесмена ў цела, Госпад паказаў яму пекла. Там, сярод пякельнага полымя, бізнесмен убачыў сваю цешчу.

Ён быў шакаваны. Цешча малілася малітвай пакаяння, вызнавала сябе хрысціянкай і хадзіла ў царкву. «Чаму яна ў пекле?» — спытаў бізнесмен Госпада.

Госпад сказаў, што яна адмовілася дараваць сваяку, і таму не можа атрымаць прабачэнне.

## ПРАБАЧЭННЕ І ДУХОЎНЫ РОСТ

Мы з Лізай таксама бачылі шмат прыкладаў пасткі непрабачэння ў нашым служэнні. Калі я ўпершыню служыў у Інданезіі, то спыняўся ў доме багатага бізнесмена. Нягледзячы на тое, што ён і яго сям’я наведвалі царкву, дзе я служыў, яны не былі выратаванымі.

За тыдзень, што я быў там, збаўленне атрымала яго жонка, потым ён, а потым і ўсе трое іх дзяцей. Адбылося вызваленне, і ўся атмасфера ў доме змянілася. Іх дом напоўніла вялікая радасць.

Калі яны даведаліся, што мы з жонкай вернемся ў Інданезію, яны запрасілі нас спыніцца ў іх і прапанавалі аплаціць авіябілеты для маіх траіх дзяцей і няні.

Мы прыязджалі і дзесяць разоў служылі ў іх царкве. Я прапаведаваў пра пакаянне і прысутнасць Бога. Мы адчувалі Яго прысутнасць на набажэнствах, усе плакалі і радасна ўскрыквалі, атрымаўшы свабоду.

Мы зноў служылі сям'і, якая нас прымала. На кожнае служэнне прыходзіла маці мужа, якая жыла ў тым жа горадзе. Таксама яна ахвяравала вялікую суму грошай на авіябілеты для нашых дзяцей.

Бліжэй да канца тыдня яна паглядзела мне проста ў вочы і спытала: «Джон, чаму я ніколі не адчувала прысутнасці Бога?»

Мы толькі скончылі снедаць, усе ўжо выйшлі з–за стала. «Я была на ўсіх служэннях, — працягвала яна, — і ўважліва слухала ўсё, што вы казалі. Я выходзіла наперад з пакаяннем, але ні разу не адчула прысутнасці Бога. Больш за тое: я ніколі не адчувала прысутнасці Бога ні ў які іншы час».

Я паразмаўляў з ёй, а потым сказаў: «Давайце маліцца, каб вы напоўніліся Божым Духам». Я ўсклаў на яе рукі і маліўся, каб яна атрымала Святога Духа, але прысутнасці Бога зусім не было.

Тады Бог прамовіў да мяне ў духу. «Яна не даравала свайму мужу. Скажы ёй, каб яна даравала яму».

Я спыніў малітву, бо ведаў, што яе муж памёр. Я паглядзеў на жанчыну і сказаў: «Госпад паказвае мне, што вы не даруеце свайму мужу».

«Так, праўда, – пагадзілася яна. – Але я зрабіла ўсё магчымае, каб дараваць яму».

Потым яна распавяла мне пра жудасныя рэчы, якія муж зрабіў з ёй. Я мог зразумець, чаму ёй было цяжка прабачыць.

Але я сказаў: «Каб атрымаць ад Бога прабачэнне, вам трэба прабачыць», – і растлумачыў словы Ісуса адносна прабачэння.

«Вы не можаце даравацъ сваімі сіламі. Вы павінны прынесці гэта перад Богам і спачатку папрасіць Бога прабачыць вам. Тады вы можаце даравацъ свайму мужу. Вы гатовы адпусціць мужа?» — спытаў я.

«Так», — адказала яна.

Я павёў яе ў простай малітве: «Ойча Нябесны, у імя Ісуса я прашу ў Цябе прабачэння за тое, што не прабачала свайму мужу. Госпад, я ведаю, што не магу даравацъ яму сваімі сіламі. Я ўжо пацярпела няўдачу, але перад Табою ўсім сэрцам цяпер адпускаю мужа. Я яму дарую».

Не паспела яна сказаць гэтыя словы, як па яе шчаках пацяклі слёзы.

«Падыміце рукі і гаварыце на мовах», — заклікаў я.

Упершыню яна малілася на прыгожай нябеснай мове. У нас было такое моцнае адчуванне прысутнасці Госпада за сняданкам, што мы былі надзвычай ўзрушаныя. Яна плакала каля пяці хвілін. Мы крыху паразмаўлялі, потым я заахвоціў яе атрымліваць асалоду ад прысутнасці Госпада. Яна працягвала пакланяцца Яму, і я пакінуў яе адну.

Калі пра гэта пачулі яе сын і нявестка, яны былі ў шоку. Сын сказаў, што ніколі не бачыў, каб маці плакала.

Яна і сама не памятала, калі плакала апошні раз: «Я не плакала, нават калі памёр мой муж».

У той вечар на служэнні яна прыняла водны хрост. На працягу трох наступных дзён яна ўсміхалася і свяцілася радасцю. Я не памятаю, каб да гэтага бачыў яе ўсмешку. Яна не даравала і таму была зняволеная непрабачэннем. Але як толькі яна адпусціла мужа і прабачыла яму, яна атрымала моц Госпада ў жыцці і ўсвядоміла Яго прысутнасць.

## СЛУГА, ЯКІ НЕ ПРАБАЧАЎ

У Мацвея 18 Ісус далей пралівае святло на няволю непрабачэння і крыўды. Ён кажа вучням, як прымірыцца з братам, які іх пакрыўдзіў. (Мы абмяркуем прымірэнне ў наступным раздзеле.)

Пётр спытаў: «Госпадзе! Колькі разоў брат мой будзе грашыць супраць мяне, і я дарую яму? Ці да сямі разоў?» (Мцв. 18:21). Ён думаў, што быў шчодрым.

Пётр любіў даводзіць усё да крайнасці. Гэта ён сказаў: «Зробім тут тры намёты: Табе адзін, і Майсею адзін, і адзін Ільлі» на гары Перамянення (глядзі Мацвея 17:4). Ён думаў, што праяўляе велікадушнасць: *«Настаўніка ўразіць мая гатоўнасць дараваць сем разоў».*

Адказ Ісуса шакаваў Пятра. Госпад не прыняў тое, што Пётр лічыў шчодрым: «Не кажу табе: да сямі, але да *сямідзесяці разоў па сем*» (Мцв. 18:21 – 22, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ). Іншымі словамі, прабачайце, як Бог, без абмежаванняў.

Потым Ісус распавёў прыпавесць, каб падкрэсліць Сваю думку.

> Дзеля гэтага Валадарства Нябеснае падобнае да чалавека валадара, які захацеў разрахавацца са слугамі сваімі. Калі ж пачаў ён рахавацца, прывялі да яго аднаго, які вінен быў дзесяць тысячаў талентаў.
>
> — МАЦВЕЯ 18:23 – 24

Каб зразумець памеры таго, што апісваў Ісус, мы павінны ведаць, што такое талент. Талент быў адзінкай меры. Ён выкарыстоўваўся для вымярэння золата (2 Сам. 12:30), срэбра (1 Цароў 20:39) і іншых металаў і тавараў. У гэтай прыпавесці талент прадстаўляе сабой доўг, так што мы можам быць упэўнены: Ісус меў на ўвазе адзінку абмену, такую як золата або срэбра. Скажам, золата.

Звычайны талент быў роўны прыкладна трыццаці чатыром кілаграмам. Гэта была вага, якую мог несці чалавек (глядзі 2 Цароў 5:23). Дзесяць тысяч талентаў складаюць прыблізна 340 тон. Значыць, слуга быў вінен цару 340 тон золата.

Цяпер кошт золата складае прыкладна 375 долараў за ўнцыю. На сучасным рынку талент золата будзе каштаваць 450 000 долараў. Такім чынам, дзесяць тысяч талентаў золата каштуюць 4,5 мільярда долараў. Гэты слуга быў вінен свайму цару 4,5 мільярда долараў!

Тут Ісус падкрэсліваў, што слуга быў вінен суму, якую ніколі не змог бы заплаціць. Мы чытаем:

> А як ня меў што аддаць, пан ягоны загадаў прадаць яго, і жонку ягоную, і дзяцей, і ўсё, што меў, і заплаціць. Тады слуга той, упаўшы, пакланіўся яму, кажучы: “Пане! Будзь доўгацярплівым да мяне, і ўсё табе аддам”. Пан, зьлітаваўшыся над слугою тым, адпусьціў яго і дараваў яму пазыку.
>
> —МАЦВЕЯ 18:25 – 27

Зараз давайце паглядзім, як гэтая прыпавесць выкарыстоўваецца ў адносінах да пакрыўджанага. Калі здараецца крыўда, з’яўляецца доўг. Вы напэўна чулі: «Ён заплаціць за гэта». Такім чынам, прабачэнне падобна на ануляванне доўгу.

Цар – вобраз Бога Айца, Які дараваў слузе доўг, што той не мог заплаціць. У Пасланні да Каласянаў 2:13 – 14 мы чытаем: «І вас, якія былі мёртвыя ў грахах і неабразаньні цела вашага, Ён ажывіў разам з Ім, дараваўшы нам усе грахі, сьцёршы рукапіс пастановаў, што былі супраць нас; і забраў яго спасярод, прыбіўшы да крыжа».

Мы ніяк не маглі вярнуць Богу тое, што вінаваты Яму. Наша крыўда была ашаламляльнай. Такім чынам, Бог даў выратаванне як дар. Ісус заплаціў доўг, які перашкаджаў нам.

Мы бачым паралель паміж стаўленнем слугі да цара і нашымі адносінамі з Богам.

> А слуга той, выйшаўшы, знайшоў аднаго з таварышаў сваіх, які вінен быў яму сто дынараў, і, схапіўшы яго, душыў, кажучы: «Аддай мне, што вінен».
>
> — МАЦВЕЯ 18:28

Дынар прыкладна роўны заробку працаўніка за адзін дзень. Значыць, пры сённяшнім заробку сто дынараў складалі б каля чатырох тысяч долараў. Цяпер чытайце далей:

> Тады таварыш ягоны, упаўшы да ног яго, прасіў яго, кажучы: «Будзь доўгацярплівым да мяне, і ўсё аддам табе». А той не захацеў, але адыйшоўшы, кінуў яго ў вязніцу, пакуль не аддасць доўгу.
>
> — МАЦВЕЯ 18:29 – 30

Адзін з яго таварышаў быў вінен яму значную суму грошай — трацiну гадавога заробку. Ці хацелі б вы, каб вам не хапіла трацiны заробку? Але памятайце: гэтаму чалавеку даравалі доўг у 4,5 мільярды долараў. Гэта больш, чым ён мог зарабіць за ўсё жыццё!

Крыўды, якія мы маем адзін супраць аднаго, у параўнанні з нашымі правінамі супраць Бога – як 4000 долараў у параўнанні з 4,5 мільярдамі. Магчыма, нехта абышоўся з намі кепска, але гэта не параўнаецца з нашымі злачынствамі супраць Бога.

Вы можаце лічыць, што нікому яшчэ не было так кепска, як вам. Але вы не ўяўляеце, як жахліва абыходзіліся з Ісусам. Ён быў невінаваты, бездакорнае Ягня, Якога забілі.

Чалавек, які не можа дараваць, забыўся пра вялікі доўг, які быў дараваны яму. Калі вы зразумееце, што Ісус вызваліў вас ад вечнай смерці і пакут, вы безумоўна прабачыце іншых. (Пра тое, як гэта зрабіць, мы пагаворым у трынаццатым раздзеле.)

Няма нічога горшага за вечнасць у вогненным возеры. Там

няма палёгкі, чарвяк не памірае, агонь не згасае. Гэта было нашым пунктам прызначэння, пакуль Бог не дараваў нам праз смерць Свайго Сына, Ісуса Хрыста. Алелюя! Калі вам цяжка дараваць, падумайце пра рэальнасць пекла і любоў Бога, якая выратавала вас.

## УРОКІ ДЛЯ ВЕРНІКАЎ

Давайце дачытаем прыпавесць:

> Таварышы ягоныя, убачыўшы, што сталася, вельмі засмуціліся і, прыйшоўшы, паведамілі пану свайму ўсё, што сталася. Тады пан ягоны, паклікаўшы яго, кажа яму: «Злы слуга! Увесь твой доўг я дараваў табе, калі ты прасіў мяне. Ці ж ня мусіў і ты зьлітавацца над таварышам тваім, як і я зьлітаваўся над табою?»
>
> — МАЦВЕЯ 18:31 – 33

У гэтай прыпавесці Ісус не меў на ўвазе нявеРуючых. Ён казаў пра царскіх слуг. Гэтаму чалавеку ужо быў дараваны вялікі доўг (выратаванне), і яго называлі «слугой» гаспадара. Той, каму ён не дараваў, быў «таварышам». Такім чынам, можна зрабіць выснову, што гэта доля верніка, які адмаўляецца прабачаць.

> І, загневаўшыся, пан ягоны аддаў яго катам, пакуль не аддасьць яму ўсяго доўгу. Так і Айцец Мой Нябесны ўчыніць вам, калі не даруе кожны з вас ад сэрца свайго брату свайму грахоў ягоных.
>
> — МАЦВЕЯ 18:34 – 35

У гэтых вершах мы бачым тры асноўныя моманты.

1. Няўмольны слуга аддадзены на катаванні.
2. Ён павінен сплаціць першапачатковы доўг – 340 тон золата.
3. Бог Айцец зробіць тое самае з кожным вернікам, які не даруе крыўды брату.

***1. Няўмольны слуга аддадзены на катаванні.***

Слоўнік Вэбстэра вызначае *катаванне* як «агонію цела або розуму» або «прычыненне моцнага болю з мэтай пакарання, прымусу або атрымання садысцкага задавальнення».

Натхняльнікамі гэтага катавання з'яўляюцца духі–дэманы. Бог дае «катам» дазвол па жаданні прычыняць боль і пакуты целу і розуму, нават калі мы вернікі. На служэннях я часта маліўся за людзей, якія не маглі атрымаць ацаленне, суцяшэнне або вызваленне, бо яны не жадалі вызваляць і прабачаць іншых ад усяго сэрца.

Медыкі і навукоўцы звязваюць непрабачэнне і горыч з такімі захворваннямі, як артрыт і рак. Многія выпадкі псіхічных захворванняў звязаны з глыбокім непрабачэннем.

Часта людзі не прабачаюць іншым, але часам – і сабе. Ісус сказаў: «Даруйце, калі што маеце супраць каго...» (Марка 11:25). Словы «супраць каго» ўключаюць і вас! Калі Бог дараваў табе, хто ты такі, каб не дараваць таму, каму Ён дараваў, нават калі гэта ты сам?

***2. Няўмольны слуга павінен быў заплаціць першапачатковы нявыплачаны доўг.***

Ад яго патрабавалася немагчымае. Гэта тое самае, што патрабаваць ад нас заплаціць доўг, за які Ісус памёр на Галгофе. Мы страцілі б сваё выратаванне.

«Пачакайце хвілінку, – скажаце вы. – Я думаў, як толькі чалавек памаліўся малітвай пакаяння і прысвяціў сваё жыццё Ісусу, ён ніколі не можа страціць збаўленне».

Калі вы так лічыце, то растлумачце, чаму Пётр напісаў наступнае:

> Бо калі яны, уцёкшы ад апаганьваньня сьвету праз пазнаньне Госпада і Збаўцы нашага Ісуса Хрыста, ізноў даўшы зьвязаць сябе, пераможаныя ім, апошняе

> для іх горш за першае. *Бо лепш ім было не пазнаць шляху праведнасьці,* чым, пазнаўшы, адвярнуцца ад перададзенага ім сьвятога прыказаньня.
>
> — 2 ПЯТРА 2:20 – 21, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Пётр казаў пра людзей, якія пазбеглі граху (апаганьвання свету) праз збаўленне ў Ісусе Хрысце. Аднак яны зноў былі звязаныя грахом (які мог быць непрабачэннем) і пераможаныя ім. Быць пераможанымі значыла, што яны не вярнуліся да Госпада і не пакаяліся ў сваім наўмысным граху. Пётр сказаў, што адвярнуцца ад праведнасці было горш, чым ніколі яе не ведаць. Іншымі словамі, Бог кажа: лепш ніколі не быць выратаваным, чым атрымаць дар вечнага жыцця, а затым адвярнуцца ад яго назаўжды.

Юда таксама апісваў людзей у царкве, якія былі «двойчы памёршымі» (Юды 12–13). Быць двойчы памёршым азначае, што вы калісьці былі мёртвым без Хрыста, потым вы ажылі, прыняўшы Яго, потым вы зноў памерлі, адышоўшы ад Яго шляхоў назаўсёды.

Мы бачым, што многія прыйдуць да Ісуса, апраўдваючы сябе: «Многія скажуць Мне ў той дзень: “Госпадзе, Госпадзе! Ці не ў Тваё імя мы прарочылі? І ці не ў Тваё імя выганялі дэманаў? І ці не ў Тваё імя шмат цудаў чынілі?” І тады прызнаюся ім: “Я ніколі ня ведаў вас. Адыйдзіцеся ад Мяне, вы, што чыніце беззаконьне”» (Мц. 7:22 – 23) Яны ведалі Хрыста, называлі Яго Госпадам і рабілі  цуды ў Яго імя. Але Хрыстос не ведаў іх.

Каго будзе ведаць Ісус? Апостал Павал пісаў: «А калі хто любіць Бога, той мае разуменьне ад Яго» (1 Кар. 8:3). Бог ведае тых, хто любіць Яго.

Вы можаце сказаць: «Я люблю Бога. Я проста не люблю гэтага брата, які прычыніў мне боль». Тады вы падманваецеся і не любіце Бога, бо напісана: «Калі хто кажа: «Я люблю Бога», і брата свайго ненавідзіць, якога бачыць, як можа любіць Бога, Якога ня бачыць?» (1 Яна 4:20). Падман – страшная рэч, бо ашуканы ўсім сэрцам верыць, што ўсё робіць правільна. Ён лічыць сітуацыю

добрай, а на самай справе ўсё наадварот. Чалавек, які адмаўляецца падпарадкоўвацца Слову, падманвае ўласнае сэрца.

Хіба не цікава: многія чакаюць, што ўвойдуць на нябёсы, але ім будзе адмоўлена, і, як сказаў Ісус, у апошнія дні будзе многа пакрыўджаных? (Мц. 24:10) Ці могуць гэтыя дзве групы ўключаць адных і тых жа людзей?

Некаторыя вернікі так пакутуюць ад непрабачэння, што спадзяюцца: смерць прынясе палёгку. Але гэта няпраўда. Мы мусім разабрацца з непрабачэннем зараз, інакш будзем вымушаныя плаціць неаплатны доўг.

***3. Бог–Айцец рыхтуе гэта для кожнага верніка, які адмаўляецца прабачыць ад усяго сэрца — незалежна ад таго, наколькі вялікі боль ці крыўда.***

Ісус казаў вельмі канкрэтна, каб мы дакладна зразумелі гэтую прыпавесць. Ісус прапаноўваў тлумачэнні, толькі калі вучні прасілі Яго пра гэта. У гэтым выпадку, аднак, Ён не хацеў пытанняў адносна строгасці прысуду для тых, хто адмовіўся прабачыць.

У многіх іншых выпадках Ісус таксама ясна даў зразумець: калі мы не прабачым, то і не будзем прабачаныя. Памятайце: Ісус не падобны да нас; Ён мае на ўвазе тое, што кажа.

Такое не часта сустрэнеш у царкве. Замест гэтага прыводзяцца апраўданні за непрабачэнне. Непрабачэнне лічыцца меншым грахом, чым гомасексуалізм, чужалоства, крадзеж, п’янства і г.д. Але тыя, хто грашыць непрабачэннем, не атрымаюць у спадчыну Валадарства Божага, як і іншыя грэшнікі.

Некаторыя могуць падумаць, што гэта жорсткія словы, але я лічу іх весткай ласкі і папярэджання, а не жорсткага суду. Ці хацелі б вы быць асуджанымі Святым Духам і перажыць сапраўднае пакаянне і прабачэнне? Ці лепш вы адмовіцеся прабачыць і пачуеце, як Настаўнік скажа: «Сыходзь», – бо вы ўжо не можаце пакаяцца?

## ЖАДАННЕ ПОМСЦІЦЬ ЗА СЯБЕ МУСІЦЬ БЫЦЬ ДАЛЁКА АД НАС НАСТОЛЬКІ, КАБ МЫ ПАЗБЯГАЛІ НАВАТ ДУМАЦЬ ПРА ГЭТА.

Я дзякую Богу за вашу паслухмянасць у напісанні *«Прынады шатана».* Гэтая кніга настолькі памазана, што Дух Гасподні меў справу са мной увесь час, пакуль я чытаў яе, а гэта заняло толькі пару дзён. Гэтая кніга цалкам змяніла маё жыццё. Я атрымаў свабоду ад ланцугоў крыўды і буду далей трэніраваць сваё сэрца, розум і эмоцыі, каб заставацца свабодным.

—Л. М., ПАЎДНЁВАЯ КАРАЛІНА

# 12

# ПОМСТА: ПАСТКА

*Нікому не аддаючы ліхотай за ліхоту, дбайце*
*пра добрае перад усімі людзьмі.*

**— РЫМЛЯНАЎ 12:17**

Як мы ясна бачылі ў апошнім раздзеле: трымацца за крыўду непрабачэння – гэта ўсё роўна, што мецць перад кімсьці доўг. Калі чалавек пакрыўджаны, ён лічыць, што хтосьці вінен яму, і чакае выплаты – грашовай ці іншай.

Каб заступацца за пакрыўджаных ці пацярпелых, існуе судовая сістэма. Суды ўзнікаюць праз тое, што людзі спрабуюць спагнаць даўгі. Калі чалавек быў пакрыўджаны, чалавечая справядлівасць кажа: «Няхай стануць перад судом тыя, што так зрабілі, і заплацяць, калі іх прызнаюць вінаватымі». Няўмольны

слуга хацеў, каб яго таварыш заплаціў, што павінен, таму запатрабаваў кампенсацыі ў судзе. Гэта не шлях праведнасці.

> Ня помсьціце за сябе, улюбёныя, але дайце месца гневу [Божаму], бо напісана: «Мне [належыць] помста, Я аддам», — кажа Госпад.
>
> — РЫМЛЯНАЎ 12:19

Нам, дзецям Божым, несправядліва помсціць за сябе. Але калі мы адмаўляемся дараваць, мы шукаем менавіта гэтага. Мы жадаем, шукаем, плануем і выконваем помсту. Мы не даруем, пакуль доўг не будзе выплачаны цалкам, і толькі мы можам вызначыць прымальную кампенсацыю. Калі мы імкнёмся выправіць крыўду, зробленую нам, мы прызначаем сябе суддзямі. Але ж мы ведаем:

> Адзін ёсць Заканадаўца, Які можа збавіць і загубіць. А хто ты, які судзіш другога? Не наракайце, браты мае, адзін на аднаго, каб ня быць асуджанымі. Вось, Судзьдзя стаіць перад дзьвярыма.
>
> —ЯКУБА 4:12; 5:9

Бог – справядлівы Суддзя. Ён вынясе справядлівы прысуд. Але Ён адплаціць паводле праведнасці. Калі хтосьці зрабіў зло і шчыра каецца, смерць Ісуса на Галгофе знішчае гэты доўг.

Вы можаце сказаць: «Але крыўду зрабілі мне, а не Ісусу!»

Так, але вы не разумееце ўсё зло, якое Яму зрабілі вы. Ён не меў віны, хаця ўсе астатнія зграшылі, і быў асуджаны на смерць. Але Ён – нявінная ахвяра. Кожны з нас парушаў законы Бога, якія пераўзыходзяць законы краіны. Па справядлівасці, усе мы павінны быць асуджаныя на смерць рукой найвышэйшага ў сусвеце суда.

Магчыма, вы не зрабілі нічога, каб справакаваць няправільныя дзеянні з боку іншага чалавека. Але тое, што з вамі зрабілі, не вытрымлівае ніякага параўнання з тым, што вам

даравалі. Гэта ні на грам не паменшыла б ваш доўг Богу! Калі вы адчуваеце сябе падманутым, вы страцілі разуменне ласкі, дадзенай вам.

## НІЯКІХ ШЭРЫХ ЗОНАЎ КРЫЎДЫ

Паводле Старога Запавету, калі вы грашылі супраць мяне, я меў законнае права зрабіць вам тое ж самае. Быў дадзены дазвол на спагнанне даўгоў, адплата злом за зло (глядзі Лявіт 24:19; Выхад 21:23 – 25). Закон быў найвышэйшым. Ісус яшчэ не памёр, каб вызваліць людзей.

Паглядзіце, як Ён звяртаецца да вернікаў Новага Запавету.

> *Вы чулі, што сказана*: «Вока за вока і зуб за зуб». *А Я кажу вам*: не праціўцеся злому, але, хто ўдарыць цябе ў правую шчаку тваю, павярні да яго і другую, і хто захоча судзіцца з табою і ўзяць у цябе вопратку, аддай яму і шаты; і хто прымусіць цябе ісьці з ім адну мілю, ідзі з ім дзве. Таму, хто просіць у цябе, дай, і ад таго, хто хоча ў цябе пазычыць, не адварочвайся.
>
> — МАЦВЕЯ 5:38 – 42, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Ісус прыбірае ўсе шэрыя зоны крыўды. Насамрэч, Ён кажа: наша стаўленне павінна быць настолькі далёкім ад помсты за сябе, што мы гатовыя да таго, што, магчыма, хтосьці зноў скарыстаецца нашым жыццём і сіламі ў сваіх мэтах.

Калі мы імкнёмся выправіць зробленую нам крыўду, мы робім сябе суддзямі. Няўмольны слуга ў Мацвея 18 зрабіў менавіта гэта, калі пасадзіў таварыша ў турму. У сваю чаргу гэты няўмольны слуга быў перададзены катам, а яго сям’я прададзена, пакуль ён не заплаціць усё.

Мы павінны саступіць месца для дзеяння справядліваму Суддзі. Ён справядліва ўзнагароджвае. Толькі Ён помсціць у праведнасці.

Я дзяліўся словам на тэму крыўдаў у царкве ў Тампе, штат Флорыда. Пасля да мяне падышла жанчына. Яна сказала, што прабачыла былому мужу ўсё, што ён зрабіў. Але калі яна слухала маю пропаведзь пра вызваленне ад крыўд, яна зразумела, што ўсё яшчэ не мае ўнутранага спакою і адчувае сябе вельмі няўтульна.

– Вы ўсё яшчэ не даравалі яму, — далікатна сказаў я.

– Я даравала, – адказала яна. – Я праліла слёзы прабачэння.

– Магчыма, вы плакалі, але вы ўсё роўна яго не адпусцілі.

Яна настойвала, што я памыляўся і што яна прабачыла яму.

– Я нічога ад яго не хачу. Я адпусціла яго.

– Раскажыце, як ён вас пакрыўдзіў, — папрасіў я.

– Мы з мужам былі пастарамі царквы. Ён пакінуў мяне і нашых трох сыноў і ўцёк з вядомай у царкве жанчынай.

На яе вачах выступілі слёзы.

– Ён сказаў, што сумаваў па Богу, ажаніўшыся са мной, бо дасканалая воля Бога была на тое, каб ён ажаніўся з жанчынай, з якой ён уцёк. Муж лічыў, што яна была плюсам для яго служэння, таму што значна больш падтрымлівала яго. Я ж нібыта яму перашкаджала і крытыкавала яго. Усю віну за распад шлюбу ён усклаў на мяне. Ён так і не вярнуўся і не прызнаў, што ўсё гэта было яго віной.

Відавочна, што гэты чалавек быў падмануты і вельмі пакрыўдзіў сваю жонку і сям’ю. Яна моцна пацярпела ад яго дзеянняў і чакала, калі ён верне доўг. Справа была не ў аліментах ці ўтрыманні дзяцей – усё гэта ёй забяспечваў новы муж. Той доўг, выплаты якога яна чакала ад першага мужа, – гэта прызнанне, што памыляўся менавіта ён, а не яна.

– Вы не даруеце яму, пакуль ён не прыйдзе да вас і не скажа, што не меў рацыі і гэта была яго, а не ваша віна. І потым папросіць у вас прабачэння. Менавіта гэтая нязздзейсненая

> аплата вас і звязала, – патлумачыў я жанчыне. – Калі б Ісус чакаў, пакуль мы прыйдзем Яго і папрасім прабачэння, сказаўшы: «Мы памыляліся. Ты ўсё правільна казаў. Прабач нам», – Ён не дараваў бы нам з крыжа. Калі Ісус вісеў на крыжы, Ён усклікнуў: «Ойча, даруй ім, бо ня ведаюць, што робяць» (Лк. 23:34). Ён дараваў нам перш, чым мы прыйшлі да Яго і вызналі свае правіны супраць Яго. Нас настаўляюць словы апостала Паўла: «Як Хрыстос дараваў вам, гэтак і вы» (Кал. 3:13). І «будзьце ж адзін да аднаго добрымі, спагадлівымі, прабачаючы адзін аднаму, як і Бог у Хрысьце прабачыў вам» (Эф. 4:32).

Калі я сказаў гэтай жанчыне: «Вы не даруеце яму, пакуль ён не прыйдзе да вас і не скажа, што не меў рацыі і гэта была яго, а не ваша віна», – яна пачала плакаць. Тое, чаго яна хацела, здавалася малым у параўнанні з усім болем, што муж прынёс ёй і дзецям. Але яна была ў няволі чалавечай справядлівасці. Яна паставіла сябе суддзёй, сцвярджаючы сваё права на доўг і чакаючы выплаты. Крыўда перашкодзіла яе адносінам з новым мужам. Яна таксама паўплывала на яе адносіны з усімі мужчынамі–начальнікамі, бо былы муж таксама быў яе пастарам.

Ісус часта параўноўваў стан нашых сэрцаў з глебай. Слова заклікае нас быць укаранёнымі і замацаванымі ў любові Бога. Тады зерне Божага Слова пусціць карані ў нашых сэрцах, прарасце і ў канчатковым выніку прынясе плод праведнасці. Гэты плод – любоў, радасць, супакой, доўгацярплівасць, ласкавасць, добрасць, вера, ціхасць, стрыманасць (глядзі Галатам 5:22 – 23).

Але зямля дасць толькі тое, што ў ёй пасаджана. Калі мы пасеем зерне доўгу, непрабачэння і крыўды, на месцы любові да Бога вырасце іншы корань. Яго называюць коранем горычы.

Фрэнсіс Фрэнжыпэйн даў выдатнае вызначэнне горычы: «Горыч — гэта няздзейсненая помста». Яна ўзнікае, калі помста не задавальняецца ў той ступені, якой мы жадаем.

Аўтар Паслання да Гебраяў прама выказаўся пра гэта пытанне.

> Імкніцеся да супакою з усімі і да святасьці, без якое ніхто ня ўбачыць Госпада, гледзячы, каб хто ня страціў ласкі Божае; каб які корань горычы, вырасшы ўверх, не зрабіў шкоды, і каб праз яго не занячысьціліся многія.
>
> — ГЕБРАЯЎ 12:14 – 15, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ.

Звярніце ўвагу на словы «занячысціліся многія». Ці могуць гэта зноў быць тыя самыя «многія», якія, па словах Ісуса, будуць згоршаныя ў апошнія дні? (глядзі Мацвея 24:10)

Горыч – гэта корань. Калі карані даглядаць, паліваць, абараняць, карміць і надаваць ім увагу, яны растуць ў глыбіню і мацнеюць. Калі з імі не змагацца адразу, карані цяжка вырваць. Сіла крыўды будзе расці. Таму нас заклікаюць не даваць сонцу зайсці ў нашым гневе (глядзі Эфэсцам 4:26). Замест плоду праведнасці мы можам убачыць ураджай гневу, крыўды, рэўнасці, нянавісці, сварак і разладу. Ісус назваў іх злымі пладамі (глядзі Мацвея 7:19 – 20).

Біблія кажа: чалавек, які не імкнецца да міру, адпускаючы крыўды, у рэшце апаганіцца. Усё каштоўнае на выніку будзе сапсавана злом непрабачэння.

## ПАТЭНЦЫЯЛЬНЫ ЦАР ЗАНЯЧЫШЧАНЫ

Раней мы разглядалі, як Давід заставаўся верным цару Саўлу, нават калі Саўл не быў верны Давіду. Давід не імкнуўся помсціць за сябе, нават калі двойчы меў такую магчымасць. Давід быў чалавекам па сэрцы Божым. Ён дазволіў Богу судзіць паміж ім і Саўлам. Калі Божы суд абрынуўся на Саўла, Давід не ўзрадаваўся, а смуткаваў па Саўлу, бо не меў у сэрцы горычы.

Пасля смерці Саўла Давід узышоў на трон. Ён умацаваў нацыю, меў ваенны і фінансавы поспех і забяспечыў сабе супакой на троне. Ён узяў сабе мноства жонак, якія нарадзілі яму дзяцей, у тым ліку Амнона, яго старэйшага сына, і Абсалома, яго

трэцяга сына. Сын Давіда Амнон здзейсніў жахлівы грэх супраць сваёй зводнай сястры Тамар, якая была сястрой Абсалома. Ён прыкінуўся хворым і папрасіў бацьку паслаць Тамар падаць яму ежу. Калі яна гэта зрабіла, ён загадаў слугам выйсці і згвалціў яе. Затым ён пагардзіў ёю і выгнаў прэч. Ён зганьбіў цнатлівую дачку цара, напоўніўшы яе жыццё сорамам (глядзі 2 Самуэля 13).

Не кажучы ні слова свайму зводнаму брату, Абсалом прывёў сястру ў свой дом і забяспечыў яе. Але ён узненавідзеў Амнона за тое, што той зрабіў з Тамар.

Абсалом чакаў, што бацька пакарае яго зводнага брата. Цар Давід быў абураны, калі пачуў пра бязбожнасць Амнона, але не прадпрыняў ніякіх дзеянняў. Абсалом быў спустошаны адсутнасцю справядлівасці з боку бацькі.

Калісьці Тамар насіла царскія шаты, як і іншыя дочкі цара; цяпер яна была апранутая ў сорам. Яна была прыгожай дзяўчынай і, напэўна, карысталася вялікай павагай у людзей. Цяпер яна жыла ў адзіноце, не магла выйсці замуж, бо больш не была дзяўчынай.

Гэта было несправядліва. Яна прыйшла да Амнона па загаду цара, і была згвалтаваная. Яе жыццё скончылася, а чалавек, які ўчыніў гэтае зверства, жыў як ні ў чым не бывала. Яна несла вялікі цяжар, і жыццё было зруйнаванае.

Дзень за днём Абсалом бачыў сваю засмучаную сястру. Ідэальнае існаванне дачкі цара стала кашмарам. Абсалом чакаў год, пакуль бацька што–небудзь зробіць, але Давід нічога не зрабіў. Абсалом быў пакрыўджаны сваім бацькам і ненавідзеў бязбожнага Амнона.

Праз два гады яго нянавісць да Амнона спарадзіла змову забіць яго. *«Я адпомшчу за сястру, бо той, хто мусіць гэта зрабіць, бяздзейнічае»*, – верагодна, думаў Абсалом.

Ён зладзіў свята для ўсіх царскіх сыноў. Калі Амнон нічога не падазраваў, Абсалом загадаў забіць яго. Адпомсціўшы Амнону, Абсалом уцёк у Гешур. Але крыўда, якую ён меў супраць бацькі,

гарэла мацней, асабліва калі ён быў удалечыні ад палаца.

Думкі Абсалома былі атручаныя горыччу. Ён стаў экспертам–крытыкам слабасцяў Дэвіда. Але ён спадзяваўся, што бацька пакліча яго. Давід гэтага не зрабіў. Гэта ўзмацніла крыўду Абсалома.

Магчыма, ён думаў: *«Людзі вітаюць майго бацьку, але яны сляпыя і не бачаць яго сапраўдны нораў. Бацька – проста эгаістычны чалавек, які выкарыстоўвае Бога як прыкрыццё. Ён нават горшы за цара Саўла! Саўл страціў трон, бо не забіў цара Амалека і пашкадаваў некалькі лепшых авечак і валоў. Мой бацька чужаложыў з жонкай аднаго са сваіх самых верных людзей. Потым схаваў свой грэх, забіўшы вернага яму чалавека. Ён забойца і чужаложнік — вось чаму ён не пакараў Амнона! І ўсё гэта ён прыкрывае фальшывым пакланеннем Госпаду».*

Абсалом прабыў у Гешуры тры гады. Давід суцешыўся па смерці свайго сына Амнона, і Ёаў пераканаў цара вярнуць Абсалома дадому. Але Давід па–ранейшаму не хацеў бачыцца з Абсаломам твар у твар. Прайшло яшчэ два гады, і Давід нарэшце вярнуў Абсалому ласку і ўсе прывілеі. Але крыўда ў сэрцы Абсалома заставалася такой жа моцнай.

Абсалом быў знаўцам акторскага майстэрства. Перш чым забіць Амнона, «Абсалом не гаварыў Амнону ані добрага, ані ліхога, бо зьненавідзеў Абсалом Амнона» (2 Сам. 13:22). Многія людзі ўмеюць хаваць сваю крыўду і нянавісць, як гэта зрабіў Абсалом.

Абапіраючыся на крытыку і крыўду, Абсалом пачаў збіраць усіх незадаволеных. Ён стаў адкрытым для ўсяго Ізраіля, знаходзячы час, каб выслухаць скаргі, і казаў, што ўсё будзе інакш, калі ён будзе царом. Абсалом судзіў справы, бо выглядала так, што ў цара няма на іх часу. Магчыма, ён рабіў так, бо адчуваў, што не атрымаў справядлівасці ў сваёй справе.

Падавалася, што ён клапаціўся пра людзей. Біблія кажа, што Абсалом скраў сэрцы Ізраіля ў свайго бацькі Давіда. Але

ён сапраўды клапаціўся пра людзей ці шукаў спосаб зрынуць Давіда, чалавека, які яго пакрыўдзіў?

## ЭКСПЕРТЫ Ў ПАМЫЛКАХ

Абсалом згуртаваў вакол сябе Ізраіль і паўстаў супраць Давіда. Давіду прыйшлося бегчы з Ерусаліма, каб выратаваць жыццё. Здавалася, Абсалом створыць уласнае царства. Замест гэтага ён быў забіты, калі праследаваў Давіда, хаця Давід загадаў яго не чапаць.

Фактычна, Абсалом быў забіты ўласнай горыччу і крыўдай. Чалавек з вялізным патэнцыялам, спадчыннік трона, памёр у росквіце сіл, таму што адмовіўся адпусціць доўг, які, як ён лічыў, быў яму вінен яго бацька. Абсалом занячысціўся.

Памочнікі лідараў у царкве часта крыўдзяцца на людзей, якім служаць. Неўзабаве яны становяцца крытыкамі–экспертамі ва ўсім, што не так з іх лідарам і тымі людзьмі, якіх лідары прызначаюць. Такія людзі горшацца. У іх скажаецца зрок. Іх ракурс адрозніваецца ад Божага.

Яны лічаць, што іх місія ў жыцці – пазбавіць тых, хто побач, ад несправядлівага лідара. Яны заваёўваюць сэрцы абураных, незадаволеных і неабазнаных, і, не ўсведамляючы гэтага, урэшце вядуць царкву ці служэнне да расколу. Як Абсалом.

Часам іх назіранні слушныя. Магчыма, Давіду варта было прыняць меры супраць Амнона. Магчыма, лідар памыляецца ў нейкіх сферах. Хто суддзя: ты ці Госпад? Памятайце, што пасеяўшы сварку, вы яе пажняце.

Тое, што здарылася з Абсаломам і што адбываецца ў сучасных служэннях, – гэта працэс, які патрабуе часу. Мы часта не ведаем, што ў нашыя сэрцы ўвайшла крыўда. Падчас росту корань горычы ледзь прыкметны. Але, па меры ўзрастання, ён будзе мацнець. Як заклікае аўтар Паслання да Габраяў, мы павінны быць ўважлівымі, «гледзячы, ...каб які корань горычы, вырасшы

ўверх, не зрабіў шкоды, і каб праз яго не занячысьціліся многія» (Гебр. 12:15).

Мы павінны даследаваць свае сэрцы і адкрывацца на выпраўленне Госпада, бо толькі Яго Слова можа распазнаць думкі і намеры нашых сэрцаў. Святы Дух пераконвае, калі прамаўляе праз сумленне. Мы не павінны ігнараваць Яго дакоры або гасіць Яго. Калі хтосьці так рабіў, пакайцеся перад Богам і адкрыйце сэрца на Яго выпраўленне.

Адзін служыцель неяк спытаў мяне, ці дзейнічаў ён у адной справе, як Абсалом ці Давід. Гэты чалавек служыў памочнікам пастара ў адным горадзе, і пастар звольніў яго. Падобна было, што старэйшы пастар зайздросціў і баяўся гэтага маладога чалавека, бо на ім была рука Божая.

Праз год звольнены служыцель зразумеў, што Госпад хоча, каб ён заснаваў царкву на іншым канцы горада. Так ён і зрабіў, а пазней да яго далучыліся некаторыя людзі з царквы, якую ён пакінуў. Ён быў занепакоены, бо не хацеў дзейнічаць, як Абсалом, але ён відавочна не пакрыўдзіўся на свайго былога кіраўніка. Ён заснаваў новую царкву пад кіраўніцтвам Госпада, а не як вынік адсутнасці клопату ў іншай царкве.

Я паказаў яму розніцу паміж Абсаломам і Давідам. Абсалом скраў сэрцы іншых, таму што быў пакрыўджаны на свайго лідара. Давід заклікаў іншых заставацца вернымі Саўлу, нават калі Саўл нападаў на яго. Абсалом узяў з сабою людзей; Давід сышоў адзін.

- Вы пакінулі сваю царкву адзін? — спытаў я яго. – Ці зрабілі вы што–небудзь, каб заахвоціць людзей ісці з вамі ці падтрымаць вас?
- Я сышоў адзін і не рабіў нічога, каб прыцягнуць людзей да сябе, — сказаў ён.
- Гэта нармальна. Вы дзейнічалі, як Давід. Пераканайцеся, што людзі, якія прыходзяць да вас, не пакрыўджаныя на вашага былога пастара, а калі крыўда ёсць, вядзіце іх да свабоды і ацалення.

Царква гэтага чалавека цяпер квітнее. Я вельмі цаню ў ім тое, што ён не баяўся праверыць сваё сэрца. Мала таго, ён таксама прыслухаўся да пабожнай парады. Для яго важней было падпарадкавацца Божаму шляху, а не давесці правільнасць сваіх учынкаў.

Не бойцеся дазволіць Святому Духу выявіць любое непрабачэнне і любую горыч. Чым даўжэй вы іх хаваеце, тым мацней яны стануць і тым цвярдзейшым будзе вашае сэрца. Заставайцеся мяккімі сэрцам. Як?

> Усякая горыч, і ярасьць, і гнеў, і крык, і блюзьнерствы няхай будуць аддаленыя ад вас разам з усім ліхім. Будзьце ж адзін да аднаго добрымі, спагадлівымі, прабачаючы адзін аднаму, як і Бог у Хрысьце прабачыў вам.
>
> —ЭФЕСЯНАМ 4:31 – 32

## ВЫ РАСЦЯЦЕ БОЛЬШ АД САМЫХ СКЛАДАНЫХ КРЫЎДАЎ — ТЫХ, ДА ЯКІХ ВЫ НЕ РЫХТАВАЛІСЯ.

У мяне ёсць *«Прынада шатана»*! Якое дабраславенне гэтая кніга. Я рэкамендавала яе многім іншым людзям. Бог сапраўды выкарыстаў яе ў маім жыцці. Дзякуй!

—С. Т., ДЖОРДЖЫЯ

13

# ПАЗБЕГНУЦЬ ПАСТКІ

*Дзеля гэтага я сам намагаюся мець заўсёды чыстае сумленьне перад Богам і перад людзьмі.*

**— ДЗЕІ 24:16**

Каб застацца свабодным ад крыўды, патрэбны намаганні. Павал параўноўвае гэта з практыкаваннямі. Калі мы трэніруемся, мы менш схільныя да траўмаў. Аднойчы на Гаваях я залез на сцяну, каб зрабіць фота. З–за гэтага я пацягнуў мышцы ў калене і не мог хадзіць чатыры дні.

«Калі б вы рэгулярна займаліся спортам, – сказаў мне фізіятэрапеўт, – гэтага б не здарылася. Вашы мышцы не ў форме, вы схільныя да траўмаў.

Калі я змог хадзіць, іншы эксперт праінструктаваў мяне: «Вы

павінны выконваць гэтыя практыкаванні, каб вярнуць каленныя мышцы ў належную форму і стан». Спатрэбілася некалькі месяцаў, каб вярнуць маё калена ў норму.

Грэцкае слова для практыкаванняў у Дзеях 24:16 – *аскео (askeo)*. *«Тлумачальны слоўнік Вайна»* вызначае *практыкаванне* як «прыкладанне сіл, высілкі, практыкаванні праз навучанне або дысцыпліну». Часам людзі крыўдзяць нас, і гэта няцяжка даравацъ. Мы натрэніравалі нашыя сэрцы, каб яны былі ў стане справіцца з крыўдай; такім чынам, мы не маем траўмаў або пастаянных пашкоджанняў.

Многія людзі маглі б падняцца на сцяну на Гаваях і не атрымаць траўму, таму што яны ў форме. Падобным чынам некаторым трэба слухацца Бога, трэніруючы сваё сэрца. Наша ступень сталасці вызначае, наколькі добра мы справімся з крыўдай без траўмаў.

Некаторыя крыўды будуць больш складанымі, чым тыя, для якіх мы трэніраваліся. Гэта дадатковае напружанне можа раніць або траўмаваць нас, і нам зноў давядзецца займацца духоўнымі практыкаваннямі, каб вызваліцца і атрымаць ацаленне. Але вынік будзе каштаваць высілкаў.

У гэтай главе я закрану гэтыя экстрэмальныя, інтэнсіўныя крыўды, якія патрабуюць больш намаганняў, каб вырашыць іх.

У маім жыцці здарыўся выпадак, звязаны з іншым служыцелем. Гэты чалавек моцна пакрыўдзіў мяне не аднойчы, але некалькі разоў за паўтара года.

Усе вакол мяне ведалі, што адбываецца. «Вы не паранены? — запытваліся ў мяне. – Што вы будзеце рабіць? Вы проста адступіцеся і праглынеце гэта?»

«Я ў парадку,– сказаў я. – Мяне гэта не закранула. Я рухаюся далей». Але мой адказ быў не больш, чым пыхай. Мне было вельмі балюча, але я не прызнаваўся ў гэтым нават сабе. Я гадзінамі спрабаваў зразумець, як усё гэта магло адбыцца са мной. Я быў у шоку, здранцвенні і здзіўленні. Але я спыняў

гэтыя думкі і ўдаваў з сябе моцнага, хоць на самой справе быў слабым і моцна параненым.

Ішлі месяцы. Усё здавалася сухім, служэнне страціла свежасць, мой малітоўны пакой была пустым, а я пакутаваў. Я штодня змагаўся з д'ябальскімі думкамі. Я думаў, што ўвесь гэты супраціў абрынуўся на мяне праз маё пакліканне, але на самай справе гэта былі пакуты ад майго непрабачэння. Кожны раз, калі я быў побач з гэтым чалавекам, я сыходзіў у духоўных пакутах.

Потым надышла раніца, якую я ніколі не забуду. Я сядзеў ў двары за сваім домам і маліўся. «Госпад, я паранены?» — спытаў я.

Не паспелі гэтыя словы зляцець з маіх вуснаў, як я пачуў крык у глыбіні душы: *«Так!»*

Бог хацеў пераканацца: я ведаю, што я паранены.

«Божа, калі ласка, дапамажы мне пазбавіцца ад гэтых крыўдаў і болю», – маліў я. – Я не магу справіцца з гэтым сам».

Гэта было якраз тое чаго хацеў Госпад: каб я не разлічваў на свае сілы. Вельмі часта мы спрабуем зрабіць нешта ўласнай сілай душы. Такая пазіцыя не спрыяе нашаму духоўнаму росту, бо расце наша ўразлівасць да падзення.

Першы крок да ацалення і свабоды – прызнаць, што вы параненыя. Часта пыха не хоча, каб мы прызнавалі сябе параненымі і пакрыўджанымі. Як толькі я прызнаў сваё сапраўднае становішча, я шукаў Госпада і быў адкрыты для Яго выпраўлення.

Я адчуў, што Госпад хоча, каб я пасціўся некалькі дзён. Пост дапамог бы мне зноў стаць чуллівым да голасу Яго Духа і прынёс бы іншыя перавагі.

> Ці ж ня гэта пост, які Я выбраў: здымі кайданы бязбожнасьці, развяжы путы ярма, пусьці ўціснутых на свабоду і ўсякае ярмо скрышы.
>
> — ІСАІ 58:6

Я быў гатовы да таго, што кайданы бязбожнасці будуць разарваны і я вызвалюся ад прыгнёту.

Праз некалькі дзён я быў на пахавальным служэнні. Быў там і чалавек, які мяне пакрыўдзіў. Я глядзеў на яго з канца царквы і пачаў плакаць.

«Госпадзе, я дарую яму. Я вызваляю яго ад усяго, што ён зрабіў». Я адразу адчуў, што цяжар знік. Я дараваў яму. Якая палёгка ахапіла мяне!

Але гэта быў толькі пачатак майго шляху да ацалення. Я шчыра дараваў яму, але не ўсведамляў глыбіні раны. Я ўсё яшчэ быў уразлівы і мог зноў быць паранены. Гэта было вельмі падобна на аднаўленне пасля фізічнай траўмы. Мне трэба было практыкавацца, умацоўваць сэрца, розум і эмоцыі, каб прадухіліць любыя траўмы ў будучыні.

## А РЭЦЫДЫВЫ?

Мінула некалькі месяцаў. Часам мне даводзілася адбівацца ад тых жа думак, што і раней, да таго, як я дараваў. Да мяне мог прыйсці іншы пакрыўджаны са сваімі скаргамі, або я бачыў свайго крыўдзіцеля ці чуў яго імя. Я адкідваў гэтыя думкі, як толькі іх заўважаў (глядзі 2 Карынцянаў 10:5). Гэта было маё практыкаванне або імкненне заставацца свабодным.

Нарэшце я спытаў у Госпада, як не даць гэтым думкам зноў вярнуць мяне да непрабачэння. Я ведаў, што Ён хоча для мяне больш высокага ўзроўню свабоды, і я не хацеў пражыць рэшту жыцця, у любы момант рызыкуючы быць пакрыўджаным. Госпад загадаў мне маліцца за чалавека, які мяне пакрыўдзіў, нагадаўшы мне Яго словы:

> А Я кажу вам: любіце ворагаў вашых, дабраслаўляйце тых, якія праклінаюць вас, рабіце дабро тым, якія ненавідзяць вас, і маліцеся за тых, якія крыўдзяць вас і перасьледуюць вас.
>
> — МАЦВЕЯ 5:44

Таму я пачаў маліцца. Спачатку малітва была сухой і манатоннай, без намёку на агонь. З абавязку я дадаваў: «Госпад, дабраславі яго. Дай яму добры дзень. Дапамажы яму ва ўсім, што ён робіць. У імя Ісуса, амін».

Так працягвалася некалькі тыдняў. Здавалася, я не рухаўся наперад. Аднойчы раніцай Госпад нагадаў мне пра 35–ы Псалом. Я не памятаў, што там напісана, таму я адгарнуў яго і пачаў чытаць. Калі я дайшоў да сярэдзіны, я ўбачыў сваю сітуацыю.

> Паўстаюць сведкі няправасьці, пра тое, чаго я ня ведаю, выпытваюць мяне, плацяць мне злом за дабро; асірацела душа мая.
>
> —ПСАЛОМ 35:11 – 12

Я мог атаясаміць сябе з Давідам. На мой погляд, і гэты чалавек, і некаторыя яго паплечнікі ўзнагародзілі мяне злом за дабро. Мая душа, безумоўна, была ў смутку. Бог выкарыстаў гэты псалом, каб паказаць на маю барацьбу за апошнія некалькі гадоў. Адзін урывак прымусіў мяне проста падскочыць на месцы.

> *А я* падчас нядужасці іхняй апранаўся ў зрэбніцу, пастом прыгнятаў душу маю, і малітва мая вярталася ў грудзі мае. Быццам ён быў прыяцель, брат мой, хадзіў я [да яго]; як у жалобе па маці, сумаваў я ў смутку.
>
> —ПСАЛОМ 35:13 – 14, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Давід сказаў, што гэтыя людзі спрабавалі знішчыць яго. Яны напалі на яго са злом, калі ён не зрабіў нічога, каб заслужыць гэта.

Потым з’явіўся мой адказ: «А я...».

Адказ Давіда не быў заснаваны на дзеяннях іншых. Вырашыўшы зрабіць тое, што правільна, ён маліўся за іх, як за сваіх блізкіх братоў або як за чалавека, які перажывае страту маці. Бог паказваў мне, як маліцца за гэтага чалавека: «Маліся

для яго пра тое, што хочаш, каб Я зрабіў для цябе!»

Цяпер мае малітвы цалкам змяніліся. Больш не было: «Божа, дабраславі яго і дай яму добры дзень». Малітва напоўнілася жыццём. Я маліўся: «Госпад, адкрый Сябе яму яшчэ больш. Дабраславі яго Сваёй прысутнасцю. Дай яму пазнаёміцца з Табой бліжэй. Няхай ён будзе даспадобы Табе і ўшануе Тваё імя». Я маліўся пра тое, што хацеў, каб Бог зрабіў у маім жыцці.

Праз месяц гарачай малітвы за яго я ўсклікнуў гучным голасам: «Дабраслаўляю цябе! Я люблю цябе ў імя Ісуса!» Гэта быў крык з глыбіні майго духу. Я перайшоў ад малітвы за яго дзеля сябе да малітвы за яго дзеля яго. Я верыў, што ацаленне было цалкам завершана.

## АЦАЛЕННЕ ПРАЗ КАНФРАНТАЦЫЮ

Прайшло яшчэ некалькі тыдняў, і я зноў убачыў яго. У маім сэрцы варухнулася непрыемнае пачуццё. Я ўсё яшчэ змагаўся з жаданнем крытыкаваць яго.

- Табе трэба падысці да яго, Джон, – падбадзёрвала мяне жонка.
- Не, не трэба, — запэўніваў я. – Я атрымаў ацаленне.

Але я адчуваў, што Святы Дух не сведчыць пра тое, што я толькі што сказаў. Таму я спытаў Госпада, ці трэба мне падысці. Ён сказаў: «Так».

Я дамовіўся з гэтым чалавекам і прывёз яму падарунак. Я ўпакорыўся, прызнаўся ў сваім няправільным стаўленні да яго і папрасіў у прабачэння. Мы прымірыліся, і прабачэнне і ацаленне напоўнілі маё сэрца.

Я выйшаў з яго кабінета вылечаным і падмацаваным. Мне больш не трэба было змагацца з болем, і я не крытыкаваў яго. З тых часоў нашы адносіны былі моцнымі, і ў нас больш ніколі не было праблем. Насамрэч, мы вельмі падтрымліваем адзін аднаго.

«Калі я ўпершыню сустрэў гэтага чалавека, — сказаў я Лізе, — ён не мог зрабіць нічога кепскага ў маіх вачах. Я не бачыў у ім ніякіх недахопаў. Я любіў яго, таму што лічыў ідэальным. Але калі мне было балюча, любіць яго было цяжка. Спатрэбілася кожная кропля маёй веры. Цяпер, калі я прайшоў працэс аднаўлення і ацалення, я люблю яго гэтаксама моцна, як і пры першай сустрэчы, нягледзячы на любыя недахопы. Гэта сталая любоў».

Прыгадаўся гэты верш са Святога Пісання:

> І больш за ўсё майце гарачую любоў адзін да аднаго,
> бо любоў пакрые мноства грахоў.
>
> —1 ПЯТРА 4:8

Лёгка любіць тых, хто не робіць нічога кепскага ў нашых вачах. Гэта як каханне ў мядовы месяц. Іншая справа – любіць кагосьці, калі мы бачым яго недахопы, асабліва калі мы сталі іх ахвярай. Любоў Божая загартоўвала мяне, умацоўвала маё сэрца.

З таго часу падобныя выпадкі ўзнікалі, але на тое, каб прабачыць крыўдзіцеля, не трэба было шмат часу. Прычына была ў тым, што маё сэрца прайшло добрую падрыхтоўку, каб заставацца свабодным ад крыўды.

Ад моманту, як Бог загаварыў са мной на двары, да таго часу, пакуль я не выйшаў з кабінета гэтага чалавека свабодным, прайшло некалькі месяцаў. Гэта быў перыяд навучання, падчас якога маё сэрца трэніравалася і ўмацоўвалася. У гэтыя месяцы часам здавалася, што я нікуды не дайду. Насамрэч, я задаваўся пытаннем, ці не стала мне горш.

Але я быў на правільным шляху да аднаўлення. Дух Госпада вёў мяне з такой хуткасцю, з якой я мог справіцца. Гэта была частка майго працэсу сталення. Я б не прамяняў гэты досвед ні на што і ўдзячны за рост, які ён прынёс у маё жыццё.

## СТАЛЕННЕ ПРАЗ ЦЯЖКАСЦІ

Мы расцём у цяжкія, а не ў лёгкія часы. На шляху з Госпадам заўсёды будуць сустракацца цяжкія месцы. Мы не можам пазбегнуць іх. Нам трэба з імі сутыкнуцца, таму што яны – частка таго, каб стаць дасканалымі ў Ім. Калі вы вырашыце ўцячы ад іх, вы сур’ёзна перашкодзіце свайму росту.

Пераадольваючы розныя перашкоды, вы становіцеся мацнейшымі і больш спагадлівымі. Вы больш палюбіце Ісуса. Калі вы прайшлі цяжкія выпрабаванні і не адчуваеце гэтага, хутчэй за ўсё, вы не ацаліліся ад крыўды. Ацаленне – ваш выбар. Некаторыя людзі атрымліваюць траўмы і ніколі не аднаўляюцца. Як бы жорстка гэта ні гучала, гэта іх выбар.

Ісус навучыўся паслухмянасці праз тое, што перацярпеў. Пётр навучыўся паслухмянасці праз пакуты. Павал навучыўся паслухмянасці праз тое, што вытрымаў. Што наконт вас? Вы навучыліся? Ці вы – жорсткі, чэрствы, халодны, горкі і крыўдлівы? Тады вы не навучыліся паслухмянасці.

Гэта праўда, што некаторыя крыўды не знікнуць лёгка, як з гусі вада. Вам трэба будзе працаваць над імі, імкнучыся вызваліцца. Але ў працэсе гэтага вы будзеце расці і сталець.

Сталасць не прыходзіць лёгка. Калі б гэта было лёгка, усе б дасягнулі яе. Але гэтага ўзроўня дасягаюць нешматлікія, бо яны сутыкаюцца з вялікім супрацівам. Ён існуе, таму што тэндэнцыі жыцця ў нашым грамадстве не пабожныя, а эгаістычныя. У свеце дзейнічае «князь, які валадарыць у паветры» (Эф. 2:2). У выніку, нашаму ўваходу ў сталасць Хрыста будуць перашкаджаць цяжкасці, звязаныя з супрацьстаяннем плыні эгаізму.

Павал вярнуўся ў тры гарады, дзе ён заснаваў цэрквы. Яго мэтай было ўмацаваць душы вучняў. Цікава паглядзець на тое, як ён іх узмацніў. Ён звярнуўся да іх,

> …умацоўваючы душы вучняў, просячы трываць у веры і што праз шмат мукаў мусім мы ўвайсьці ў Валадарства Божае.
>
> — ДЗЕІ 14:22

Павал не абяцаў ім лёгкага жыцця і поспеху паводле стандартаў гэтага свету. Ён паказаў: калі яны збіраюцца скончыць свой шлях з радасцю, яны сустрэнуць вялікі супраціў, які ён назваў мукамі.

Калі вы вяслуеце па рацэ супраць плыні, вам давядзецца веславаць бесперапынна, каб рухацца супраць плыні. Калі вы перастанеце веславаць і расслабіцеся, вы ў рэшце рэшт паплывяце па плыні. Нягледзячы на гэта, калі мы цвёрда вырашылі ісці Божым шляхам, нас чакае шмат нягод. Усе выпрабаванні пакажуць адказ на адно галоўнае пытанне: вы збіраецеся клапаціцца пра сябе, як гэта робіць свет, або вы збіраецеся жыць жыццём самавырачэння?

Памятайце: калі мы страцім сваё жыццё дзеля Ісуса, мы знойдзем Яго жыццё. Навучыцеся засяроджвацца на канчатковым выніку, а не на барацьбе.

Пётр так добра сфармуляваў гэта:

> Улюбёныя! Не зьдзіўляйцеся вогненнаму [выпрабаваньню], якое стаецца дзеля спакушэньня вас, нібы нешта дзіўнае здарылася. Але, як супольнікі ў пакутах Хрыстовых, радуйцеся, каб і ў адкрыцьці славы Ягонай радавацца і весяліцца.
>
> —1 ПЯТРА 4:12 – 13

Звярніце ўвагу: Пётр параўноўвае ступень пакутаў з радасцю. Як можна радавацца да такой ступені? Калі Яго слава адкрыецца, вы будзеце праслаўлены разам з Ім. Гэта праслаўленне адбудзецца ў той ступені, у якой вы дазваляеце Яму ўдасканальваць Яго характар у вас. Так што не глядзіце на крыўду. Паглядзіце на будучую славу. Алелюя!

## ВАЖНЕЙ ДАПАМАГЧЫ БРАТУ, ЧЫМ ДАКАЗАЦЬ ТОЕ, ШТО ТВОЙ ПУНКТ ГЛЕДЖАННЯ ПРАВІЛЬНЫ.

Мне васямнаццаць гадоў. Я з няпоўнай сям'і, у мяне ёсць сястра–блізнятка і шмат цудоўных сваякоў. Я ніколі не сустракала свайго біялагічнага бацьку і ўсё жыццё не магла прабачыць яму. Мой дзед, цудоўны чалавек Божы, даў мне прачытаць *«Прынаду шатана»*. Прачытаўшы яе, я змагла цалкам прабачыць свайму бацьку.

—Н. М., НЬЮ–МЕКСІКА

14

# МЭТА: ПРЫМІРЭННЕ

*Вы чулі, што сказана старадаўнім: «Не забівай, а хто заб'е, падлягае суду». А Я кажу вам, што ўсякі, хто гневаецца на брата свайго дарэмна, падлягае суду; а хто скажа брату свайму: «Нікчэмны», падлягае сынэдрыёну, а хто скажа: «Дурань», падлягае гееньне вогненай. Дык калі ты прынясеш дар твой на ахвярнік, і там узгадаеш, што брат твой мае нешта супраць цябе, пакінь дар твой перад ахвярнікам і пайдзі перш пагадзіся з братам тваім, а тады, прыйшоўшы, прынясі дар твой.*

**— МАЦВЕЯ 5:21–24**

Гэта цытата з Нагорнай пропаведзі. Ісус пачаў са слоў: «Вы чулі, што сказана старадаўнім... Потым Ён сказаў: «А Я кажу вам... »

Ісус працягвае гэтае параўнанне і ў наступнай частцы Свайго паслання: спачатку Ён цытуе закон, які рэгулюе нашы знешнія ўчынкі. Затым Ён паказвае выкананне, калі закон напісаны ў сэрцы. Такім чынам, у вачах Бога паняцце «забойца» тычыцца не толькі таго, хто здзяйсняе забойства; гэта таксама чалавек, які ненавідзіць свайго брата. Які ты ў сэрцы, такі ты і на самай справе!

У гэтай частцы Сваёй пропаведзі Ісус выразна акрэслівае наступствы крыўды. Ён ілюструе сур'ёзнасць затойвання гневу або горкай крыўды. Калі чалавек злуецца на свайго брата без прычыны, то можа патрапіць пад суд. Таксама кожны прадстане прад судом, калі гнеў падштурхнуў яго назваць свайго брата «нікчэмным»!

Слова «*нікчэмны*» азначае «пустагаловы» або дурань. Гэты папрок выкарыстоўваўся сярод габрэяў у часы Хрыста. Чалавеку, які гневаецца да такой ступені, што называе брата дурнем, пагражае пекла. Слова *дурань* азначае «быць бязбожным». Дурань, або бязглузды, кажа ў сваім сэрцы, што Бога няма (глядзі Псалом 14(13):1). Назваць брата дурнем у тыя часы азначала сур'ёзнае абвінавачванне. Так казалі, калі не проста гневаліся, а ненавідзелі. Гэта як сёння сказаць брату: «Ідзі ў пекла».

Ісус паказваў, што нежаданне справіцца з гневам можа прывесці да нянавісці. Невырашаныя пытанні гневу вядуць за сабой небяспеку пекла. Потым Госпад сказаў: калі чалавек успомніць, што на яго пакрыўдзіўся брат, то прыярытэтам становіцца знайсці пакрыўджанага і прымірыцца.

Чаму мы павінны так тэрмінова шукаць прымірэння — дзеля нас ці дзеля нашага брата? Мы павінны пайсці дзеля брата, каб стаць каталізатарам і дапамагчы яму пазбавіцца ад крыўды. Нават калі мы не крыўдзімся, Божая любоў не дазваляе брату заставацца ў гневе і вядзе да спробы працягнуць руку і аднавіць адносіны. Магчыма, мы нічога дрэннага не зрабілі. Не так важна, правільнымі былі нашы ўчынкі ці не. Нам важней дапамагчы брату, які спатыкнуўся, чым даказаць правільнасць нашых паводзінаў.

Для крыўды ёсць безліч сцэнароў.

Магчыма, чалавек, якога мы пакрыўдзілі, лічыць, што мы абышліся з ім несправядліва, хаця на самай справе мы не зрабілі яму зла. У яго можа быць недакладная інфармацыя, якая прывяла да недакладнай высновы.

З іншага боку, у яго можа быць дакладная інфармацыя, з якой ён зрабіў недакладную выснову. Магчыма, нехта недакладна перадаў яму нашыя словы. Нягледзячы на тое, што мы не імкнуліся нашкодзіць, нашы словы і дзеянні выглядалі інакш.

Часта мы судзім пра сябе па нашых намерах, а пра ўсіх іншых – па іх дзеяннях. Можна мець адзін намер, але сваімі паводзінамі казаць зусім іншае. Часам нашы сапраўдныя матывы ўмела хаваюцца нават ад нас. Нам хочацца верыць, што яны чыстыя. Але калі мы фільтруем іх праз Слова Божае, то ўсё  бачым па–іншаму.

Нарэшце, можа быць, мы саграшылі супраць чалавека. Мы злаваліся або знаходзіліся пад ціскам, і наш суразмоўца атрымаў асноўны ўдар. А можа, гэты чалавек пастаянна і наўмысна накідваўся на нас і мы адказалі тым жа.

Незалежна ад прычыны, разуменне гэтага пакрыўджанага азмрочанае, і ён грунтуе  меркаванні на здагадках, чутках і ўяўнасці, падманваючы сябе, нават калі лічыць, што зразумеў нашы сапраўдныя матывы. Як мы можам мець дакладнае меркаванне без дакладнай інфармацыі? Нам трэба ўважліва ставіцца да яго шчырага перакананя ў тым, што яго пакрыўдзілі. Якая б ні была прычына, мы павінны быць гатовыя ўпакорыцца і папрасіць прабачэння.

Ісус заклікае нас да прымірэння, нават калі крыўда – не наша віна. Пакора, патрэбная для прымірэння, патрабуе сталасці. Калі чалавеку баліць, першы крок зрабіць цяжка. Вось чаму Ісус сказаў крыўдзіцелю «пайдзі перш пагадзіся з братам тваім».

## ПРАСІЦЬ ПРАБАЧЭННЯ Ў ПАКРЫЎДЖАНЫХ

Апостал Павал сказаў:

> Дык таму будзем імкнуцца да таго, што [служыць] дзеля супакою і ўзаемнага збудавання.
>
> — РЫМЛЯНАЎ 14:19

Гэта паказвае, як падысці да пакрыўджанага намі чалавека. Калі мы пойдзем да яго ў расчараванні, мы не паспрыяем міру. Мы толькі ўсё ўскладнім для пакрыўджанага. Мы павінны захоўваць імкненне да міру праз пакору коштам нашай пыхі. Гэта адзіны спосаб убачыць сапраўднае прымірэнне.

У некаторых выпадках я звяртаўся да людзей, якіх пакрыўдзіў або якія раззлаваліся на мяне, і яны накідваліся ў адказ. Мне казалі, што я эгаіст, няўважлівы, ганарлівы, грубы, жорсткі і г.д.

Натуральна, мне хацелася сказаць: «Не–не–не. Вы мяне проста не разумееце!» Але калі я абараняюся, гэта толькі распальвае агонь крыўды. Гэта не імкненне да міру. Адстойванне сябе і «сваіх правоў» ніколі не прынясе сапраўднага міру.

Замест гэтага я навучыўся слухаць і маўчаць, пакуль яны не выгаварацца. Калі я не згодны, я даю ім зразумець, што паважаю тое, што яны сказалі, і праверу маё стаўленне і намеры. Потым я кажу ім, што мне шкада, што я прычыніў ім боль.

Бывае, яны дакладна ацэньваюць мяне. Я прызнаю: «Вы маеце рацыю. Я прашу ў вас прабачэння».

Зноў жа, гэта проста азначае упакорыць сябе, каб спрыяць прымірэнню. Магчыма, таму Ісус сказаў у наступных вершах:

> Пагадзіся з супраціўнікам тваім хутчэй, пакуль ты яшчэ ў дарозе з ім, каб супраціўнік не аддаў цябе судзьдзі, а судзьдзя не аддаў бы цябе паслугачу, і ня быў ты кінуты ў вязніцу. Сапраўды кажу табе: ты ня выйдзеш адтуль, пакуль не аддасі апошняга кадранта.
>
> — МАЦВЕЯ 5:25–26

Пыха абараняецца. Пакорлівасць згаджаецца і кажа: «Вы маеце рацыю. Я гэта зрабіў. Калі ласка, прабачце мяне».

> Але мудрасьць, якая з вышыні, па–першае, — чыстая, пасля — мірная, спагадная, *саступлівая*, поўная літасьці і добрых пладоў, бесстаронная і некрывадушная.
>
> —ЯКУБА 3:17, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Божая мудрасць гатовая саступіць. Яна не цвёрдая ці ўпартая, калі справа даходзіць да асабістых канфліктаў. Чалавек, які падпарадкоўваецца Божай мудрасці, не баіцца саступаць або прыслухоўвацца да пункту гледжання іншага чалавека, пакуль гэта не пярэчыць праўдзе.

## ЗВАРОТ ДА ТАГО, ХТО ПАКРЫЎДЗІЎ ВАС

Мы абмеркавалі, што рабіць, калі мы пакрыўдзілі нашага брата. Цяпер давайце падумаем, што рабіць, калі наш брат крыўдзіць нас.

> Калі ж саграшыць супраць цябе брат твой, пайдзі і дакары яго між табою і ім адным; калі паслухаецца цябе, ты здабыў брата твайго.
>
> — МАЦВЕЯ 18:15

Многія людзі ўжываюць гэты верш са Святога Пісання ў іншым значэнні, чым тое, пра што казаў Ісус. Калі яны пакрыўджаныя, яны пойдуць і супрацьстануць крыўдзіцелю ў духу помсты і гневу. Гэтым вершам яны апраўдваюць сваё асуджэнне таго, хто іх пакрыўдзіў.

Але яны не разумеюць прычыны, чаму Ісус сказаў нам ісці адзін да аднаго. Гэта не для асуджэння, а для прымірэння. Ён не хоча, каб мы расказвалі свайму брату, наколькі кепска ён з намі абышоўся. Мы мусім падысці да яго, каб ліквідаваць тое, што перашкаджае аднавіць нашы адносіны.

Гэта паралель з тым, як Бог аднаўляе нас у адносінах з Ім. Мы саграшылі супраць Бога, але Ён «даводзіць [Сваю любоў да нас] тым, што Хрыстос памёр за нас, калі мы былі [яшчэ] грэшнікамі» (Рым. 5:8). Ці гатовыя мы адмовіцца ад самаабароны і памерці для пыхі, каб быць адноўленыя ў адносінах з тым, хто нас пакрыўдзіў? Бог звярнуўся да нас раней, чым мы папрасілі прабачэння. Ісус вырашыў прабачыць нас яшчэ да таго, як мы прызналі сваю крыўду.

Нягледзячы на тое, што Ён звяртаўся да нас, мы не маглі прымірыцца з Айцом, пакуль не атрымалі Яго слова прымірэння.

> Усё ж ад Бога, Які праз Ісуса Хрыста *пагадзіў* нас з Сабою і даў нам служэньне *прымірэньня*. Бо Бог быў у Хрысьце, пагаджаючы з Сабою свет, не залічваючы ім праступкаў іхніх, і ўклаў у нас *слова прымірэньня*. Дык мы спаўняем пасольства замест Хрыста, як бы Сам Бог просіць праз нас; *за Хрыста просім: «Пагадзіцеся з Богам»*.
>
> —2 КАРЫНЦЯНАЎ 5:18–20, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Слова прымірэння пачынаецца з агульнага для нас усіх: усе мы зграшылі супраць Бога. Мы не хочам прымірэння або збаўлення, пакуль не ведаем, што ёсць бездань паміж намі і Богам.

У Новым Запавеце вучні прапаведавалі, што народ саграшыў перад Богам. Але навошта казаць людзям, што яны саграшылі? Каб іх асудзіць? Бог не асуджае. «Бо не паслаў Бог Сына Свайго ў свет, каб судзіць свет, але каб свет быў збаўлены праз Яго» (Ян 3:17). Хутчэй, гэта для таго, каб дапамагчы ім зразумець свой стан, пакаяцца ў грахах і папрасіць прабачэння.

Што вядзе людзей да пакаяння? Мы знаходзім адказ у Пасланні да Рымлянаў 2:4.

> Або багацьцем ласкавасьці Ягонай, і цярплівасьці, і доўгацярплівасьці пагарджаеш, ня ведаючы, што

> *добрасьць Божая вядзе цябе да навяртаньня*?
>
> — ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Божая дабрыня вядзе нас да пакаяння. Яго любоў не пакідае нас асуджанымі на пекла. Ён даказаў Сваю любоў, паслаўшы Ісуса, Свайго Адзінага Сына, памерці за нас на крыжы. Бог шукае нас першым, хоць гэта мы зграшылі супраць Яго. Ён шукае нас не для таго, каб асудзіць, але каб аднавіць, каб выратаваць.

Мы павінны наследаваць Бога (глядзі Эфесянам 5:1), таму нам трэба распаўсюджваць прымірэнне на брата, які грашыць супраць нас. Ісус усталяваў такі ўзор: падыдзі да бліжняга і пакажы яго грэх не для таго, каб асудзіць, але каб выдаліць усё, што ляжыць паміж вамі абодвума, і такім чынам прымірыцца і аднавіцца. Дабрыня Бога ў нас прыцягне нашага брата да пакаяння і аднаўлення адносін.

> Дык я, вязень у Госпадзе, малю вас хадзіць дастойна пакліканьня, якім вы пакліканыя, з усёй пакорай розуму і ціхасьцю, з доўгацярплівасьцю, церпячы адзін аднаго з любоўю, намагаючыся захаваць еднасьць духа ў саюзе супакою.
>
> — ЭФЕСЦАЎ 4:1–3

Мы падтрымліваем гэтую сувязь міру, захоўваючы пакору, лагоднасць і доўгацярплівасць і церпячы слабасці адзін аднаго з любоўю. Так умацоўваюцца повязі любові.

Я крыўдзіў людзей, якія супрацьсталі мне з асуджэннем. У выніку ў мяне знікла жаданне мірыцца. Наадварот, я лічыў, што яны не хочуць прымірэння; яны жадалі, каб я ведаў: яны раззлаваныя.

Іншыя людзі, якіх я крыўдзіў, прыходзілі да мяне ў лагоднасці. Я хутка мяняў сваё меркаванне і прасіў прабачэння – часам раней, чым яны заканчвалі гаварыць.

Ці падыходзіў да вас нехта, каб сказаць: «Я проста хачу, каб

ты ведаў: я дарую табе за тое, што ты не быў лепшым сябрам і не зрабіў для мяне таго ці іншага»?

Потым, калі вы агаломшаны гэтымі словамі, яны кідаюць на вас позірк, які кажа: «Ты павінен выбачыцца перада мной».

Вы збянтэжаныя і стаіце разгубленыя і пакрыўджаныя. Да вас прыйшлі не наладжваць адносіны, а запалохваць і кантраляваць.

Мы не павінны ісці да брата, які нас пакрыўдзіў, пакуль не вырашылі прабачыць яму ад усяго сэрца — незалежна ад таго, як ён нам адкажа. Перш, чым звяртацца да яго, нам трэба пазбавіцца ад любога пачуцця непрыязнасці да яго. Без гэтага мы, верагодна, адрэагуем на гэтыя негатыўныя пачуцці і прычынім яму боль, а не вылечым яго.

Што адбываецца, калі мы маем правільнае стаўленне і спрабуем прымірыцца з кімсьці, хто зграшыў супраць нас, але ён ці яна не слухае?

> Калі ж не паслухаецца, вазьмі з сабою яшчэ аднаго ці двух, каб вуснамі двух або трох сьведак змацавалася ўсякае слова. Калі ж не пачуе, скажы царкве, а калі і царквы не пачуе, няхай будзе ён табе, як паганін і мытнік.
>
> — МАЦВЕЯ 18:16–17

Кожны з гэтых крокаў мае тую ж мэту: прымірэнне. Па сутнасці, Ісус казаў: «Спрабуйце зноў і зноў». Заўважце: той, хто крыўдзіў, задзейнічаны на кожным кроку. Як часта мы, перш чым пойдзем да таго, хто зграшыў супраць нас (як казаў нам Ісус), расказваем пра крыўду ўсім астатнім! Мы робім гэта таму, што не вырашылі пытанні з уласным сэрцам. Мы лічым сябе апраўданымі, калі расказваем кожнаму гісторыю са свайго боку. Калі іншыя згаджаюцца, што з намі кепска абышліся, гэта суцяшае і падтрымлівае нас. У такіх паводзінах ёсць толькі эгаізм.

# АСНОВА ЎСЯГО

Калі нашым галоўным матывам застанецца любоў да Бога, мы не пацерпім няўдачы. Любоў ніколі не перастае. Калі мы любім іншых так, як Ісус любіць нас, мы будзем свабоднымі, нават калі іншы чалавек не захоча з намі прымірыцца. Уважліва паглядзіце на наступны верш Святога Пісання. Божая мудрасць даступная ў любых сітуацыях.

> Калі магчыма для вас, мейце супакой з усімі людзмі.
>
> — РЫМЛЯНАЎ 12:18

Бог кажа: «Калі магчыма», таму што бываюць выпадкі, калі іншыя адмаўляюцца быць у міры з намі. Ці могуць быць тыя, чые ўмовы прымірэння паставяць пад пагрозу нашы адносіны з Госпадам. У такіх выпадках адносіны з гэтымі людзьмі аднавіць немагчыма.

Звярніце ўвагу, што Бог кажа: «. . калі магчыма для вас». Мы павінны рабіць усё магчымае, каб прымірыцца з іншым чалавекам, калі хочам трымацца праўды. Часта мы адмаўляемся ад адносін занадта рана.

Я ніколі не забуду момант, калі сябар параіў мне не сыходзіць з вельмі непрыемнай сітуацыі. «Джон, я ведаю, што ты можаш знайсці ў Пісанні прычыны, каб сысці. Перш чым зрабіць гэта, пераканайся, што ты шмат маліўся пра гэта і зрабіў усё магчымае, каб прынесці Божы мір ў гэтую сітуацыю».

Затым ён дадаў: «Ты пашкадуеш, калі аднойчы азірнешся назад і спытаеш сябе, ці зрабіў ты ўсё, што мог, каб захаваць гэтыя адносіны. Лепш ведаць, што ў цябе няма іншага выхаду і ты зрабіў усё магчымае без шкоды для праўды».

Я быў вельмі ўдзячны за яго парады і пазнаў ў іх Божую мудрасць.

Памятайце словы Ісуса:

> Шчасьлівыя міратворцы, бо яны сынамі Божымі будуць названыя.
>
> — МАЦВЕЯ 5:9

Ён не сказаў: «Шчаслівыя захавальнікі міру». Захавальнік міру пазбягае канфрантацыі любой цаной, каб захаваць мір, нават з рызыкай скампраметаваць праўду. Але такі мір не будзе сапраўдным. Гэта тклівы, павярхоўны супакой, які не будзе працяглым.

Міратворац пойдзе з любоўю і будзе супрацьстаяць, прыносячы праўду, каб выніковае прымірэнне было трывалым. Ён не будзе падтрымліваць штучныя, павярхоўныя адносіны, але прагне адкрытасці, праўды і любові. Ён адмаўляецца хаваць крыўду за паліткарэктнай усмешкай і працуе над мірам з адважнай любоўю, якая не можа пацярпець няўдачу.

Бог так працуе з чалавецтвам. Ён не хоча, каб хтосьці загінуў. Але Ён не пойдзе на кампраміс з праўдай дзеля адносін. Ён шукае прымірэння не павярхоўнага, а сапраўднага, з адданасцю. Гэта развівае сувязь любові, якую не разарве ніякае зло. Госпад аддаў за нас Сваё жыццё. Мы можам толькі наследаваць Яго.

Памятайце, што галоўнае – любоў да Бога. Яна ніколі не падводзіць, ніколі не спыняецца і не перастае. Яна не шукае свайго. Яе нялёгка пакрыўдзіць (1 Кар. 13:5).

Апостал Павал пісаў, што любоў перамагае ўсе віды граху.

> І малюся пра тое, каб *любоў вашая яшчэ больш і больш памнажалася* ў пазнаньні і ўсякім разуменьні, каб, выпрабоўваючы, што лепшае, вы былі чыстымі і *без спатыкнення* ў дзень Хрыстовы, напоўненымі пладамі праведнасьці праз Ісуса Хрыста на славу і пахвалу Божую.
>
> —ФІЛІПЯНАЎ 1:9–11, ВЫДЗЕЛЕНА АЎТАРАМ

Любоў да Бога – ключ да вызвалення з пасткі крыўды.

Гэта павінна быць багатая любоў, якая пастаянна расце і ўмацоўваецца ў нашых сэрцах.

У сучасным грамадстве многія падмануты павярхоўнай любоўю, якая гаворыць, але не дзейнічае. Любоў, якая не дасць нам спатыкнуцца, самаахвярна аддае жыццё — нават дзеля дабра ворага. Калі мы жывем у такой любові, нас нельга спакусіць на прынаду шатана.

# ЭПІЛОГ

# ПРАКТЫЧНЫЯ КРОКІ

Калі вы чыталі гэту кнігу, Дух Госпада, магчыма, нагадваў вам пра адносіны ў мінулым ці сучаснасці, у якіх вы трымалі нешта супраць іншых. Я адчуваю, што Госпад настаўляе мяне папрасіць вас памаліцца са мной простай малітвай вызвалення.

Але перад малітвай папрасіце Святога Духа прайсці з вамі праз ваша мінулае, паказаўшы людзей, супраць якіх вы што–небудзь трымалі. Маўчыце перад Ім, калі Ён паказвае іх вам. Не трэба паляваць на тое, чаго няма. Ён выразна пакажа іх вам, так што вы не будзеце сумнявацца. У гэты час вы можаце ўспомніць перажыты боль. Не бойцеся. Бог будзе побач з вамі і суцешыць вас.

Калі вы вызваляеце гэтых людзей ад віны за тое, што яны

зрабілі вам, уявіце кожнага з іх паасобку. Даруйце кожнаму асабіста. Анулюйце доўг, які яны павінны вам. Затым памаліцеся наступнай малітвай, але не абмяжоўвайцеся гэтымі словамі. Выкарыстоўвайце гэтую малітву як аснову і слухайце Духа Божага.

*Ойча, у імя Ісуса, я прызнаю, што саграшыў супраць Цябе, не дараваўшы тым, хто мяне пакрыўдзіў. Я раскайваюся ў гэтым і прашу ў Цябе прабачэння.*

*Я таксама прызнаю сваю няздольнасць дараваць ім без Цябе. Таму ад усяго сэрца я выбіраю прабачэнне. [Устаўце іх імёны — адпусціце кожнага паасобку.] Я заклікаю кроў Ісуса амыць усё злое, што яны зрабілі мне. Яны мне больш нічога не павінны. Я адпускаю іх грахі супраць мяне.*

*Нябесны Ойча, як мой Госпад Ісус прасіў Цябе дараваць тым, хто зграшыў супраць Яго, я малюся, каб Тваё прабачэнне прыйшло да тых, хто саграшыў супраць мяне.*

*Я прашу, каб Ты дабраславіў іх і прывёў іх да больш блізкіх адносін з Табою. Амэн.*

Цяпер запішыце ў дзённік імёны людзей, якіх вы адпусцілі, і пазначце, што ў гэты дзень вы прынялі рашэнне дараваць ім.

Магчыма, вам трэба будзе намагацца і трэніравацца, каб не крыўдзіцца. (Перачытайце трынаццаты раздзел, калі вы не разумееце гэтага сказа.) Вазьміце на сябе абавязацельства маліцца за іх, як бы вы маліліся за сябе. Дзённік дапаможа вам памятаць гэта. Калі думкі настойліва прыходзяць да вас, адкіньце іх Словам Божым і заявіце пра сваё рашэнне дараваць. Вы прасілі Божай ласкі, каб прабачыць, і непрабачэнне не такое моцнае, як Ягоная ласка. Будзьце адважнымі і змагайцеся добрым змаганнем веры.

Калі вы зразумееце, што ваша сэрца моцнае і спакойнае,

ідзіце да іх. Памятайце, што вы ідзяце з мэтай прымірэння для іх карысці, а не для сябе. Робячы гэта, вы замацуеце перамогу. Вы заваюеце сэрца брата (глядзі Мацвея 18:15.) Гэта прыемна ў вачах Бога.

> А Таму, Які можа захаваць вас ад упадку і паставіць перад славаю Сваёю беззаганнымі і ў радасці, адзінаму мудраму Богу, Збаўцу нашаму, праз Ісуса Хрыста, Госпада нашага, слава і веліч, сіла і ўлада цяпер і на ўсе вякі. Амэн.
>
> —ЮДЫ 24–25

# Дзе Ты, Бог?!

***Як знайсці сілы і мэту, праходзячы праз пустыню***




Ці адчуваеце вы разгубленасць у цяжкія часы, ці думаеце часам: «ДЗЕ ТЫ, БОГ?!»

Магчыма, вы чулі Божы голас, але зараз Бог, здаецца, маўчыць. Магчыма, вы рухаліся наперад у веры, але цяпер Яго прысутнасці нідзе няма. Вітаем вас у пустыні – у месцы паміж атрыманнем Божага абяцання і яго спаўненнем.

Ёсць і добрая навіна: гэта не проста час без мэты ў пустой зямлі. Калі вы будзеце праходзіць пустыню правільна, Бог выкарыстае яе і падрыхтуе вас да вашага паклікання. Насуперак таму, што думаюць многія людзі, такі перыяд – не проста чаканне Бога. У гэты час вам адведзена вялікая роля. Калі не хочаце марнаваць час і блукаць па коле, важна даведацца, што ж гэта за роля.

Захапляльная кніга Джона Бэвіра, аўтара бестсэлераў, пазнаёміць глыбей з ключавымі гісторыямі Бібліі, якія дапамогуць выстаяць, прайсці перыяды складанасцяў і дасягнуць таго, што Бог падрыхтаваў для вас.

Больш інфармацыі: MessengerX.com

# MessengerX

***Падарожжа вучнёўства для ўсіх і паўсюль***




- **Бясплатна больш чым на 125 розных мовах**
- Праграма для мабільных прыладаў і сайт
- Матэрыялы, распрацаваныя для вашага духоўнага росту
- Магчымасць захоўваць гісторыю праглядаў і свой прагрэс






Даследуйце вялікую бібліятэку матэрыялаў ад Messenger, якія вы можаце глядзець, чытаць і слухаць на ўсіх прыладах: электронныя кнігі, аўдыякнігі, кароткаметражныя фільмы, відэакурсы, Бібліі і многае іншае.

**MessengerX.com**

Спампаваць у App Store

Атрымаць Google Play

Даступна па ўсім свеце праз App Store і Google Play

# ПАЗБЕГНУЦЬ СМЯРОТНАЙ ПАСТКІ ВОРАГА

У кнізе **«Прынада шатана»** выкрываецца адна з самых падступных пастак, якую шатан выкарыстоўвае, каб скрасці вернікаў з волі Божай. Гэта крыўда. Большасць людзей, якія трапляюцца на гэтую прынаду, гэтага нават не ўсведамляюць.

Не падманвайцеся! Вы сутыкняцеся з крыўдай, і толькі ад вас залежыць, як гэта паўплывае на вашы адносіны з Богам. Ваша рэакцыя вызначыць вашу будучыню. Калі вы правільна адрэагуеце на крыўду, то станеце мацнейшымі, а не назапасіце горыч у сэрцы.

У гэтым выданні, прысвечаным дзесяцігоддзю кнігі-бестселера, Джон Бэвір раскажа, як заставацца свабоднымі ад крыўды і пазбягаць менталітэту ахвяры. У кнізе, агульны наклад якой па ўсім свеце перавышае 6.000.000 асобнікаў, вы знойдзеце сведчанні людзей, жыццё якіх перамянілася дзякуючы кнізе і малітоўнаму дадатку, у які ўваходзяць пытанні для абмеркавання, вершы з Пісання і малітвы.

## Вы знойдзеце адказы на наступныя складаныя пытанні:

- Чаму мне так хочацца расказаць «сваю версію» падзеяў?
- Як мне змагацца з падазрэннямі і недаверам?
- Што зрабіць, каб перастаць узгадваць мінулы боль?
- Як аднавіць давер пасля моцнай крыўды?

Кніга дапаможа вам пазбегнуць «пасткі крыўды» ворага і заставацца свабоднымі ад крыўды, каб мець шчырыя адносіны з Богам, якім нічога не будзе перашкаджаць.



**ДЖОН БЭВІР** і яго жонка Ліза – заснавальнікі служэння Messenger International. Джон, аўтар і служыцель, адважна і аддана нясе вестку бескампраміснай праўды. Яго бачанне – падтрымліваць памесныя цэрквы і іх лідараў незалежна ад іх месцазнаходжання, мовы або фінансавага становішча. Для гэтага многія яго рэсурсы дасяжныя больш чым на 125 мовах і мільёны асобнікаў розных матэрыялаў распаўсюджваюцца сярод пастароў і лідараў цэркваў ва ўсім свеце.

Больш? Скануйце тут

MessengerX

MESSENGER INTERNATIONAL
MessengerInternational.org

Праглядайце відэа і спампоўвайце бясплатныя матэрыялы на **MessengerX.com**

Гэтая кніга – падарунак ад аўтара
і НЕ ПРЫЗНАЧАЕЦЦА ДЛЯ ПРОДАЖУ